# ГІСТОРЫЯ СЯРЭДНІХ ВЯКОЎ

## V–XIII стст.

Вучэбны дапаможнік для 6 класа
агульнаадукацыйных устаноў
з беларускай мовай навучання

Пад рэдакцыяй доктара гістарычных навук,
прафесара В. А. Фядосіка

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск «Народная асвета» 2009

Народная асвета
Правообладатель Народная асвета

УДК 94(100)(075.3=161.3)
ББК 63.3(0)4я721
Г51

А ў т а р ы:
В. А. Фядосік, І. А. Еўтухоў, А. А. Яноўскі,
А. А. Прохараў, С. М. Цемушаў, І. А. Аўдзееў

Пераклад з рускай мовы *Т. Р. Сяржант*, *Л. А. Цімафеевай*

Р э ц э н з е н т ы:
кафедра гісторыі старажытных цывілізацый і сярэдневякоўя БДПУ
імя Максіма Танка (кандыдат гістарычных навук, дацэнт *А. М. Сурта*);
настаўнік гісторыі вышэйшай катэгорыі СШ № 4 г. Мінска *Т. Я. Сіўчык*;
ад Дзяржкамісіі рэцэнзавалі: доктар гістарычных навук, прафесар, рэктар
Брэсцкага дзяржуніверсітэта імя А. С. Пушкіна
*М. Э. Часноўскі*; настаўнік гісторыі вышэйшай катэгорыі
гімназіі № 11 г. Мінска *І. Р. Драгавоз*

**Гісторыя** сярэдніх вякоў: V — XIII стст. : вучэб. дапам. для 6-га кл.
Г51 агульнаадукац. установ з беларус. мовай навучання / В. А. Фядосік [і інш.]; пад рэд. В. А. Фядосіка; пер. з рус. мовы Т. Р. Сяржант, Л. А. Цімафеевай. — Мінск : Нар. асвета, 2009. — 158 с. : іл.
ISBN 978-985-03-1176-4.

**УДК 94(100)(075.3=161.3)**
**ББК 63.3(0)4я721**

**ISBN 978-985-03-1176-4**

© Сяржант Т. Р., Цімафеева Л. А., пераклад на беларускую мову, 2009
© Афармленне. УП «Народная асвета», 2009

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

## Ад аўтараў

Дарагія сябры! Вы пачынаеце вывучэнне наступнай эпохі сусветнай гісторыі, якую называюць сярэднімі вякамі. З гэтага вучэбнага дапаможніка вы даведаецеся аб развіцці цывілізацый свету ў першыя два (з трох) перыяды сярэдневякоўя.

З дапамогай зместу ў канцы вучэбнага дапаможніка вы зможаце хутка арыентавацца ў вучэбным матэрыяле і знаходзіць патрэбны раздзел, тэму, параграф. Тэкст кожнага параграфа падраздзяляецца на асноўны і дадатковы. Асноўны ўключае матэрыял, абавязковы для вывучэння і засваення. Дадатковы тэкст змешчаны на каляровым фоне і даецца больш дробным шрыфтам. Асобым шрыфтам выдзелены і новыя словы: найбольш важныя — паўтлустым, астатнія — курсівам.

З дапамогай пытанняў і заданняў да тэкстаў, карт, малюнкаў і схем вы праверыце свае веды і паразважаеце над вывучаным матэрыялам. Слоўнік забяспечыць вас даведачнай інфармацыяй і растлумачыць важнейшыя гістарычныя паняцці. Сінхранічная табліца дапаможа запомніць найбольш значныя падзеі і параўнаць іх адну з адной. Карты дадуць магчымасць суаднесці час і прастору гістарычнай падзеі. А яркія і маляўнічыя ілюстрацыі дапоўняць расказ пра мінулае. Як бачыце, нічога складанага ў рабоце з вучэбным дапаможнікам няма. Дык смялей адгарніце наступную старонку і пачынайце сваё падарожжа па захапляючым свеце сярэдневякоўя.

У добры шлях!

Правообладатель Народная асвета

# УВОДЗІНЫ

## СЯРЭДНЕВЯКОЎЕ Ў ГІСТОРЫІ ЧАЛАВЕЦТВА

**Успомніце:** **1.** Якія краіны вы вывучалі ў курсе гісторыі старажытнага свету? **2.** Назавіце найбольш значныя дасягненні культуры антычнасці. **3.** Дайце азначэнне паняцця «дзяржава».

**1. Што такое сярэднія вякі?** Гісторыкі падзяляюць сусветную гісторыю на эпохі: старажытнасць, сярэдневякоўе і новы час. *(Знайдзіце эпохі сусветнай гісторыі на «лініі часу».)*

У 5-м класе вы вывучалі самую працяглую эпоху сусветнай гісторыі — **гісторыю старажытнага свету**. Вы даведаліся, як пры першабытнаабшчынным ладзе сфарміравалася чалавечае грамадства, як асноўнымі заняткамі людзей сталі земляробства, рамяство і гандаль. (**Грамадства** — *сукупнасць людзей, аб'яднаных формамі сумеснага жыцця і дзейнасці, якія гістарычна скláліся.*) Вы даведаліся, як затым у рачных далінах выраслі прыгожыя гарады, утварыліся першыя дзяржавы. У іх развіваліся пісьменства, літаратура і навука. І ў розных частках Зямлі людзі ўпершыню перайшлі да высокаарганізаванага грамадства — **цывілізацыі**. **Прыметы цывілізацыі:** *супольнасць тэрыторыі, гаспадарчага жыцця, рэлігіі, звычаяў, наяўнасць дзяржавы, гарадоў, пісьменства*. На Старажытным Усходзе існавалі цывілізацыі старажытных егіпцян, жыхароў Міжрэчча, Індыі і Кітая. Грэкі і рымляне стварылі антычную цывілізацыю Еўропы.

У 6-м класе вы пазнаёміцеся з гісторыяй цывілізацый, што існавалі ў эпоху, якая надышла пасля старажытнасці. Яна называецца **сярэднія вякі** або **сярэдневякоўе**. Гісторыя сярэдніх вякоў вывучае гісторыю цывілізацый з канца V да канца XV ст. У гэты час працягвалі развівацца вялікія цывілізацыі, узнікшыя ў старажытнасці, і з'явіліся новыя. У ся-

Правообладатель Народная асвета

## Лінія часу

| Старажытны свет | | | | | | | | Сярэднія вякі | | | | | | | | | | Новы час | | | | Найноўшы час | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3 | 2 | 1 | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| Да нашай эры | | | Наша эра | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |

рэднія вякі не ўсе народы перайшлі да высокаарганізаванага спосабу жыцця. Па-за межамі цывілізацый распасціраўся свет паляўнічых і качэўнікаў, якія жылі ва ўмовах першабытнаабшчыннага ладу.

**2. Тры ўзросты сярэдневякоўя.** Эпоха сярэдневякоўя значна карацейшая за эпоху старажытнага свету. І ўсё ж сярэднія вякі займаюць цэлае тысячагоддзе. У гэты час у жыцці людзей адбываліся важныя змены. І каб лягчэй было іх вывучыць і зразумець, гісторыкі вылучаюць у сярэдневякоўі тры перыяды.

Першы перыяд называюць **Раннім сярэдневякоўем.** Ён працягваўся з канца V па канец IX ст. У гэты час закладваліся асновы сярэдневяковых цывілізацый. Другі перыяд называюць **Высокім сярэдневякоўем.** Ён працягваўся чатыры стагоддзі — з X па XIII ст. Гэта этап пад'ёму, росквіту сярэдневяковых цывілізацый. Апошні перыяд — **Позняе сярэдневякоўе** — доўжыўся два стагоддзі — з XIV па XV ст. Ён завяршыўся надыходам эпохі, якая прыйшла яму на змену, — **Новым часам.** У 6-м класе вы будзеце вывучаць гісторыю Ранняга і Высокага сярэдневякоўя, а ў 7-м — Позняга. *(Знайдзіце перыяды сярэдневякоўя на «лініі часу». Назавіце храналагічныя рамкі гісторыі сярэдневякоўя.)*

**3. Адкуль мы даведваемся аб сярэдневякоўі?** Сярэдневякоўе пакінула значна больш сведчанняў пра сябе, чым старажытнасць. Усё тое, што было створана людзьмі сярэдневякоўя і захавалася да нашых дзён, вучоныя называюць гістарычнымі крыніцамі. Па іх гісторыкі ўзнаўляюць мінулае, вывучаюць жыццё людзей таго часу.

Правообладатель Народная асвета

**Гістарычная даведка**

У Беларусі захаваліся пабудаваныя ў эпоху сярэдневякоўя велічныя замкі і храмы. У музеях нашай краіны вы можаце паглядзець на выявы Хрыста і святых, старадаўнія манеты, прылады працы і зброю. Вы, магчыма, звярнулі ўвагу на кнігі ў прыгожых пераплётах, дзе старонкі, што пажаўцелі ад часу, аздоблены мудрагелістымі малюнкамі.

Гістарычныя крыніцы падзяляюцца на некалькі груп. ***Рэчыўныя крыніцы*** даюць нам звесткі галоўным чынам аб тым, што было створана працай чалавечых рук: будынкі, прылады працы, посуд, зброя, адзенне, упрыгажэнні і многае іншае. ***Пісьмовыя крыніцы*** нясуць нам значна больш разнастайныя звесткі аб жыцці людзей. Да гэтай групы адносяць законы, розныя дакументы. Да дакументаў адносяццца, напрыклад, дагаворы паміж дзяржавамі, перапісі насельніцтва, судовыя пастановы, гандлёвыя здзелкі і г. д. *(Успомніце, з якімі рэчыўнымі і пісьмовымі гістарычнымі крыніцамі вы пазнаёміліся, вывучаючы гісторыю старажытнага свету.)*



Старонка рукапіснай кнігі. *XII ст.*

Да пісьмовых крыніц адносяцца і сярэдневяковыя *літаратурныя* і *гістарычныя творы*. Сярэдневяковая літаратура надзвычай багатая. Пісьменнікі стварылі нямала *біяграфій*, якія ўзвялічваюць і ўслаўляюць дзейнасць вялікіх людзей. Паэты апявалі ваенныя подзвігі, герояў і прыгожых дам. Царкоўныя дзеячы складалі *жыццеапісанні* святых людзей. Распаўсюджанымі сярэдневяковымі гістарычнымі творамі з'яўляліся *хронікі*, *аналы* і *летапісы*. У хроніках аўтары, як правіла, пачыналі апісанне ад стварэння свету Богам,

Правообладатель Народная асвета

а затым пераходзілі да апісання гісторыі ўсяго вядомага ім свету. У аналах і летапісах усе важнейшыя падзеі запісваліся па гадах.

*Гістарычная даведка*

У аналах звычайна змяшчаліся сціслыя паведамленні аб нашэсці саранчы, эпідэміі, зацьменні Сонца, вайне, уступленні на прастол новага правіцеля, адкрыцці храма і г. д. Аб штодзённым жыцці простых людзей звычайна не паведамлялася. Сярэдневяковыя аўтары лічылі: навошта запісваць тое, што кожнаму вядома? Аднак сучасныя гісторыкі імкнуцца запоўніць гэтыя прабелы.

У сярэднія вякі былі запісаны многія народныя паданні, легенды, быліны. Яны таксама даюць гісторыкам каштоўныя звесткі аб мінулым.

**4. Спадчына сярэдневякоўя.** Чалавецтва абавязана сярэдневякоўю вялізнай колькасцю дасягненняў у жыцці грамадства, у гаспадарцы і культуры. Менавіта ў сярэднія вякі ўзнікла мноства дзяржаў, якія існуюць і цяпер. У тым ліку і славян, сярод якіх былі і нашы продкі. У межах гэтых дзяржаў сфарміраваліся многія сучасныя народы са сваімі адметнымі мовамі і культурамі. Менавіта ў той час былі асвоены неабсяжныя лясныя прасторы, на месцы якіх узніклі новыя паселішчы і гарады.

У сярэднія вякі здзяйсняліся далёкія падарожжы, будаваліся велічныя храмы, рабіліся грандыёзныя адкрыцці і важныя вынаходствы. З'явіліся станкі і доменныя печы, гарматы і механічныя гадзіннікі. У мараплаванні людзі прымянілі компас і іншыя прылады. Яны навучыліся будаваць больш дасканалыя караблі. Нават з'яўленнем гэтай кнігі мы ў многім абавязаны сярэдневякоўю, паколькі менавіта ў той час было зроблена адно з найвялікшых вынаходстваў чалавецтва — *кнігадрукаванне*. Творы сярэдневяковых пісьменнікаў і паэтаў, архітэктараў, мастакоў сталі часткай сучаснай *сусветнай культуры*, аказваючы духоўнае ўздзеянне на ўсе

Правообладатель Народная асвета

наступныя пакаленні. Розум, праца і вера людзей сярэдневякоўя заклалі аснову сучаснага грамадства і спосабу жыцця сучаснага чалавека.

**1.** Чаму другі перыяд сусветнай гісторыі называецца сярэдневякоўем? **2.** Першае ўпамінанне аб Мінску ў крыніцах адносіцца да 1067 г., аб Маскве — да 1147 г., аб Кіеве — да 860 г., аб Гомелі — да 1142 г. Вызначце, да якіх перыядаў сярэдневякоўя адносяцца першыя звесткі аб гэтых гарадах. **3.** Якія характэрныя прыметы цывілізацыі? **4.** Па якіх крыніцах вучоныя вывучаюць гісторыю сярэдніх вякоў? Назавіце вядомыя вам групы гістарычных крыніц. Прывядзіце свае прыклады. **5.** Чаму спадчыну сярэдневякоўя можна лічыць часткай сучаснай сусветнай культуры?

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

# Раздзел I. ЗАХОДНЯЯ ЕЎРОПА І ВІЗАНТЫЯ

## Тэма 1. РАННЯЕ СЯРЭДНЕВЯКОЎЕ (V—IX стст.)

### § 1. Свет і Еўропа ў пачатку сярэдневякоўя

**Успомніце:** **1.** На тэрыторыі якіх частак свету размяшчалася Рымская імперыя? **2.** Якая важнейшая падзея адбылася ў Рымскай імперыі ў 395г.? **3.** Растлумачце значэнне паняццяў: племя, дзяржава, імператар.

**1. Вялікае перасяленне народаў.** Яшчэ ў пачатку нашай эры далёка на ўсходзе кітайскія войскі адкінулі ад сваіх граніц ваяўнічых паўночных суседзяў — плямёны качэўнікаў-*гунаў*. Яны рушылі на захад, па дарозе ўступаючы ў бітву з іншымі плямёнамі і выцiскаючы іх.

У IV ст. полчышчы гунаў рынуліся ў Еўропу. Пад іх націскам іншыя плямёны пачалі адступаць на захад. Народы і плямёны прыйшлі ў рух. Непасрэдна на іх шляху аказалася Рымская імперыя. У IV—VII стст. на велізарных прасторах Еўропы адбывалася **Вялікае перасяленне народаў** — эпоха масавых перамяшчэнняў плямёнаў на тэрыторыю Рымскай імперыі. Рым не змог стрымаць магутнага націску варвараў: гунаў, германскіх і іншых плямёнаў. (*Старажытныя рымляне лічылі ўсіх іншаземцаў, якія не валодалі лацінскай або грэчаскай мовай ці не ведалі гарадскога жыцця,* — **варварамі**.) Варвары ўварваліся ва ўсе правінцыі Заходняй Рымскай імперыі. Нашэсці варвараў неслі з сабой масавыя забойствы людзей, разруху, голад, хваробы. Рымлянам пачало здавацца, што набліжаецца канец свету, які быў прадказаны ў Бібліі. Дні Заходняй Рымскай імперыі былі злічаны. У **476** г. адзін з германскіх правадыроў звергнуў апошняга імператара Заходняй Рымскай імперыі ***Ромула Аўгуста***. Правадыр адправіў знакі імператарскай улады ў сталіцу Усходняй Рымскай імперыі — Канстанцінопаль. Гэта значыла, што імперыі на захадзе больш няма. *Дата* **476** *г. лічыцца канцом эпохі старажытнага свету і пачаткам эпохі сярэдневякоўя.*

Правообладатель Народная асвета

Вялікае перасяленне народаў прывяло да крушэння Заходняй Рымскай імперыі. Усходняя Рымская імперыя ўстаяла перад націскам варвараў.



Свяшчэнны сімвал — арол. Засцежка для плашча. *VI ст.*

**2. Варварскія каралеўствы.** На працягу V ст. на тэрыторыі былой Заходняй Рымскай імперыі заваёўнікі-германцы стварылі многа дзяржаў. Гісторыкі называюць іх ***варварскімі каралеўствамі***, паколькі кіраўнік дзяржавы насіў тытул караля. (**Тытул** — *гэта ганаровае званне, якое прызнаецца грамадствам.*) Буйнейшымі сярод варварскіх каралеўстваў былі: каралеўства вандалаў у Паўночнай Афрыцы, вестготаў у Іспаніі, остготаў у Італіі, франкаў у Францыі, англаў і саксаў у Брытаніі. Варварскія каралеўствы часта ваявалі адно з адным і былі нетрывалымі. Доўгае жыццё было наканавана толькі каралеўству франкаў. Моцным ваенным праціўнікам варварскіх каралеўстваў была Усходняя Рымская імперыя — Візантыя.

**3. Візантыйская і Франкская імперыі.** У эпоху Вялікага перасялення народаў Візантыйская імперыя не толькі выстаяла пад націскам варвараў, але і ўмацавала сваё становішча. Яе правіцелі мелі высокі тытул імператара. Яны валодалі вялізнымі тэрыторыямі ў Еўропе, Азіі і Афрыцы. Візантыя імкнулася ўмацаваць свой уплыў у гэтым вялікім рэгіёне. Яе культурныя традыцыі ўспрынялі многія суседзі, у тым ліку і славянскія краіны. Аднак ужо ў VII ст. у Візантыі з'яўляюцца моцныя праціўнікі на ўсходзе. Да VIII ст. яна страціла многія свае тэрыторыі ў Азіі і Афрыцы.

У канцы V — пачатку VI ст. каралі франкаў здолелі падпарадкаваць сабе мноства варварскіх дзяржаў і плямёнаў. Тут яны падтрымлівалі і распаўсюджвалі хрысціянства. Цяпер каралі франкаў лічылі, што іх дзяржава па сваёй тэрыторыі і магутнасці не саступае Візантыі. Абапіраючыся на падтрымку

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета




Франкская і Візантыйская імперыі ў пачатку IX ст.

Папы Рымскага, у **800** г. кароль франкаў атрымаў тытул імператара. Утварылася ***Франкская імперыя***. Візантыя процістаяць гэтаму не здолела. Хаця Франкская імперыя ў хуткім часе распалася, саперніцтва дзяржаў, што ўзніклі на яе тэрыторыі, з Візантыяй працягвалася. Іх процістаянне было звязана з барацьбой за ўплыў на краіны Еўропы. *(Знайдзіце на карце сталіцы Візантыйскай і Франкскай імперый.)*

**4. Час нашэсцяў.** Пасля VII ст. па Еўропе працягвалі пракатвацца хвалі нашэсцяў: арабаў, нарманаў і венграў. У пачатку VIII ст. качэўнікі-*арабы* з Аравійскага паўвострава завяршылі заваяванне Паўночнай Афрыкі, а затым захапілі Пірэнейскі паўвостраў. Толькі франкі здолелі спыніць конніцу арабаў. З канца VIII ст. і на працягу трох стагоддзяў здзяйснялі напады на многія краіны Еўропы паўночныя германцы — *нарманы*, якія здаўна насялялі Скандынаўскі і Ютландскі паўастравы. У IX ст. з Прыуралля на раўніну па сярэднім цячэнні Дуная прыйшлі качэўнікі-венгры. Вен-

Правообладатель Народная асвета

герская конніца імкліва атакавала краіны Цэнтральнай і Паўднёвай Еўропы. Ваенная небяспека прымусіла заходнееўрапейскія дзяржавы абараняцца. Яны здолелі спыніць уварванні арабаў, нарманаў і венграў. У гэты час з'явілася шмат дзяржаў, створаных рознымі народамі Еўропы.

У канцы Ранняга сярэдневякоўя ў Еўропе ўзніклі дзве новыя цывілізацыі: ***сярэдневяковая заходнееўрапейская*** і ***сярэдневяковая ўсходнееўрапейская***. Іх аснову склалі ў Заходняй Еўропе — Франкская дзяржава, ва Усходняй Еўропе — Візантыя. Гэта прывяло да фарміравання двух самастойных рэгіёнаў — Усходняй Еўропы і Заходняй Еўропы.

**1.** Што прывяло да Вялікага перасялення народаў у IV —VII стст.? **2.** Чаму варварскія каралеўствы ўтварыліся на тэрыторыі Заходняй, а не Усходняй Рымскай імперыі? **3.** Чаму гісторыкі называюць дзяржавы, што ўтварыліся на землях былой Заходняй Рымскай імперыі, «каралеўствамі» і «варварскімі»? **4.** Якія дзве імперыі існавалі ў Еўропе ў канцы Ранняга сярэдневякоўя? Чым адрозніваліся іх тэрыторыі ад Заходняй і Усходняй Рымскай імперый канца IV ст.? **5.** Нашэсці якіх народаў зведала Еўропа пасля VII ст.? Да якіх вынікаў гэта прывяло? **6.** Якія цывілізацыі ўзніклі ў Еўропе ў канцы Ранняга сярэдневякоўя? Якія дзяржавы склалі іх аснову?

***Гістарычная крыніца***

**Гісторык Грыгорый Турскі (VI ст.) аб нашэсці варвараў.** Усё аказалася пад уладай варвараў. Адны загінулі, стаўшы ахвярай подласці або клятвапарушэння, а іншыя былі выдадзены на смерць сваімі суграмадзянамі. Нямала загінула ў засадах ворагаў, але не менш — з прычыны гвалту, што чыніў народ. Тыя, хто здолеў устаяць перад сілай, загінулі ад голаду. Няшчасная маці распасцерлася разам з дзецьмі і мужам. Пан разам са сваімі рабамі сам апынуўся ў рабстве. Многія сталі кормам для сабак, некаторыя жыўцом згарэлі ў сваіх хатах. У гарадах, вёсках, вілах, уздоўж дарог і на скрыжаваннях, тут і там — усюды смерць, пакуты, папялішчы, руіны і смутак. *(Што прынесла насельніцтву Заходняй Рымскай імперыі нашэсце варвараў?)*

Правообладатель Народная асвета

## § 2. Утварэнне дзяржавы франкаў

**Успомніце:** **1.** Да якіх вынікаў прыводзіла вылучэнне знаці сярод абшчыннікаў? **2.** Якія са старажытных зводаў законаў вы ведаеце? **3.** Дайце азначэнне паняццяў: мнагабожжа, народны сход.

**1. Занядкі і грамадскі лад франкаў.** Германскія плямёны франкаў жылі ў нізоўях ракі Рэйн. Пад імем «франкі» было вядома некалькі плямёнаў. Салічнымі франкамі называлася самае ўплывовае з іх. Франкі разводзілі кароў, авечак і свіней, курэй і гусей. Для таго каб узараць зямлю, прыходзілася высякаць і выкарчоўваць лес. Затым сеялі ячмень, жыта, пшаніцу, боб, лён. Франкі здабывалі ежу таксама паляваннем, рыбнай лоўляй, збіраннем дзікарослых раслін. З руды плавілі жалеза, з яго рабілі прылады працы і зброю. Племенем кіраваў *народны сход*. На ім усе мужчыны племені выбіралі правадыроў, прымалі рашэнні па найбольш важных справах: ці пачынаць вайну, заключаць мір і г. д. Франкі пакланяліся мноству багоў.

Яшчэ ў III ст. франкі пачалі нападаць на Рымскую імперыю. У час вайны ўсе мужчыны, здольныя насіць зброю, станавіліся воінамі — фарміравалі *апалчэнне*. Яны выбіралі ваеннага *правадыра* — самага доблеснага і мудрага воіна. Паступова правадыры пачалі набіраць сабе пастаянныя атрады — *дружыны*. Правадыры і іх верная апора — воіны-дружыннікі — узмацняліся. Яны абагачаліся ў час войнаў, прысвойваючы сабе большую частку здабычы. Правадыры пачалі перадаваць сваю ўладу ў спадчыну. Усё больш узрастала грамадская няроўнасць. Сярод франкаў вылучаліся найбольш уплывовыя і багатыя людзі — *знаць*. У выніку ў франкаў узнікла дзяржава.

**2. Хлодвіг — кароль франкаў.** З пачатку V ст. франкі пачалі паступова захопліваць землі ў Галіі. У канцы V ст. правадыр франкаў ***Хлодвіг*** у бітве разбіў рымскае войска і захапіў

Правообладатель Народная асвета

большую частку Галіі. Ён узяў верх у барацьбе з іншымі германскімі правадырамі і значна пашырыў свае ўладанні.

Хлодвіг стаў заснавальнікам аднаго з варварскіх каралеўстваў — ***Франкскай дзяржавы***. Хлодвіг прыняў тытул караля. Такая форма дзяржаўнага праўлення называецца манархіяй. (**Манархія** — *гэта форма праўлення, пры якой вышэйшая ўлада ў дзяржаве знаходзіцца ў руках аднаго чалавека*.) Пры каралю знаходзіўся савет знаці, у якім засядалі яго бліжэйшыя паплечнікі.

### *Гістарычная даведка*

Да заваявання Галіі сваякі Хлодвіга дзялілі з ім уладу над франкамі. Яны правілі ў сваіх невялікіх уладаннях на спрадвечных землях франкаў. Стаўшы каралём, Хлодвіг імкнуўся правіць аднаасобна. У выніку ён расправіўся з усімі сваякамі. На савеце знаці Хлодвіг прытворна скардзіўся: «Гора мне, што ў мяне няма нікога з радні, хто мог бы мне чым-небудзь дапамагчы». Усе маўчалі, баючыся непазбежнай смерці. *(Чаму Хлодвіг баяўся і знішчаў сваякоў?)*

Насельніцтва франкскай дзяржавы складалася з франкаў і рымлян. Яны жылі на адной тэрыторыі, але падпарадкоўваліся розным законам. Рымляне — пісаным законам, прынятым яшчэ ў старажытнасці. Франкі — няпісаным звычаям свайго племені. Падаткі дзяржаве плацілі толькі рымляне. У войску, наадварот, служылі толькі франкі. Франкі былі язычнікамі, верылі ў мноства багоў, а рымляне — хрысціянамі. Гэтыя адрозненні ў грамадстве маглі аслабіць дзяржаву. Але Хлодвіг быў мудрым правіцелем, таму вырашыў прыняць хрысціянства як адзіную рэлігію для ўсіх. Па прыкладу караля франкі хрысціліся. Цяпер яны былі адной веры з пакораным імі рымскім насельніцтвам.

Хлодвіг не хацеў дапускаць і свавольства франкаў, якія жылі па няпісаных звычаях продкаў. Ён загадаў запісаць існуючыя судовыя звычаі салічных франкаў і надаць ім сілу за-

Правообладатель Народная асвета

конаў. Гэты зборнік законаў атрымаў назву **«Салічная праўда»**. *(Растлумачце, у чым розніца паміж пісанымі законамі і няпісанымі звычаямі.)*



Хрышчэнне Хлодвіга ў Рэймсе 25 снежня 498 г.
*Мініяцюра XIII ст.*

Пераемнікі Хлодвіга таксама імкнуліся сцерці розніцу паміж рымлянамі і франкамі. Яны выдавалі агульныя для ўсіх законы, пачалі фарміраваць армію з франкаў і рымлян. Паступова рымляне і франкі зліліся ў адзінае грамадства.

**3. Адносіны ў грамадстве.** Каб стварыць моцнае войска і ўмацаваць уладу, кароль перадаваў воінам зямельныя ўладанні разам з насельніцтвам, што там пражывала. Але гэтыя землі даваліся не ў поўную ўласнасць, а пажыццёва і пры ўмове нясення ваеннай службы. Такое зямельнае ўладанне называлася ***бенефіцыем***. Уладальнікі бенефіцыяў на даход ад гэтых земляў маглі набыць баявога каня і дарагое ўзбраенне. Такія землеўладальнікі залежалі ад караля, які мог пазбавіць іх уладанняў. Па загаду караля яны павінны былі неадкладна выступіць у паход.

На каралеўскіх і перададзеных у карыстанне землях жылі земляробы-***сяляне***. Спачатку яны былі свабодныя. Але паступова ўсе яны траплялі ў залежнасць. Землі адных былі захоплены сілай. Землі іншых былі аддадзены новым гаспадарам у выніку каралеўскіх дарэнняў. Трэція разараліся і былі вымушаны ісці пад апеку буйнога землеўладальніка. Сяляне лічылі за лепшае папасці ў залежнасць ад землеўладальніка, каб толькі не ваяваць з ім і не памерці з голаду. У выніку селянін страчваў права распараджацца зямлёй, але па-ранейшаму працаваў на ёй, каб пракарміць сябе і сваю сям'ю. За гэта ён аддаваў частку сабранага ім ураджаю ўласніку зямлі.

Правообладатель Народная асвета



Шляхі пападання сялян у залежнасць

Такая залежнасць называецца ***пазямельнай***. Больш цяжкай формай залежнасці была ***асабістая***. У гэтым выпадку селянін страчваў не толькі зямлю, але і свабоду. Гаспадар судзіў і распараджаўся яго асабістым жыццём. Так сяляне сталі ***залежнымі***.

У дзяржаве франкаў паступова складваліся адносіны панавання і падпарадкавання, пазямельнай і асабістай залежнасці. Сяляне траплялі ў пазямельную і асабістую залежнасць ад землеўладальніка. Уладальнікі бенефіцыяў знаходзіліся ў пазямельнай залежнасці ад караля. Яны таксама былі і ў асабістай залежнасці ад караля — абавязаны былі несці ваенную службу і выконваць загады.

**1.** Ахарактарызуйце заняткі і грамадскі лад франкаў. **2.** Чаму з III ст. у франкаў узмацнілася грамадская няроўнасць? Да чаго гэта прывяло? **3.** Складзіце схему «Арганізацыя кіравання франкамі пры Хлодвігу», выкарыстоўваючы ў яе ячэйках словы: *кароль*, *савет знаці*, *дружына*. **4.** Што такое бенефіцый? Чаму ўладальнік бенефіцыя залежаў ад караля? **5.** Падрыхтуйце паведамленне пра Хлодвіга. **6.** Растлумачце значэнне паняццяў: «Салічная праўда», асабіста- і пазямельна залежныя сяляне.

### Гістарычная крыніца

**«Салічная праўда».** Калі хто пазбавіць жыцця франка і будзе выкрыты, прысуджваецца да выплаты 200 солідаў (залатых манет). Калі хто пазбавіць жыцця каралеўскага слугу, выплаціць 600 солідаў. Калі хто пазбавіць жыцця рымляніна, выплаціць 100 солідаў. *(Чаму за адно і тое ж злачынства ў франкаў было прадугледжана рознае пакаранне?)*

Правообладатель Народная асвета

*Гістарычная крыніца*

**Грамата аб закабаленні.** Усім вядома, што крайняя беднасць і цяжкія клопаты мяне спасцiглi. Зусім не маю чым жыць і апранацца. Па просьбе маёй вы далі мне грошай, але цяпер мне няма чым іх вярнуць. Прашу зацвердзіць закабаленне маёй свабоднай асобы. З гэтага часу вы маеце права мяне прадаваць, выменьваць і караць. *(Растлумачце, што прымусіла селяніна падпісаць гэту грамату. Чым становішча асабіста-залежнага селяніна адрознівалася ад становішча свабоднага?)*

*Гістарычная даведка*

Закона аб перадачы вярхоўнай улады ў Франкскай дзяржаве не было. Звычайна кожны франкскі кароль яшчэ пры жыцці дзяліў дзяржаву на ўладанні сваіх сыноў. Нярэдка ў дзяржаве франкаў існавала адначасова некалькі каралеўстваў. Як правіла, пасля смерці правіцеля наследнікі пачыналі барацьбу за ўладу. І пад адзінай уладай дзяржава магла апынуцца толькі тады, калі адзін з іх перамагаў астатніх.

## § 3. Франкская імперыя

**Успомніце:** **1.** У выніку чаго Рым стаў буйнейшай дзяржавай старажытнасці? **2.** Якія прычыны распаду дзяржавы Аляксандра Македонскага? **3.** Дайце азначэнне паняццяў: апалчэнне, бенефіцый, законы, ідал.

**1. Карл Вялікі.** У другой палове VIII ст. улада франкскіх каралёў значна ўмацавалася дзякуючы бенефіцыю. Яны мелі і адзіную дзяржаву, і моцнае войска. Землеўладальнікі, якія атрымалі бенефіцыі, былі верныя сваім каралям. Яны імкнуліся да ўзнагарод і новых зямельных уладанняў ад манархаў. Каралеўскае войска было добра арганізавана і ўзброена. Яго ўдарную сілу складалі конныя воіны. Узброіць коннага воіна мог толькі багаты землеўладальнік. Таму значэнне апалчэння, якое складалася з сялян, моцна паменшылася. На палях бітваў апранутыя ў даспехі коннікі з коп'ямі наперавес зломлівалі натоўп апалчэнцаў і дабівалі іх цяжкімі мячамі. Ніхто не мог процістаяць грознай

Правообладатель Народная асвета



Конная статуэтка Карла Вялікага. *X ст.*

конніцы франкаў. Ворагі з жахам глядзелі на людзей з бліскучай зброяй, што сядзелі на вялізных баявых конях.

Пры ***Карле Вялікім*** (768—814 гг.) дзяржава франкаў дасягнула вяршыні магутнасці. Яшчэ пры жыцці яго пачалі называць «найвялікшым з каралёў». І гэта была не пустая лісліваcць. Карл ажыццявіў шмат паходаў і набыў славу непераможнага палкаводца. Ён не раз пераходзіў Альпы і Пірэнеі, паіў свайго каня водамі Эльбы, Дуная, По і Эбра.

***Гістарычная даведка***

Франкі пры Карле зрабілі 8 паходаў супраць саксаў, 7 — супраць арабаў, 5 — супраць лангабардаў, 4 — супраць славян, 4 — супраць аваpaў, 4 — супраць данаў, 2 — супраць брэтонцаў, 1 — супраць баварaў.

***Гістарычная крыніца***

**З сярэдневяковага твора пра Карла Вялікага.** Гэта быў Карл, жалезны імператар. На галаве яго быў жалезны шлем, грудзі і шырокія плечы пакрыты жалезнымі пласцінамі. У левай руцэ высока паднята жалезнае кап'ё, у правай — ручка непераможнага мяча. І конь яго таксама блішчэў жалезным колерам. Сонца бліскала, адлюстраваўшыся ў ззянні жалеза. Усе яго спадарожнікі мелі такое ж узбраенне.

Не ўсе паходы Карла прыводзілі да поспеху. Напрыклад, паход у 778 г. за Пірэнеі аказаўся няўдалым. Горныя плямёны нават акружылі і знішчылі атрад, што прыкрываў адыход франкскага войска. Паводле паданняў, камандзірам гэтага атрада быў пляменнік Карла граф Раланд. Пазней франкі жорстка адпомсцілі горцам-хрысціянам і захапілі поўнач Пірэнейскага паўвострава.

Правообладатель Народная асвета

Асабліва доўгай і цяжкай была вайна франкаў з плямёнамі язычнікаў-*саксаў*. Карл год за годам хадзіў паходамі на іх, знішчаў язычніцкія свяцілішчы і ідалаў, сілай хрысціў пераможаных. Тут ён увёў жорсткія законы: за адмову ад хрышчэння або адрачэнне ад хрысціянскай веры — смяротнае пакаранне. У рэшце рэшт саксы пакарыліся мячу і крыжу.

Карл мог быць не толькі жорсткім, але і гнуткім палітыкам. Так, перш чым адправіцца ў паход на качэўнікаў-*авараў*, ён заключыў саюз са славянамі. Разам яны знішчылі Аварскую дзяржаву, і авары назаўсёды зніклі з гісторыі. У выніку заваёўніцкіх паходаў Карла Вялікага яго дзяржава павялічылася амаль у два разы.

**2. Нараджэнне новай імперыі.** Пасля паходаў Карла Вялікага Франкская дзяржава наблізілася па памерах да былой Заходняй Рымскай імперыі. Карл вырашыў замацаваць сваю магутнасць. У **800** г. ён прыняў тытул імператара ў Рыме. Так узнікла ***Франкская імперыя***. *(Падлічыце, колькі стагоддзяў прайшло пасля падзення Заходняй Рымскай імперыі.)*

***Гістарычная даведка***

Напярэдадні свята Каляд Карл адправіўся ў Рым. Папа Рымскі ўсклаў на галаву Карла карону і абвясціў яго «імператарам рымлян». Гэта азначала, што Карл з'яўляецца абаронцам усіх хрысціян, а Папа Рымскі — адзіным духоўным галавой усёй хрысціянскай царквы.

З гэтага часу ў Еўропе зноў існавалі два тытула імператара і дзве імперыі — Франкская на захадзе і Візантыйская на ўсходзе. Правіцелі абедзвюх імперый лічылі свае дзяржавы наследнікамі Рымскай імперыі. *(Падлічыце, колькі гадоў прайшло з 395 г.)* Сталіцай Франкскай імперыі стаў горад Ахен. Тут Карл пабудаваў палац і вырашаў дзяржаўныя справы.

Правообладатель Народная асвета

Імператар выслухваў парады знаці, але прымаў рашэнні самастойна. У заканадаўстве дзяржавы галоўнымі сталі яго ўказы. Яны з'яўляліся для ўсіх абавязковымі. Кожнай вобласцю краіны кіраваў давераны чалавек караля — ***граф***. Графы збіралі падаткі, чынілі суд, камандавалі мясцовым ваенным атрадам — апалчэннем. Для кантроля над імі Карл рассылаў па ўсёй імперыі «гасударавых пасланцаў» з ліку сваіх паплечнікаў. Пры Карле Вялікім улада манарха ўзмацнілася. Яго імем была названа самая магутная дынастыя правіцеляў франкаў — *Каралінгаў*. (**Дынастыя** — *рад манархаў, што кіруюць дзяржавай паслядоўна і належаць да аднаго і таго ж роду*.)

**3. Падзел Франкскай імперыі.** Пасля смерці Карла Вялікага ў 814 г. Франкская імперыя праіснавала нядоўга. Чаму? У дзяржаву франкаў уваходзіла мноства народаў, якія адрозніваліся звычаямі, мовай, спосабам жыцця. Дзяржаўнае кіраванне ў франкаў было значна слабейшым, чым у Рымскай імперыі. Графаў, «гасударавых пасланцаў» і іншых чыноўнікаў было мала. Наследнік Карла Вялікага згодна з даўнім звычаем падзяліў дзяржаву паміж сваімі сынамі. Яны пачалі бязлітасныя войны паміж сабой. Усё гэта прывяло да распаду імперыі. У **843** г. у горадзе ***Вердэне*** ўнукі Карла Вялікага падпісалі дагавор аб падзеле дзяржавы паміж сабой на тры часткі. *(Падлічыце, колькі гадоў праіснавала імперыя, заснаваная Карлам Вялікім.)* Пазней на аснове Усходне-Франкскай дзяржавы сфарміравалася ***Германская дзяржава***. А на аснове Заходне-Франкскага каралеўства ўзнікла дзяржава ***Францыя***. Цэнтральную частку імперыі спачатку падзялілі паміж сабой заходні і ўсходні суседзі. Затым на гэтай тэрыторыі ўтварылася некалькі невялікіх дзяржаў. *(На якія дзяржавы распалася імперыя Карла Вялікага? Пакажыце іх на карце.)*

Народная асвета
Правообладатель Народная асвета




Падзел Франкскай імперыі

**1.** Чым тлумачацца ваенныя поспехі франкаў у другой палове VIII ст.? **2.** Чаму Карл Вялікі атрымаў ганаровую мянушку «Вялікі»? **3.** Параўнайце адносіны Карла Вялікага да хрысціянства і да язычніцтва. **4.** Складзіце схему «Арганізацыя кіравання ў імперыі Карла Вялікага», выкарыстоўваючы ў яе ячэйках словы: *імператар*, *савет знаці*, *войска караля*, *граф*, *падаткі*, *суд графа*, *апалчэнне*. **5.** Чаму распалася Франкская імперыя?

## § 4. Візантыйская імперыя

**Успомніце:** **1.** Які горад называлі «Вечным»? **2.** Якія падзеі адбыліся ў 395 і 476 гг.? **3.** Растлумачце значэнне паняццяў: імперыя, імператар, чыноўнік, законы.

**1. Утварэнне Візантыйскай імперыі.** Датай узнікнення Усходняй Рымскай імперыі лічыцца 395 г. Пазней яе пачалі называць ***Візантыяй***.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

*Гістарычная даведка*

Назва «Візантыя» паходзіць ад назвы «Візáнтый» — так называўся старажытнагрэчаскі горад на беразе Басфорскага праліва. На гэтым месцы ў 330 г. імператар Канстанцін заснаваў новую сталіцу. Яе сталі называць Канстанцінопалем — «горадам Канстанціна». Жыхары называлі сваю дзяржаву па-грэчаскі «Рамейскай» (Рымскай), а сябе — «рамеямі».

У адрозненне ад Заходняй Рымскай імперыі Візантыя пазбегла заваявання варварамі. Чырвоныя сцягі з выявай Ісуса Хрыста па-ранейшаму развяваліся на візантыйскіх крапасных бастыёнах. Сцены яе магутных гарадоў, сіла арміі і мудрасць правіцеляў Візантыі сталі неадольнай перашкодай. Праз яе так і не змаглі прабіцца плямёны гунаў, германцаў, авараў.

Візантыя валодала велізарнай тэрыторыяй у трох частках свету — Еўропе, Азіі і Афрыцы. Урадлівыя землі давалі высокія ўраджаі. У Візантыі было шмат квітнеючых гарадоў. Самым буйным з іх з'яўляўся Канстанцінопаль — сталіца Візантыі. Горад імкліва рос і багацеў, паколькі знаходзіўся на скрыжаванні важнейшых гандлёвых шляхоў. Ён уражваў прыгажосцю сваіх цэркваў і палацаў. У гарадах развіваліся шматлікія рамёствы. Асабліва славіліся вырабы са шкла, шоўка, папіруса. Візантыйскія купцы гандлявалі ў розных краінах Еўропы і Усходу, дабіраючыся да Індыі і нават Кітая.

**2. Улада імператара.** Улада імператара Візантыі была велізарнай. Ён быў вярхоўным суддзёй, асабіста прызначаў вышэйшых чыноўнікаў, усіх военачальнікаў і паслоў. Імператар кіраваў дзяржавай, абапіраючыся на чыноўнікаў. Чыноўнікі сталіцы кіравалі чыноўнікамі на месцах. Імператар аддаваў загады военачальнікам, якія кіравалі наёмнай арміяй і моцным флотам. Такое кіраванне называлася ***цэнтралізаваным***. Імператар і яго акружэнне, чыноўнікі, армія і флот утрымліваліся за кошт падаткаў з сялян, рамеснікаў і купцоў. Дзяржаўнай рэлігіяй у Візантыі з'яўлялася хрысціянства. Царква

Правообладатель Народная асвета



Прыём замежных паслоў імператарам Візантыі. *Малюнак сучаснага мастака*



Імператар Юстыніян і прыдворныя. *Мазаіка ў Равене. VI ст.*

ў Візантыі была цалкам падпарадкавана дзяржаве. Яе галава — патрыярх Канстанцінопаля залежаў ад імператара. Загады і распараджэнні пісалі на грэчаскай мове. Яе разумела большасць насельніцтва краіны. У Візантыі жыло мноства народаў: германцы, славяне, армяне, грузіны, сірыйцы, яўрэі, егіпцяне і многія іншыя. Грэчаская мова і хрысціянская вера аб'ядноўвалі ўсё насельніцтва краіны.

**3. Росквіт Візантыі ў часы праўлення Юстыніяна.** Найбольшага росквіту Візантыйская імперыя дасягнула пры імператару ***Юстыніяне*** (527—565 гг.) Гэта быў чалавек вялікага розуму і моцнага характару. Ён клапаціўся аб развіцці рамяства, гандлю, росквіце гарадоў і культуры. Юстыніян загадаў сабраць і перапрацаваць рымскія і візантыйскія законы. Зборнік законаў атрымаў назву ***«Кодэкс Юстыніяна»***. Законы «Кодэкса» рэгулявалі адносіны людзей у грамадстве.

Юстыніян імкнуўся да аднаўлення ўсёй Рымскай імперыі ў ранейшых межах. У выніку паспяховых войнаў на захадзе тэрыторыя Візантыі павялічылася ўдвая. Адначасова Юстыніяну давялося адбіваць напады з усходу — Іранскай дзяржавы і з поўначы — славянскіх плямёнаў. Пасля доўгіх войнаў Юстыніян здолеў заключыць мір з Іранам і адбіць нашэсце

Правообладатель Народная асвета

славян. За гады праўлення Юстыніяна Візантыя стала адной з мацнейшых дзяржаў свету.

**4. У кальцы ворагаў.** Росквіт Візантыі аказаўся нядоўгім. Пераемнікі Юстыніяна не змаглі абараніць краіну ад заваёўнікаў. Цяжкія ўдары сыпаліся з усіх бакоў. Візантыя ўступала сваім ворагам усё новыя і новыя землі. У VII ст. Візантыя апынулася на краі гібелі. Заваёўнікі нават асаджвалі Канстанцінопаль. З велізарнымі цяжкасцямі візантыйцы здолелі адстаяць сталіцу, а затым вярнуць частку сваіх тэрыторый. Але адна за адной землі Візантыі пераходзілі пад уладу заваёўнікаў. У VII ст. арабы захапілі Сірыю, Палесціну, Паўночную Афрыку. Паў свяшчэнны для хрысціян горад Іерусалім. У VII—IX стст. граніцы імперыі трывожылі печанегі, балгары, венгры, нарманы. Згубіўшы частку зямель, Візантыя ўжо не магла, як раней, збіраць вялікія падаткі, яе войска слабела. Імперыю ўратоўвалі ад гібелі толькі яе паслы. Ім удавалася лоўка сутыкаць ворагаў сваёй краіны аднаго з другім. Толькі ў канцы IX ст. Візантыя пачала ўмацоўваць сваё становішча. Аднак тэрыторыя імперыі ўжо скарацілася на дзве трэці.

**1.** Чаму Візантыі ўдалося выстаяць пад ударамі заваёўнікаў у канцы IV ст.? **2.** Якое з дасягненняў эпохі праўлення Юстыніяна можна лічыць галоўным? **3.** Чым адрознівалася кіраванне дзяржавай у Візантыі і імперыі Карла Вялікага? **4.** Якія тэрытарыяльныя страты панесла Візантыя ў VII—IX стст.? **5.** Растлумачце значэнне паняццяў: «Кодэкс Юстыніяна», цэнтралізаванае кіраванне.

***Гістарычная крыніца***

**З «Кодэкса Юстыніяна».** Правасуддзе ёсць нязменная і пастаянная воля прадастаўляць кожнаму яго права. Правы гэтыя наступныя: сумленна жыць, не рабіць шкоды іншаму, кожнаму адказваць за ўчынкі свае асабіста. Свабода ёсць натуральная здольнасць кожнага рабіць тое, што хочацца, не парушаючы закон. *(Як вы думаеце, ці выкарыстоўваюцца гэтыя палажэнні «Кодэкса Юстыніяна» ў заканадаўстве сучасных краін?)*

Правообладатель Народная асвета

## § 5. Хрысціянства ў Еўропе

**Успомніце:** **1.** Прывядзіце прыклады язычніцкіх уяўленняў. **2.** Калі і ў якой дзяржаве ўзнікла хрысціянства? **3.** Чым хрысціянства адрознівалася ад язычніцтва?

**1. Распаўсюджванне хрысціянства.** З канца IV ст. дзяржаўнай рэлігіяй Рымскай імперыі стала хрысціянства. (**Дзяржаўная рэлігія** — *гэта пануючая і адзіная дазволеная рэлігія ў дзяржаве*.) З гэтага часу самі рымскія імператары падтрымлівалі хрысціян і арганізацыі веруючых — ***цэрквы***. Царква, у сваю чаргу, падтрымлівала дзяржаву: яе прапаведнікі сцвярджалі: «Усякая ўлада — ад Бога». Абапіраючыся на дзяржаўную падтрымку, хрысціяне пачалі праследаваць пакланенне язычніцкім багам. Закрываліся язычніцкія храмы, былі забаронены Алімпійскія гульні і крывавыя баі гладыятараў. *(Падумайце, чаму хрысціяне былі супраць правядзення Алімпійскіх гульняў і выступленняў гладыятараў.)* У выніку ўплыў хрысціянства ў Еўропе ў першай палове V ст. значна ўзрос. Аднак пасля падзення Заходняй Рымскай імперыі пазіцыі хрысціянства на захадзе Еўропы некалькі пахіснуліся. Гэта было звязана з тым, што варвары, якія сюды прыйшлі, прынеслі з сабою і сваю рэлігію.

Правадыры і каралі варвараў вельмі хутка ўсвядомілі выгаду прыняцця хрысціянства. Дзякуючы хрысціянству яны атрымлівалі падтрымку царквы і ўмацоўвалі сваю ўладу. Адзіная вера дапамагала пазбавіцца міжплямённых адрозненняў, аб'ядноўвала насельніцтва краіны. Ужо ў пачатку Ранняга сярэдневякоўя хрысціянства было прынята ў многіх варварскіх каралеўствах. Варвары спачатку мала разумелі тонкасці хрысціянскага вучэння і абрадаў, таму пакланяліся і Богу, і сваім старым ідалам. Але вера ў Бога змякчыла норавы варвараў, яны пачалі менш рабаваць і забіваць, не чапалі цэрквы і паважалі свяшчэннікаў. У цэрквах ім паўтаралі словы Ісуса Хрыста: «Ва ўсім, як хочаце, каб з вамі абыходзіліся лю-

Правообладатель Народная асвета

дзі, так і вы абыходзьцеся з імі». Разам з тым у мноства сваіх багоў працягвалі верыць усходнія германскія плямёны, народы Скандынавіі, многія плямёны Брытаніі, балты і славяне. Да іх з крыжам у руках ішлі хрысціянскія прапаведнікі — місіянеры.

***Гістарычная даведка***

Асноўныя цэнтры, з якіх місіянеры адпраўляліся прапаведаваць хрысціянства сярод язычнікаў, былі Візантыя, Рым і Ірландыя. Пазней царква прылічыла да ліку святых найбольш вядомых місіянераў. Патрыка — за яго пропаведзі ў Ірландыі, Баніфацыя — сярод германцаў, Кірыла і Мефодзія — за асвету славян і іншых народаў Усходняй Еўропы.

Місіянеры самаадданa прапаведавалі сваю веру сярод язычнікаў. Іх не палохалі холад, голад, нават пагроза смерці. Дзякуючы іх дзейнасці многія язычнікі абарачаліся ў хрысціянскую веру. На працягу Ранняга сярэдневякоўя хрысціянства прыняла большасць народаў Еўропы.

**2. Іерархія духавенства.** У канцы IV ст. у ***хрысціянскай царкве*** вылучыліся заходняя і ўсходняя цэрквы. *(З якой падзеяй у гісторыі Рымскай імперыі было звязана такое адасабленне цэркваў?)* Усе свяшчэннаслужыцелі царквы складалі асобы слой — ***духавенства***. Яно падзялялася на вышэйшае і ніжэйшае ў адпаведнасці з іерархіяй. (**Іерархія** — *размеркаванне службовых званняў і чыноў па старшынству*.) У кожнага свяшчэнніка быў свой прыход. Ён складаўся з жыхароў некалькіх вёсак або некалькіх гарадскіх кварталаў. У прыходскім храме свяшчэннік вёў богаслужэнне і выконваў царкоўныя абрады. Некалькі прыходаў утваралі епіскапствы на чале з



Царква ў Равене. *V ст.*

Правообладатель Народная асвета




Арганізацыя хрысціянскай царквы Заходняй Еўропы ў IX ст.

*епіскапам*. Рэзідэнцыі епіскапаў знаходзіліся ў гарадах. Наступнымі ступенямі ў іерархіі духавенства былі *мітрапаліт* і *архіепіскап*. Яны ўзначальвалі царкву вялікага горада або кіравалі царкоўнымі справамі ў буйных абласцях. На вяршыні царкоўнай іерархіі хрысціянскага Усходу былі чатыры *патрыярхі*. Цэнтры патрыярхій знаходзіліся ў Канстанцінопалі, Александрыі, Антыохіі і Іерусаліме. Найбольш уплывовым быў патрыярх Канстанцінопаля. На Захадзе найбольшым уплывам карыстаўся епіскап Рыма — *Папа Рымскі*. Ён абвясціў сябе пераемнікам апостала Пятра. Апостал Пётр, паводле хрысціянскіх вераванняў, быў пастаўлены Ісусам Хрыстом на чале ўсіх апосталаў.

Некаторыя людзі, што шчыра верылі, адыходзілі ад мітусні штодзённага жыцця, ішлі жыць у адасобленыя месцы. Там іх заняткам былі малітвы, роздум аб вечным жыцці. Іх называлі *манахамі*. Адны манахі жылі цалкам адасоблена, іншыя сяліліся абшчынамі ў спецыяльных будынках — *манастырах*.

**3. Царква ў дзяржаве франкаў.** Франкі прынялі хрысціянства ў самым канцы V ст. У сярэдзіне VIII ст. Папа Рымскі прызнаў законным захоп улады каралём з дынастыі Каралінгаў. Ён забараніў франкам выбіраць каралёў з іншай дынастыі. Франкскі кароль, у сваю чаргу, разграміў варвараў,

Правообладатель Народная асвета

якія пагражалі Рыму, і падараваў Папе частку зямель у Італіі. Так у 756 г. узнікла ***папская дзяржава***, галоўным горадам якой быў Рым. Гэта папская дзяржава ў цэнтры Італіі праіснавала да 1870 г. *(Падлічыце, колькі стагоддзяў яна праіснавала.)* У далейшым імператары франкаў шчодра даравалі царкве землі, падтрымлівалі і абаранялі яе. Імператары абавязалі ўсіх веруючых аддаваць царкве дзесятую частку сваіх даходаў — ***дзесяціну***. У выніку склаўся цесны саюз правіцеляў франкскай дзяржавы і царквы. Дзякуючы яму папы ўстанавілі сваё панаванне над царквой Захаду, а правіцелі франкаў умацавалі сваю ўладу.

**4. Саперніцтва Рыма і Канстанцінопаля.** Да канца Ранняга сярэдневякоўя папы рымскія ўзначалілі ўсіх хрысціян Заходняй Еўропы. Іх галоўнай апорай былі правіцелі франкаў. Але імперыя франкаў сапернічала з іншай імперыяй — Візантыйскай. Саперніцтва гэтых дзвюх вялізных дзяржаў было важнейшай прычынай супярэчнасцей паміж цэрквамі Заходняй Еўропы і Візантыі. Кожная з гэтых цэркваў лічыла, што толькі яна з'яўляецца адзінай уладыкай усяго хрысціянскага свету. Папа Рымскі і патрыярх Канстанцінопаля абвінавачвалі адзін аднаго ў «няправільнай веры» ў Бога. Галоўная супярэчнасць была ў разуменні палажэння аб Тройцы. На Усходзе лічылі, што Святы Дух ідзе толькі ад Бога-Айца, а на Захадзе — што ад Бога-Айца і ад Бога-Сына. Заходняя царква праводзіла богаслужэнні на лацінскай мове, усходняя царква — на грэчаскай і іншых мясцовых мовах.

Акрамя таго, паміж жыхарамі Заходняй Еўропы і Візантыі паступова расла непрыязнасць. Візантыйцы лічылі, што ўсе заходнееўрапейцы былі грубымі, неадукаванымі, крыважэрнымі варварамі, якія не заслугоўвалі звання наследнікаў былой велічы Рымскай імперыі. Заходнееўрапейцы, у сваю чаргу, адзываліся аб жыхарах Візантыі як аб спешчаных, хітрых людзях, што жывуць у багацці, якое дасталася ім незаслужана, паколькі не было здабыта з мячом у руках.

Правообладатель Народная асвета

Саперніцтва Рыма і Канстанцінопаля паступова прывяло да царкоўнага расколу і ўтварэння самастойных заходняй і ўсходняй цэркваў.

**1.** Раскажыце, як адбывалася ўстанаўленне хрысціянства ў Еўропе. **2.** Чаму саюз франкскіх правіцеляў з хрысціянскай царквой быў узаемна выгадны? **3.** Хто стаяў на чале царкоўнай іерархіі? Якое месца ў царкоўнай іерархіі займаюць мітрапаліт і архіепіскап? **4.** Калі і як узнікла папская дзяржава? **5.** Што з'яўлялася галоўнай прычынай саперніцтва заходняй і ўсходняй цэркваў?

## § 6. Вытокі сярэдневяковай культуры

**Успомніце:** **1.** Назавіце выдатных дзеячаў культуры антычнасці. **2.** Растлумачце значэнне паняццяў: антычнасць, манастыр, адукацыя, навуковыя веды.

**1. Антычная спадчына і царква.** Калі Заходняя Рымская імперыя пала, варвары-пераможцы не адчувалі патрэбы ў яе культурнай спадчыне. Заваёўнікі аддавалі перавагу пры рассяленні не гарадам, а сельскай мясцовасці. Там яны займаліся земляробствам і жывёлагадоўляй — тым, што ўмелі. Разбураныя варварамі гарады апусцелі. У антычнасці ж яны былі галоўнымі цэнтрамі рамяства, гандлю, культурнага жыцця. Ратуючыся ад голаду, жыхары спустошаных гарадоў ішлі ў вёскі, каб працай на зямлі здабыць сабе харчаванне. Апусцелі гарадскія тэатры, амфітэатры, цыркі. У іх больш не збіраліся натоўпы гледачоў, якія жадалі відовішчаў, не гучалі галасы паэтаў, акцёраў. Людзям было не да відовішчаў, яны былі заклапочаны тым, як выжыць у гэтыя суровыя часы. А варвараў-пераможцаў не цікавілі кнігі, творы мастацтва. Яны былі ўсе пагалоўна непісьменныя. У пачатку сярэдневякоўя ў Заходняй Еўропе нават каралі не ўмелі ні чытаць, ні пісаць. Адукацыя, культура прыйшлі ў заняпад.

Галоўнай захавальніцай культуры заставалася хрысціянская царква. Свяшчэннікі і манахі аказаліся самымі адука-

Правообладатель Народная асвета


Манах — перапісчык кніг.
*Мініяцюра XI ст.*

ванымі людзьмі. Не ведаючы лацінскую і грэчаскую мовы, нельга было чытаць Біблію і весці богаслужэнні. Без ведаў у галіне астраноміі немагчыма было вылічыць даты хрысціянскіх святаў. Без ведання архітэктуры ніхто не мог пабудаваць хрысціянскі храм. Таму царква старанна захоўвала антычныя веды.

*Гістарычная даведка*

**Ісідор Севільскі (VII ст.) склаў працу «Этымалогія».** Гэта была велізарная энцыклапедыя. У ёй Ісідор даступна расказаў пра дасягненні антычных вучоных у матэматыцы, астраноміі, геаграфіі, медыцыне, архітэктуры, гісторыі і многіх іншых навуках.

Але галоўным для царквы было ***багаслоўе*** — вучэнне пра Бога. Царква асуджала язычніцтва і яго праяўленні ў антычнай культуры. Міфы, трагедыі, паэмы, дзе апавядалася аб язычніцкіх багах, не прызнаваліся хрысціянамі. Напрыклад, «Іліяда» Гамера, у якой Траянская вайна разгарэлася з-за спрэчкі багінь, хрысціянам была незразумелай. Лёс антычнай культуры, навукі, адукацыі і мастацтва апынуўся ў руках царквы. Што рабіць з культурай мінулага? Шмат хто са служыцеляў царквы лічыў, што антычная вучонасць хрысціянам наогул непатрэбна. Але многія разумелі — без дасягненняў культуры мінулага нельга абысціся. У выніку хрысціянская царква не адмовілася ад культурнай спадчыны антычнасці. Яна стала яе захавальніцай, але адмовілася ад усяго, што было звязана з язычніцтвам.

Свой уклад у сярэдневяковую культуру Заходняй Еўропы ўнеслі і варварскія народы. Ад іх захаваліся песні і паданні аб подзвігах правадыроў і іх дружыннікаў, аб героях, якія ратуюць сваё племя ад страшэнных пачвар.

Правообладатель Народная асвета

**2. Развіццё адукацыі і навуковых ведаў.** У Раннім сярэдневякоўі ў Заходняй Еўропе галоўнымі цэнтрамі адукацыі і культуры сталі манастыры. Тут чыталі, перапісвалі і захоўвалі кнігі. У бібліятэках манастыроў разам з Бібліяй, жыццяпісамі святых захоўваліся працы грэчаскіх і рымскіх вучоных, старажытныя кнігі пра кіраванне дзяржавай, кнігі аб розных механізмах.

У школах пры манастырах і цэрквах рыхтавалі манахаў і свяшчэннікаў. Але там таксама вучыліся і ўсе тыя, хто проста хацеў стаць пісьменнымі людзьмі. Спачатку вучылі чытаць і пісаць па-лацінску, выступаць з прамовамі, дыскуціраваць. Затым — лічыць, вымяраць адлегласці, сачыняць музыку і сачыць за зоркамі. Вышэйшых навучальных устаноў у Заходняй Еўропе ў той час не было. Развіццё навукі тут амаль спынілася.

У Візантыі ў Раннім сярэдневякоўі ў адрозненне ад Заходняй Еўропы не было заняпаду культуры. Імперыі былі патрэбны адукаваныя чыноўнікі, палкаводцы і паслы. Нават купцы і рамеснікі разумелі неабходнасць адукацыі. Таму ў імперыі было шмат дзяржаўных і прыватных школ. Яны давалі пачатковую, сярэднюю і вышэйшую адукацыю.

***Гістарычная даведка***

Вышэйшыя школы рыхтавалі вышэйшых чыноўнікаў. Там вучыліся дзеці вяльмож, будучыя кіраўнікі Візантыі. Такія школы былі ў Канстанцінопалі, Афінах, Александрыі і іншых буйных гарадах. У іх вывучалі права, багаслоўе, медыцыну і іншыя навукі. У канцы Ранняга сярэдневякоўя, калі Візантыя страціла многія тэрыторыі, вышэйшая адукацыя захавалася толькі ў сталіцы.

Візантыйская навука не ведала сабе роўных у Еўропе. Гісторык ***Пракопій Кесарыйскі*** (VI ст.) апісаў ваенныя паходы Юстыніяна, яго дзяржаўную дзейнасць. ***Калінік*** (VII ст.) вынайшоў новую зброю — «грэчаскі агонь». Гэта была гаручая сумесь, якая выкідвалася струменем з трубы ў бок ворага. Вучоны ***Леў Матэматык*** (IX ст.) праславіўся сваімі адкрыццямі ў матэматыцы і вынаходніцтвам механізмаў.

Правообладатель Народная асвета

**4. Культура Візантыі.** У Візантыі, як і ў старажытнасці, будаваліся велічныя будынкі і храмы, плошчы гарадоў упрыгожваліся статуямі і фантанамі. Архітэктура і жывапіс, музыка і літаратура праслаўлялі Бога і правіцеляў Візантыі. Вышэйшым дасягненнем візантыйскай архітэктуры з'яўляецца *храм Святой Сафіі* ў Канстанцінопалі (VI ст.). Сучаснікаў асабліва ўражвала ўнутраная прастора храма і яго купал, які быццам бы вісіць у струменях сонечнага святла.

*Гістарычная крыніца*

**Паслы славян аб храме Святой Сафіі.** Увялі нас туды, дзе служаць яны Богу свайму, і не ведалі — на зямлі або на небе мы: таму што няма на зямлі такога відовішча і прыгажосці такой, і не ведаем, як і расказаць аб гэтым, — ведаем мы толькі, што знаходзіцца там Бог з людзьмі.

Сцены і скляпенні візантыйскіх палацаў і храмаў упрыгожваліся ***мазаікамі*** і фрэскамі. На самым ганаровым месцы ў храмах знаходзіліся ***іконы.*** Жывапісцы звярталі ўсю ўвагу гледача на твары і вочы Ісуса Хрыста, Багародзіцы, святых. Асабліва выразнымі, «жывымі» здаваліся вочы. Яны глядзелі на чалавека, нават калі ён адыходзіў у бок. (**Мазаіка** — *выява або ўзор, выкананы з каляровых каменьчыкаў, непразрыстага шкла і іншых матэрыялаў.* **Ікона** — *жывапісная выява Ісуса Хрыста, Багародзіцы і святых, напісаная фарбамі на спецыяльна падрыхтаваных дошках.*)



Храм Святой Сафіі.
*Сучасны выгляд*

У перыяд Ранняга сярэдневякоўя Візантыя была самай культурна развітой краінай

Правообладатель Народная асвета



Багародзіца з дзіцём. *Фрэска VI ст.*

Еўропы. Правіцелі дзяржаў Заходняй Еўропы запрашалі з Візантыі архітэктараў, мастакоў і ювеліраў. У Канстанцінопаль накіроўваліся маладыя людзі з усёй Еўропы для вывучэння матэматыкі, медыцыны, законаў. Культура Візантыі зрабіла вялікі ўплыў на Заходнюю Еўропу і славянскія краіны.

**5. «Каралінгскае адраджэнне».** Заваяваўшы многія землі, Карл Вялікі разумеў, што для кіравання велізарнай дзяржавай патрабуецца вялікая колькасць адукаваных людзей. Таму ён загадаў адкрыць многа пачатковых школ. Затым ён запрасіў у сталіцу імперыі горад Ахен вядомых вучоных, пісьменнікаў, архітэктараў. Карл з гордасцю называў невялікае кола сваіх вучоных Акадэміяй. Самым славутым вучоным быў ***Алкуін***. Ён прыехаў з Брытаніі і хутка стаў выхавальнікам дзяцей імператара. Алкуін стварыў падручнікі для пачатковых школ. Другі вучоны акадэміі ***Эйнгард*** стварыў жыццяпіс імператара — «Жыццё Карла Вялікага». Гэты кароткі перыяд уздыму культуры пры першым імператару франкаў пазней назвалі «***Каралінгскім адраджэннем***».

Ва ўзаемадзеянні хрысціянства, спадчыны антычнай культуры і культуры варварскіх народаў нарадзілася сярэдневяковая культура. Гэта — вытокі сучаснай еўрапейскай культуры.

?

**1.** Якімі былі адносіны царквы да антычнай спадчыны? **2.** Параўнайце развіццё адукацыі і навуковых ведаў у Заходняй Еўропе і Візантыі ў Раннім сярэдневякоўі. **3.** Падрыхтуйце расказ аб якім-небудзь выдатным помніку культуры Візантыі. **4.** Якое месца займае культура Візантыі ў гісторыі раннесярэдневяковай Еўропы? **5.** Што такое «Каралінгскае адраджэнне»? Чым яно было выклікана? **6.** Растлумачце значэнне паняццяў: багаслоўе, мазаіка, ікона.

Правообладатель Народная асвета

### *Гістарычная даведка*

**Сярэдневяковая кніга.** У старажытнасці пісалі трысняговым стрыжнем на адным баку ліста папірусу, а затым скручвалі яго і захоўвалі ў футляры. У першых стагоддзях нашай эры кніга набыла выгляд складзеных і пераплеценых лістоў. Пісаць пачалі птушынымі пёрамі з абодвух бакоў *пергамента*, які рабілі з цялячай або авечай скуры. Для вырабу кнігі часам выкарыстоўваліся дзесяткі скур жывёл. Рукапісную кнігу стваралі вельмі доўга. Нярэдка над адной кнігай працавалі некалькі пакаленняў перапісчыкаў. Яны старанна каліграфічным (прыгожым) почыркам выводзілі кожную літару. Другія людзі ўпрыгожвалі малюнкамі ў пачатку чырвонага радка вялікія літары — *ініцыялы*, малявалі *мініяцюры*, трэція — рабілі пераплёты і аздаблялі іх каштоўнымі камянямі, золатам. Кнігі захоўваліся ў бібліятэках, нярэдка прымацоўваліся да полак ланцугамі. Кнігі каштавалі вельмі дорага і лічыліся цэннымі рэчамі. Каралі і знаць дарылі кнігі са сваіх бібліятэк пры заключэнні дагавораў, нараджэнні дзіцяці, на вяселле. На Бібліі давалі прысягу ў судзе і пры заключэнні саюзаў.

Запоўніце табліцу «Старажытныя скруткі і сярэдневяковыя кнігі».

| Пытанні для параўнання | Старажытныя скруткі | Сярэдневяковыя кнігі |
|---|---|---|
| Чым пісалі? | | |
| Дзе хранілі? | | |
| На чым пісалі? | | |
| Як аздаблялі? | | |

Правообладатель Народная асвета

# Тэма 2. ВЫСОКАЕ СЯРЭДНЕВЯКОЎЕ (X—XIII стст.)

## § 7. Свет і Еўропа ў Высокім сярэдневякоўі

**Успомніце:** **1.** На якія перыяды падзяляецца эпоха сярэдніх вякоў? **2.** Чаму распалася Франкская імперыя? **3.** Якія заваёўнікі нападалі на Візантыю ў VII — IX стст.?

**1. Утварэнне новых дзяржаў у Заходняй Еўропе.** Пасля падзелу імперыі Карла Вялікага ў Заходняй Еўропе ўзніклі Францыя, Германія і шэраг іншых дзяржаў. У 962 г. на аснове Германскага каралеўства была створана ***Свяшчэнная Рымская імперыя.***

*Гістарычная даведка*

Германскі кароль Атон I атрымаў шэраг ваенных перамог над язычнікамі венграмі і славянамі. Як абаронца хрысціянскай веры ён дабіўся каранацыі ў Рыме. Тытул імператара Атон I атрымаў ад Папы Рымскага. Так была створана новая «Рымская імперыя». Пазней яна пачала называцца Свяшчэннай Рымскай імперыяй. Яна спыніла сваё існаванне толькі ў 1806 г. *(Падлічыце, колькі стагоддзяў праіснавала Свяшчэнная Рымская імперыя.)*

У пачатку Высокага сярэдневякоўя на поўначы Еўропы нарманы стварылі дзяржавы: Швецыю, Данію, Нарвегію, а венгры — дзяржаву ў цэнтры Еўропы — Венгрыю. Германскімі плямёнамі англаў і саксаў была створана дзяржава Англія. На поўначы Пірэнейскага паўвострава знаходзілася некалькі хрысціянскіх дзяржаў. У гэты час узніклі таксама Чэшская і Польская дзяржавы. *(Якія з названых вышэй дзяржаў існуюць і цяпер?)*



Імператар Атон III (980—1002) і прыдворныя. *Мініяцюра X ст.*

Правообладатель Народная асвета

**2. Феадальная раздробленасць у Заходняй Еўропе.** У аснове жыцця сярэдневяковага заходнееўрапейскага грамадства ляжалі адносіны паміж людзьмі, заснаваныя на ўласнасці на зямлю. Сярэдневяковае грамадства дзялілася на групы — саслоўі. (**Саслоўе** — *група людзей у грамадстве, якая мае замацаваныя законам правы і абавязкі, што перадаюцца ў спадчыну*.)

### Гістарычная даведка

У IX ст. свяшчэннікі пісалі, што грамадства падобна да Тройцы. Як у Тройцы злучаюцца Бог-Айцец, Бог-Сын і Святы Дух, так і ў грамадстве злучаюцца тры групы людзей: тыя, хто «моліцца», — свяшчэннікі; тыя, хто «ваюе», — сеньёры і васалы; тыя, хто «арэ», — сяляне. Гэтыя тры групы феадальнага грамадства называлі саслоўямі.

Жыццё сярэдневяковай дзяржавы, яго палітыку ў многім вызначалі землеўладальнікі — уладальнікі бенефіцыяў. Яны паступова ўмацоўваліся ў сваіх землях. За службу і ўдзел у войнах яны дабіваліся ад каралёў перадачы ім усё новых і новых правоў: судзіць мясцовае насельніцтва, караць злачынцаў, збіраць падаткі. Гэтыя правы запісваліся і захоўваліся.

Гаспадарка бенефіцыяў была адасобленая. Іх уладальнікі забяспечвалі сябе за кошт працы залежных ад іх сялян. Краіна быццам бы складалася з мноства незвязаных паміж сабой гаспадарак. З цягам часу ўладальнікі бенефіцыяў пачалі ўсведамляць, што з'яўляюцца ў сваіх землях поўнаўладнымі валадарамі. Гэта дазволіла ім дамагчыся права перадачы бенефіцыя ў спадчыну сваім сынам. Такое зямельнае ўладанне пачалі называць феод, а іх уладальнікаў — феадаламі. (**Феод** — *зямельнае ўладанне, якое давалася за службу і перадавалася ў спадчыну*. **Феадалізм** — *гэта адносіны пазямельнай і асабістай залежнасці паміж людзьмі, заснаваныя на ўласнасці на зямлю*.) У выніку ў пачатку Высокага сярэдневякоўя вялікія дзяржавы Заходняй Еўропы фактычна распаліся на шэраг

Народная асвета
Правообладатель Народная асвета

сярэдніх і дробных уладанняў феадалаў. Пачаўся перыяд ***феадальнай раздробленасці***. Яе галоўнымі прычынамі былі: пераход ад бенефіцыя да феода, гаспадарчая адасобленасць феодаў.

**3. Палітычная раздробленасць.** Кароль не меў усёй улады над насельніцтвам краіны. Ён не з'яўляўся вярхоўным уласнікам усёй зямлі ў дзяржаве. Кароль распараджаўся толькі ўласнымі землямі. Астатняя зямля знаходзілася ва ўласнасці феадалаў. Феадалам падпарадкоўвалася насельніцтва іх зямель. Дзяржаўных чыноўнікаў было мала. Феадалы самі кіравалі залежным ад іх насельніцтвам. У караля не было рэгулярнай арміі. Армія складалася з апалчэнняў феадалаў. Усё гэта прывяло да палітычнай раздробленасці дзяржавы. Улада караля была абмежавана ўсеўладдзем феадалаў на сваіх землях. Яны маглі весці войны паміж сабой, нападаць на суседнія краіны. Згоды караля яны не пыталіся. Паміж феадаламі часта ўзнікалі спрэчкі за тэрыторыі, правы, тытулы. Гэта прыводзіла да кровапралітных войнаў паміж імі. Такія войны называюць ***міжусобнымі***. Сапраўдныя іх мэты былі грабежніцкія.

**4. Мангольскае нашэсце.** У XIII ст. нашэсце качэўнікаў-*манголаў* адбілася на жыцці многіх цывілізацый. У пачатку XIII ст. манголы захапілі Кітай і Сярэднюю Азію. Былі спустошаны краіны Закаўказзя, Іран, Русь. А ў 1241 г. 150-тысячнае мангольскае войска ўварвалася ў Польшчу, Венгрыю, Чэхію, Харватыю, але пакарыць іх не змагло. У выніку войнаў, голаду і хвароб насельніцтва спустошаных манголамі краін скарацілася ў два разы. Гэта была страшэнная катастрофа, якую можна параўнаць толькі з катастрофай часоў Вялікага перасялення народаў. У выніку заваёўніцкіх паходаў была створана велізарная ***Мангольская дзяржава***. Аднак яна праіснавала нядоўга. Нездаволенасць пакоранага насельніцтва прыгнётам заваёўнікаў, пастаянныя сваркі

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

сярод мангольскай знаці прывялі да таго, што ў канцы XIII ст. Мангольская дзяржава распалася.

**1.** Якія новыя дзяржавы з'явіліся ў Заходняй Еўропе ў Высокім сярэдневякоўі? **2.** Чаму новая імперыя, створаная германскім каралём Атонам I, атрымала назву «Рымская імперыя»? **3.** Чым феод адрозніваўся ад бенефіцыя? **4.** Назавіце прычыны феадальнай раздробленасці ў Заходняй Еўропе. **5.** З-за чаго ўзнікалі міжусобныя войны? **6.** Раскажыце аб мангольскім нашэсці на краіны Азіі і Еўропы. **7.** Растлумачце сэнс паняццяў: саслоўе, феод, феадалы, феадалізм, міжусобныя войны, Свяшчэнная Рымская імперыя.

### *Гістарычная даведка*

Мангольскае войска складалася з конных воінаў, падзеленых на дзесяткі, сотні і тысячы. Самым буйным падраздзяленнем быў тумен, у якім было 10 тысяч воінаў. Кожны воін павінен быў мець двух коней мангольскай пароды — нізкарослых, але вельмі вынослівых. Мяняючы коней у паходзе або ў бітве, мангольскія воіны маглі без адпачынку пераадольваць вялікія адлегласці і адразу ўступаць у бой. Манголы пераправляліся нават цераз самыя буйныя рэкі, надзімаючы скураны мех і прывязваючы яго да сядла свайго каня. У войску манголаў была жорсткая дысцыпліна. Калі адзін воін праяўляў баязлівасць і ўцякаў з поля бітвы, каралі смерцю ўвесь яго дзесятак. Калі ўцякаў дзесятак — каралі сотню і г. д.



Бітва рыцараў з манголамі. *Малюнак сучаснага мастака*

Правообладатель Народная асвета

## § 8. Феадальны лад у Заходняй Еўропе (X—XIII стст.)

**Успомніце:** **1.** Як свабодныя сяляне станавіліся залежнымі? **2.** Назавіце і растлумачце формы залежнасці сялян. **3.** Растлумачце значэнне паняццяў: іерархія, бенефіцый, феод.

**1. Феадалы: сеньёры і васалы.** У X ст. у Заходняй Еўропе пачалася феадальная раздробленасць. Часта ўспыхвалі міжусобныя войны. Часам феадалы ваявалі нават з самім каралём. Такая смеласць тлумачылася тым, што феадал быў гаспадаром на сваіх землях. Феадал збіраў з жыхароў сваіх уладанняў падаткі, судзіў іх, набіраў войска. Каралеўская ўлада была слабай. Кароль быў адным з феадалаў, ад буйных феадалаў яго адрозніваў толькі тытул. Часта ўладанні караля былі меншымі за ўладанні многіх буйных феадалаў. Таму буйныя феадалы называлі караля «першым сярод роўных». *(Як вы лічыце, чаму каралі не маглі спыніць міжусобныя войны?)*

У Высокім Сярэдневякоўі склалася іерархія феадалаў. Як гэта адбылося? Для таго каб сфарміраваць сваё войска, буйны феадал перадаваў частку сваіх зямельных уладанняў сярэднім феадалам у якасці феода. Тыя ў сваю чаргу маглі перадаць частку атрыманай зямлі дробным феадалам. Феадал, які даваў феод, лічыўся ***сеньёрам***, а той, хто атрымліваў яго, — ***васалам***. Гэта азначала пазямельную залежнасць васала ад сеньёра.



Феадальная лесвіца

Феадал мог быць адначасова і сеньёрам, і васалам. Усе феадалы ўтваралі іерархію фе-

Правообладатель Народная асвета

адалаў — ***феадальную лесвіцу*** (гл. с. 39). Падпарадкоўваўся васал толькі свайму сеньёру, што замацоўвалася клятвай. Кожны васал знаходзіўся не толькі ў пазямельнай, але і ў асабістай залежнасці ад свайго сеньёра. Але ён мог не падпарадкоўвацца сеньёру свайго сеньёра. Гэта правіла было замацавана словамі: «Васал майго васала — не мой васал». (**Феадальная лесвіца** — *паслядоўнае падпарадкаванне феадалаў, заснаванае на перадачы зямлі за службу*.) *(Разгледзьце схему і вызначце, чыімі васаламі былі герцагі і графы, бароны, рыцары. Хто з іх з'яўляўся сеньёрам?)*

**Гістарычная даведка**

Клятва васала сеньёру праходзіла ўрачыста і пры сведках. Васал станавіўся на калені і ўкладваў свае рукі ў рукі сеньёра. Затым ён гаварыў словы клятвы: «Клянуся на гэтым святым Евангеллі, што ад гэтага часу і надалей я і мае нашчадкі будуць табе вернымі слугамі, як павінны быць верныя васалы свайму сеньёру!» *(Растлумачце сэнс урачыстасці клятвы васала сеньёру.)*

Галоўным абавязкам васала з'яўлялася ваенная служба сеньёру. Па першым жа загадзе свайго сеньёра ён павінен быў з'явіцца ў поўным узбраенні. Воінаў-феадалаў называлі рыцарамі. (**Рыцар** — *феадал, цяжкаўзброены конны воін*.) *(Каго цяпер называюць рыцарам?)*

**2. Феадалы і сяляне.** К X ст. феадалы захапілі ўсю прыдатную для апрацоўкі зямлю. Яны далучалі да сваіх уладанняў сялянскія палі, лясы, лугі, рэкі. Так узнікла прымаўка: «Няма зямлі без пана». Землі ў адной мясцовасці, якія належалі феадалу, складалі яго ***феадальны маёнтак***. Зямля ў маёнтку феадала дзялілася на дзве няроўныя часткі. Большая частка — гэта *панскія палі*, ураджай з якіх ішоў непасрэдна ў свірны феадала. Меншая частка — *сялянскія надзелы*, ураджай з якіх атрымлівалі сяляне. За карыстанне надзеламі сяляне выконвалі для феадалаў розныя работы. Гэтыя прымусо-

Правообладатель Народная асвета

вые абавязкі называліся ***павіннасцямі***.

Феадал меў шырокія правы над сялянамі. Ён збіраў з сялян аброк прадуктамі і вырабамі рамяства. Прымушаў апрацоўваць свае палеткі — гэта называлася *паншчынай*. Феадал мог увесці і дадатковыя работы і паборы.



Здача аброку феадалу.
*Малюнак сучаснага мастака*

**Гістарычная даведка**

Сяляне апрацоўвалі зямлю феадала, вырошчвалі і збіралі ўраджай з панскіх палёў, даглядалі свойскіх жывёл свайго пана. Акрамя таго, яны будавалі і рамантавалі замкі, масты, дарогі, чысцілі сажалкі і каналы, лавілі рыбу і збіралі ў лесе грыбы і ягады. Сяляне былі абавязаны аддаваць феадалу частку прадуктаў, якія яны выраблялі на сваіх надзелах і дома. Гэта былі збожжа, алей, мёд, пража, палатно, адзенне, абутак, вырабы са скуры, прылады працы. *(Вызначце, што з гэтага пераліку адносілася да паншчыны, што — да аброку.)*

Феадал мог караць, судзіць і накладаць штрафы на сялян. Залежнасць сялян ад феадалаў, як пазямельная, так і асабістая, называецца ***феадальнай залежнасцю***.

**3. Натуральная гаспадарка.** У пачатку Высокага сярэднявякоўя гандаль быў развіты слаба. Усё неабходнае для жыцця выраблялася ў кожнай вёсцы. Сяляне забяспечвалі прадуктамі сельскай гаспадаркі і вырабамі рамяства сябе і свайго пана. А каму гэта прадаць, калі ў суседніх вёсках і маёнтках выробляюць тое самае? Таму сфарміравалася такая гаспадарка, у якой прадукты працы выраблялiся для задавальнення ўласных патрэб, а не для продажу. Яна атрымала назву — ***натуральная гаспадарка***.

Правообладатель Народная асвета

Натуральная гаспадарка панавала ў Еўропе на працягу ўсяго Высокага сярэдневякоўя. Але людзі былі вымушаны купляць або абменьваць некаторыя тавары. Напрыклад, соль і жалеза патрэбныя ўсім, а здабываліся далёка не ўсюды. Феадалы хацелі купляць каштоўныя ўпрыгажэнні, шаўковыя тканіны, дарагую зброю і пародзістых коней. Грошы на куплю яны атрымлівалі, прадаючы частку прадуктаў, выраблених у маёнтку, на невялікіх рынках і праезджым купцам. Але гэта былі рэдкія і не асабліва важныя для гаспадаркі выпадкі куплі-продажу.

**4. Жыццё сялян.** Залежныя сяляне складалі большую частку насельніцтва Заходняй Еўропы. Жылі яны ў вёсках. Умовы іх жыцця былі вельмі цяжкімі. Сялянская сям'я тулілася ў маленькай хаціне, дзе частымі «гасцямі» былі голад і хваробы. Усё жыццё селяніна праходзіла ў пастаяннай працы і беспрасветнай галечы. У яго было нямнога сродкаў на існаванне: кавалак зямлі, сад, агарод. Тут селянін мог працаваць толькі тады, калі выканае паншчыну. За невыкананне павіннасцей феадалы каралі залежных ад іх сялян.

**5. Жыццё феадалаў.** Феадалы жылі ў замках. Яны лічылі ганьбай для сябе апрацоўваць зямлю або займацца рамяством. Сваім прызваннем яны лічылі вайну. Феадалы з юнацкіх гадоў рыхтаваліся да ваеннай службы: вучыліся ездзіць вярхом і валодаць зброяй, у асноўным мячом і кап'ём. Сыны феадалаў павінны былі расці фізічна моцнымі. Інакш проста нельга было стаць добрым воінам-рыцарам — даспехі і зброя рыцара важылі не менш за 50 кілаграмаў! А вось уменне чытаць і пісаць для маладога феадала не лічылася абавязковым. Навошта гэта ў баі? Забавамі феадалаў былі паляванне і



Замак феадала. *Рэканструкцыя*

Правообладатель Народная асвета

балі. Паляванне на дзікіх звяроў развівала сілу, спрытнасць і храбрасць. Паляванне часта заканчвалася балямі. На іх вельмі многа елі і пілі. У час баляў феадалаў і іх гасцей забаўлялі спевакі і музыкі.

Значнае месца ў жыцці феадалаў займалі спаборніцтвы ў ваенным майстэрстве, спрытнасці і храбрасці — ***рыцарскія турніры***. Праводзілі іх як каралі, так і буйныя феадалы з рознай нагоды: вяселле дачкі, пасвячэнне сына ў рыцары, заканчэнне вайны і г. д.

***Гістарычная даведка***

У дзень турніра вакол замка размяшчаўся лагер з палатак, побач з якімі стаялі сцягі і былі прымацаваны шчыты ўдзельнікаў-рыцараў. Гледачы знаходзіліся за агароджай, у якой было двое варот. На спецыяльным памосце рассаджваліся герцагі, графы, бароны. Пад гукі труб пачынаўся турнір. І вось ужо два конныя рыцары з коп'ямі наперавес стрымглаў памчаліся з супрацьлеглых варот насустрач адзін аднаму. Сутыкненне, удар, трэск коп'яў. Адзін з рыцараў не ўтрымаўся ў сядле. Гэта — паражэнне. Па правілах турніра пераможца забярэ яго каня і зброю. Адна пара рыцараў змяняе другую. Заканчваліся паядынкі, калі заставаўся адзіны пераможца, які ўзяў верх над усімі.

**1.** Чаму сеньёр перадаваў частку сваіх зямель васалам? **2.** Якія абавязкі былі ў васала ў адносінах да свайго сеньёра? **3.** Чаму ў Высокім сярэдневякоўі панавала натуральная гаспадарка? **4.** Якая сувязь паміж панаваннем натуральнай гаспадаркі і феадальнай раздробленасцю? **5.** Якія былі асноўныя заняткі сялян, феадалаў у сярэднія вякі? **6.** Дайце азначэнні паняццяў: паншчына, аброк, павіннасць, натуральная гаспадарка, феадальная залежнасць, феадальная лесвіца.

Правообладатель Народная асвета

## § 9. Сярэдневяковы горад

**Успомніце:** **1.** Якія гарады старажытнасці вы ведаеце? **2.** Як заваяванне варварамі Заходняй Рымскай імперыі паўплывала на развіццё гарадоў? **3.** Чаму гарады Візантыі ў гэты перыяд квітнелі? **4.** Дайце азначэнне паняццям: рамяство, натуральная гаспадарка.

**1. Прычыны ўзнікнення гарадоў.** Да пачатку Высокага сярэдневякоўя ў Заходняй Еўропе было мала гарадоў. У X—XI стст. тут пачалі расці ранейшыя гарады і з'яўляцца новыя. Што зрабіла гэта магчымым? Па-першае, пачаўся ўздым сельскай гаспадаркі. Былі ўзараны новыя землі. Палепшыліся прылады працы. З'явіўся плуг складанай канструкцыі. Узрасла ўраджайнасць. Цяпер сяляне маглі пракарміць не толькі сябе і сваіх феадалаў. У іх заставаліся лішкі прадуктаў. Па-другое, хутка развіваўся попыт на вырабы рамяства. Сяляне і феадалы жадалі набываць прылады працы і прадметы побыту, што мелі добрую якасць. Але ў каго? Узнікла патрэбнасць у рамесніках, якія прафесійна займаліся толькі сваёй работай. Так у грамадстве з'явіўся слой рамеснікаў-прафесіяналаў, а затым і новыя гарады.

**2. Як узнікалі гарады.** Рамеснікі імкнуліся сяліцца ў абароненым і людным месцы. Тут яны маглі схавацца ад грабежніцкіх нападаў і прадаваць свае вырабы пакупнікам. Такімі месцамі, напрыклад, былі скрыжаванні дарог, наваколлі замкаў, манастыроў, масты цераз рэкі, зручныя месцы на берагах мораў або рэк, куды маглі прычаліць караблі. У хуткім часе жыхары сталі ўмацоўваць свае паселішчы: абгароджвалі іх ровам і валам, будавалі частакол, а пазней — мураваныя сцены. Так, у Заходняй Еўропе ўзнікалі ўмацаваныя паселішчы з гандлёва-рамесным насельніцтвам — гарады. У пачатку Высокага сярэдневякоўя ў Заходняй Еўропе адбываўся бурны рост гарадоў.

Правообладатель Народная асвета

***Гістарычная даведка***

Сцены не давалі гораду расці ўшырыню. Таму дамы будавалі ў два ці тры паверхі. На першым паверсе звычайна знаходзілася крама, майстэрня або склад, на другім і трэцім — жылыя пакоі. Але сонца ў іх было вельмі мала, паколькі вуліцы былі надта вузкімі. Вуліцы гарадоў былі звычайна небрукаваныя. Непасрэдна на вуліцах песціліся ў лужах парасяты, а побач важна прагульваліся гусі і корпаліся куры. Гараджане не саромеліся выліваць памыі на вуліцу — гарадской каналізацыі не было.

**3. Гарады — цэнтры рамяства і гандлю.** Далейшае развіццё гарадоў і гандлю разбурала натуральную гаспадарку. У Высокім сярэдневякоўі гандлем пачалі займацца ўсе слаі грамадства: рамеснікі, феадалы і сяляне. Паміж імі ўсталяваліся адносіны куплі-продажу. Рамеснікі жадалі хутчэй купіць прадукты харчавання ў сялян і прадаць свае вырабы. Узнікла патрэбнасць у ***купцах***, якія прафесійна займаліся б толькі гандлем.

Звычайны гандаль вёўся на штотыднёвых рынках. Найбольш ажыўлена гандлявалі на штогадовых рынках — ***кірмашах***. У XIII ст. асабліва славіліся кірмашы ў Шампані ў Францыі. На іх збіраліся купцы з розных краін і заключаліся здзелкі на велізарныя сумы. Гандаль ішоў па чарзе ў чатырох гарадах, не перапыняючыся не на месяц. Важнейшыя гандлёвыя шляхі праходзілі ў Міжземным і Балтыйскім морах. Гандаль у Міжземным моры знаходзіўся ў руках двух гарадоў — ***Венецыі*** і ***Генуі***. На Балтыйскім моры вядучая роля



Сярэдневяковы кірмаш.
*Малюнак сучаснага мастака*

Правообладатель Народная асвета

належала гораду ***Любеку***. Ён узначальваў магутны гандлёвы саюз — ***Ганзу***.

Выраб, які зроблены не для сябе, а для продажу, называецца ***таварам***. Тавар прадаецца і купляецца за грошы. Гаспадарка, у якой тавары вырабляюцца, а потым прадаюцца за грошы, называецца ***таварна-грашовай гаспадаркай***. У Заходняй Еўропе таварна-грашовая гаспадарка пачала развівацца разам з гарадамі. У Высокім сярэдневякоўі натуральная гаспадарка паступова пачала змяняцца таварна-грашовай гаспадаркай. Гарады з'яўляліся цэнтрамі рамяства і гандлю, асноўным насельніцтвам гарадоў былі рамеснікі і купцы.

**4. Гарадское рамяство.** Праца рамесніка была асновай гаспадаркі сярэдневяковага горада. Рамеснік працаваў ва ўласнай ***майстэрні***. Ён сам купляў сабе неабходную сыравіну, браў заказы. Затым ён выконваў усю работу па вытворчасці вырабаў і прадаваў іх. Яму дапамагалі *вучні* і *падмайстры*. (**Сыравіна** — *матэрыял, з якога рамеснікі выраблялі сваю прадукцыю: шэрсць, скуры, футра, дрэва і г. д.*) Рамеснікі аднолькавай спецыяльнасці аб'ядноўваліся ў саюзы, якія называліся ***цэхамі***. У купцоў, урачоў, юрыстаў былі свае аб'яднанні — ***гільдыі***. Галоўная задача цэха была ў тым, каб абараніць сваіх рамеснікаў. У гарадах забаранялася займацца рамяством не членам цэхаў. Паўнапраўнымі членамі цэхаў лічыліся толькі ўладальнікі майстэрняў — ***майстры***. На сходзе майстроў цэха прымалі ***статут***. У ім вызначаліся ўсе бакі жыцця рамеснікаў цэха.



У майстэрні збройніка.
*Малюнак сучаснага мастака*

Правообладатель Народная асвета

Напрыклад, колькі можна выпускаць вырабаў, з якіх матэрыялаў, якіх памераў, якой якасці і многае іншае. Пры пагрозе нападу на горад усе члены цэха складалі атрад апалчэння. Пад цэхавым сцягам яны выступалі на абарону горада.

Як правіла, члены цэха сяліліся на адной вуліцы, якую так і называлі: вуліца Ганчароў, Ткачоў, Краўцоў, Кавалёў, Збройнікаў.

**5. Барацьба гараджан за самакіраванне.** Гарады ўзнікалі на землях феадалаў. Яны адносіліся да гараджан, як да сялян: судзілі іх, накладалі штрафы, збіралі аброк вырабамі рамяства, рабілі іншыя паборы. Але паступова гарады мацнелі і багацелі. Гараджане пачалі адчуваць цяжар з-за таго, што залежалі ад феадалаў. Пачалася барацьба. Спачатку гараджане імкнуліся абмежаваць паборы феадалаў. Але з цягам часу яны сталі патрабаваць ад феадалаў поўнай свабоды.

У XII—XIII стст. барацьба паміж гараджанамі і феадаламі разгарнулася па ўсёй Заходняй Еўропе. Адны гарады дабіліся незалежнасці. Яны далі феадалам выкуп грашыма або атрымалі свабоду ў выніку паўстанняў і войнаў супраць сваіх гаспадароў. Іншыя гарады так і не змаглі вызваліцца. Пазбавіўшыся ўлады феадалаў, жыхары гарадоў станавіліся свабоднымі.

***Гістарычная даведка***

Існавала правіла: калі селянін уцячэ ў горад і пражыве там адзін год і адзін дзень, ён становіцца свабодным і выходзіць з-пад улады феадала. Таму і казалі: «Гарадское паветра робіць чалавека свабодным».

Гараджане атрымалі права самім кіраваць горадам — ***самакіраванне***. Цяпер рашэнні па ўсіх сваіх справах гараджане прымалі самастойна, праз свае органы ўлады. Гараджане выбіралі *гарадскі савет* і яго кіраўніка — *мэра*. Гарадскі савет меў шырокія правы. Ён чаканіў манету, набіраў ахову і войска. Засядаў савет у спецыяльным будынку — *ратушы*.

Правообладатель Народная асвета

У горадзе быў свой суд, дзе засядалі выбраныя гараджанамі суддзі. *(Намалюйце схему: «Гарадское самакіраванне».)*

**1.** Якія прычыны прывялі да росту гарадоў у Заходняй Еўропе ў Высокім сярэдневякоўі? **2.** Як узнікалі сярэдневяковыя гарады? **3.** Якія асноўныя патрабаванні цэхавых статутаў? **4.** Якія галоўныя вынікі барацьбы гараджан з феодаламі? **5.** Параўнайце знешні выгляд сярэдневяковага і сучаснага гарадоў. **6.** Дайце азначэнне паняццяў: горад, тавар, таварна-грашовая гаспадарка, цэх, самакіраванне.

***Гістарычная даведка***

Стаць майстрам было нялёгка. Спачатку трэба было некалькі гадоў працаваць ***вучнем***. Яму не плацілі за працу. Дастатковай узнагародай лічылася тое, што яго кармілі і давалі магчымасць вучыцца. З цягам часу вучань мог стаць памочнікам майстра — ***падмайстрам***. У гэтым званні ён ужо атрымліваў за працу невялікія грошы. Кожны падмайстар марыў здаць экзамен і стаць майстрам. Для гэтага патрабавалася зрабіць узорны выраб — ***шэдэўр***. Затым яго трэба было паказаць для адабрэння ў савеце майстроў. Толькі тады падмайстар станавіўся паўнапраўным майстрам і мог адкрыць уласную майстэрню.

## § 10. Каталіцкая царква

**Успомніце: 1.** Якія ніжэйшыя і вышэйшыя чыны духавенства вы ўжо ведаеце? **2.** Чаму ў Раннім сярэдневякоўі склаўся цесны саюз царквы і Франкскай дзяржавы? **3.** Што было галоўнай прычынай супярэчнасцей паміж цэрквамі Заходняй Еўропы і Візантыі ў Раннім сярэдневякоўі? **4.** Растлумачце значэнне паняццяў: дзесяціна, іерархія духавенства, Папа Рымскі, патрыярх, манахі.

**1.** Да сярэдзіны XI ст. хрысціянская царква лічылася адзінай, хаця з яе даўно вылучыліся заходняя і ўсходняя цэрквы.

Яшчэ ў Раннім сярэдневякоўі паміж кіраўнікамі заходняй і ўсходняй цэркваў узніклі супярэчнасці. Папы рымскія імкнуліся ўзначаліць усіх хрысціян. Канстанцінопальскія патрыярхі не жадалі прызнаваць вяршэнства рымскіх пап. Да гэтага дабавілася спрэчка, каму будуць падпарадкоўвацца

Правообладатель Народная асвета

нядаўна прыняўшыя хрысціянства славяне Усходняй Еўропы. Усё гэта прывяло да царкоўнага расколу. У **1054** г. Папа і патрыярх праклялі адзін аднаго — абвясцілі анафему. (**Анафема** — *царкоўны праклён, адлучэнне ад царквы.*) За заходняй царквой замацавалася назва ***каталіцкая*** (г. зн., «сусветная»), а за ўсходняй — ***праваслаўная*** (г. зн. «правільнай веры»). Так хрысціянскі свет раскалоўся на каталіцкі і праваслаўны. Католікамі сталі жыхары Заходняй Еўропы. Праваслаўнымі — народы Візантыі і продкі балгар, сербаў, беларусаў, рускіх, украінцаў.

**2. Рымскія папы — уладыкі Заходняй Еўропы.** У Высокім сярэдневякоўі каталіцкая царква пачала хутка багацець і ўмацоўвацца. Усе веруючыя выплачвалі дзесяціну, плацілі за абрады. Каралі і феадалы дарылі царкве землі разам з сялянамі.

Царква стала буйным землеўладальнікам, а вышэйшае духавенства — буйнымі феадаламі. Улада каралёў у Высокім сярэдневякоўі аслабла. Васалы падпарадкоўваліся сваім сеньёрам і маглі не выконваць распараджэнні караля. А ва ўмовах міжусобных войнаў, што разгарэліся, аўтарытэт царквы вырас. Таму што ўсе хрысціяне Заходняй Еўропы належалі адной царкве і абавязаны былі выконваць запаведзі Хрыста. А Папа Рымскі лічыўся пераемнікам апостала Пятра — галоўнага з вучняў Ісуса Хрыста. Не падпарадкавацца Папе і іншым свяшчэннаслужыцелям было для любога веруючага страшэнным грахом. Ніякія апраўданні неабходнасцю выконваць распараджэнні сеньёра, свайго феадала не дапамагалі. Царква пазбаўляла неслуха ўсялякай надзеі на рай пасля смерці. Усё гэта дазволіла папам рымскім умешвацца ў каралеўскія справы ў краінах Заходняй Еўропы.

А каралі па-ранейшаму імкнуліся прызначаць епіскапаў. І патрабавалі ад іх, каб яны пастаўлялі рыцараў-васалаў у каралеўскае войска. Але да канца XI ст. становішча змянілася.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

Цяпер папы рымскія сталі дыктаваць сваю волю правіцелям дзяржаў. Калі хто-небудзь адважваўся не паслухацца, яму абвяшчалі анафему. У дзяржаве таго караля, што быў пракляты, закрываліся храмы, забаранялася праўляць абрады. Для веруючых гэта было страшэннае пакаранне.

### Гістарычная даведка

У канцы XI ст. Папа Рымскі Грыгорый VII запатрабаваў у германскага караля Генрыха IV адмовіцца ад прызначэння епіскапаў. Кароль не згадзіўся на гэта. Тады Грыгорый VII пры вялікай колькасці народа абвясціў: «Генрыха-караля, які паўстаў у нечуванай гордасці супраць царквы, пазбаўляю праўлення ўсім каралеўствам германскім і абвяшчаю анафему!» Усе веруючыя былі ўзрушаны. Германскія феадалы запатрабавалі ў Генрыха IV, каб ён скарыўся. У замку Каноса Генрых тры дні прасіў літасці ў Папы. Толькі цаной нечуваных уніжэнняў Генрых вярнуў уладу. *(За што Генрых IV быў аддадзены анафеме? Што азначае выраз «прыйсці ў Каносу»?)*



Папа Рымскі.
*Мініяцюра XIII ст.*

XIII ст. стала вяршыняй магутнасці папства. Папа ***Інакенцій III*** (1198—1216) здолеў падпарадкаваць сабе манархаў многіх краін Заходняй Еўропы. Васаламі Папы прызналі сябе імператар Свяшчэннай Рымскай імперыі, каралі Англіі, Даніі, Польшчы, Венгрыі, хрысціянскіх дзяржаў Пірэнейскага паўвострава. Ніхто не асмельваўся не паслухацца Папы. Інакенцій III мог забараніць весці вайну або заклікаць ісці ваяваць супраць непакорлівых каралей ці людзей іншай веры. Ва ўмовах феадальнай раздробленасці папы рымскія сталі ўладыкамі Заходняй Еўропы.

Правообладатель Народная асвета

**3. Каталіцкая царква і ерэтыкі.** Каталіцкая царква лічыла, што ўсе людзі павінны верыць у Бога. Духавенства праследавала ўсіх тых, хто верыў у Бога не так, як вучыла царква, або асуджаў дзеянні царквы. Такіх людзей называлі адступнікамі ад веры — ***ерэтыкамі***, а іх вучэнні — ***ерасямі***. Кляймо ерэтыка было раўназначна выключэнню чалавека з грамадства. Царква аб'яўляла ерасямі розныя вучэнні. Ерэтыкамі называлі тых, хто не прымаў каталіцкага палажэння аб Тройцы, хто сцвярджаў, што Папа Рымскі — не намеснік Бога, хто не прымаў царкоўныя абрады, патрабаваў адмовы ад дзесяціны. Многія ерасі карысталіся падтрымкай беднякоў — сялян і гараджан. Яны бачылі, што багацце царквы і раскоша духавенства супярэчыць таму, як жылі Ісус Хрыстос і апосталы. Часта ерасі шырока распаўсюджваліся і захаплівалі думкі дзесяткаў тысяч людзей. Яны ператвараліся ў магутныя народныя рухі.

***Гістарычная даведка***

У канцы XII ст. адна з ерасяў распаўсюдзілася на поўдні Францыі. Ерэтыкі сцвярджалі, што каталіцкая царква загразла ў багацці і яна створана не Хрыстом, а злымі сіламі. Сябе яны называлі *катарамі* («чыстымі») і стварылі сваю царкву. Папа Інакенцій III заклікаў феадалаў абараніць веру. Французскія рыцары напалі на ерэтыкоў. Былі забіты многія тысячы людзей — старых і малых. Квітнеючы край быў спустошаны.

Спачатку духавенства варожа ставілася да пропаведзі беднасці манахамі-прапаведнікамі. Але затым, каб не дапусціць новых ерасей, вырашыла прыцягнуць некаторых з такіх прапаведнікаў на свой бок.

***Гістарычная даведка***

Манах **Францыск Асізскі** (1181—1226) гаварыў аб любові людзей адно да аднаго і аб прыродзе як тварэнні Бога. Ён прапанаваў сваім слухачам адмовіцца ад уласнасці, жыць у беднасці і пакаяцца. Гэтыя наіўныя пропаведзі ўспрымаліся багасловамі з усмешкай. Але шчырасць Францыска падкупляла людзей. Яго вучні і паслядоўнікі з'явіліся амаль ва ўсіх еўрапейскіх краінах.

Правообладатель Народная асвета



Дамініканцы і францысканцы.
*Мініяцюры XIII ст.*

У пачатку XIII ст. Папа Рымскі заснаваў манаскае аб'яднанне — *ордэн францысканцаў* і зацвердзіў яго *статут*. (**Ордэн манаскі** — *аб'яднанне манахаў*. **Статут** — *правілы жыцця манахаў ордэна*.) Згодна са сваім статутам францысканцы жылі міласцінай, вандравалі па ўсёй Еўропе з пропаведдзю Евангелля. Шмат каго з іх пропаведзь утрымлівала ад далучэння да ерэтыкоў. Ордэн францысканцаў стаў буйнейшым з манаскіх ордэнаў.

**4. Інквізіцыя.** У пачатку XIII ст. для барацьбы з ерэтыкамі папы рымскія стварылі спецыяльны суд — ***інквізіцыю***. Ажыццяўленне гэтага суда было даручана *ордэну дамініканцаў*.

*Гістарычная даведка*

Заснавальнікам ордэна быў манах **Дамінік дэ Гусман**. Ён доўга прапаведаваў у Паўднёвай Францыі супраць ерэтыкоў і вырашыў стварыць ордэн спецыяльна для барацьбы з ерасямі. У 1216 г. Папа Рымскі заснаваў ордэн і зацвердзіў яго статут.

Дамініканцы старанна займаліся навукамі, каб абараняць царкву ад ілжывых вучэнняў і весці багаслоўскія спрэчкі з ерэтыкамі. Яны таксама вялі следства і судзілі за парушэнне веры. Расследаванне часта вялося пад катаваннямі. Так здабываліся доказы віны падсуднага. Калі віна ў ерасі была даказана, дамініканцы патрабавалі раскаяння. Таму, хто згаджаўся, маглі дараваць. Тых, хто не раскаяўся, інквізіцыя асуджала як ерэтыкоў і адлучала ад царквы. Затым інквізіцыя перадавала ерэтыкоў свецкім уладам для пакарання смерцю. Жыццё ерэтыка канчалася спальваннем на кастры.

Правообладатель Народная асвета

**1.** Прыдумайце загаловак да першага пункта параграфа. **2.** Назавіце прычыны расколу хрысціянскай царквы ў XI ст. **3.** Назавіце крыніцы абагачэння каталіцкай царквы ў XI—XII стст. **4.** У чым праявілася магутнасць пап і каталіцкай царквы ў XIII ст.? **5.** Сфармулюйце асноўныя патрабаванні сярэдневяковых ерасей. Якую небяспеку ўяўлялі яны для каталіцкай царквы? **6.** Якую ролю ў барацьбе з ерасямі адыгрывалі ордэны францысканцаў і дамініканцаў? **7.** Якія народы Еўропы ў XI ст. сталі праваслаўнымі хрысціянамі, а якія — католікамі?

***Гістарычная крыніца***

**«Дыктат Папы» Рымскага Папы Грыгорыя VII (1075 г.)** Папа можа звяргаць імператараў... Ніхто не адважваецца адмяніць яго рашэнні, а ён сам адмяняе чые захоча. Ніхто яму не суддзя... Рымская царква ніколі не памылялася і надалей не будзе памыляцца. Не лічыцца католікам той, хто не згодны з рымскай царквой. Падданых ён можа вызваляць ад прысягі няздатным уладыкам. *(Як вы думаеце, якія палажэнні дакумента Папа выкарыстаў у барацьбе са сваімі ворагамі?)*

## § 11. Крыжовыя паходы

**Успомніце:** **1.** Калі ўзнікла хрысціянства? **2.** Дзе жыў і прапаведаваў заснавальнік хрысціянства Ісус Хрыстос? **3.** Калі арабы захапілі Палесціну?

**1. Прычыны крыжовых паходаў.** У XI ст. Візантыя пацярпела страшэнныя паражэнні на ўсходзе. Амаль усе яе землі ў Азіі былі захоплены туркамі-сельджукамі. Заваёўнікі захапілі і Палесціну. А менавіта там, у Іерусаліме, знаходзілася галоўная хрысціянская святыня — труна Хрыстова. Менавіта з гэтым горадам былі звязаны важнейшыя падзеі з жыцця Ісуса Хрыста.

***Гістарычная даведка***

Цюркі — назва народаў, якія качавалі ў Цэнтральнай Азіі. У X ст. адзін з правіцеляў цюркаў Сельджук прыняў новую веру — іслам. Яго народ пачалі называць туркамі-сельджукамі. У XI ст. правіцель з дынастыі Сельджукідаў прыняў тытул султана.

Правообладатель Народная асвета


Рыцар-крыжа-носец

Візантыйскі імператар шукаў дапамогі ў барацьбе з «нявернымі», гэта значыць людзьмі іншай веры, або інаверцамі. У лістападзе 1095 г. Папа Урбан II выступіў з прамовай у французскім горадзе Клермоне. Ён заклікаў хрысціян узяцца за зброю і вызваліць ад няверных Святую зямлю, Іерусалім і труну Хрыстову. Так быў пакладзены пачатак паходам еўрапейцаў-хрысціян на ўсход. Удзельнікі гэтых паходаў насілі на вопратцы нашытыя крыжы, таму іх называлі ***крыжаносцамі***, а паходы — ***крыжовымі***. Арганізатарам крыжовых паходаў была каталіцкая царква. Усяго крыжовых паходаў было восем. Яны ахопліваюць час з канца XI да канца XIII ст.

Якія былі прычыны крыжовых паходаў? Чаму феадалы, сяляне і іншыя людзі добраахвотна адпраўляліся ваяваць у далёкія землі? Усе яны былі веруючымі, таму лічылі, што паход у імя веры дапаможа ім у выратаванні душы. Акрамя таго, сяляне спадзяваліся знайсці дастатак на «Святой зямлі». Купцы імкнуліся ўзяць у свае рукі гандаль з краінамі Усходу. Феадалы хацелі набыць новыя ўладанні. У перыяд феадальнай раздробленасці галоўнай сілай, якая аб’ядноўвала людзей у Заходняй Еўропе, была каталіцкая царква. Яна неаднаразова забараняла міжусобныя войны феадалаў. Але гэтыя забароны не дзейнічалі. І тады царква вырашыла накіраваць ваяўнічых феадалаў за межы Еўропы — на «няверных». Адначасова гэта прывяло б да распаўсюджання ўлады рымскіх пап на новыя краіны.

**2. Першы крыжовы паход.** Вясной **1096** г. першымі на Іерусалім рушылі дзесяткі тысяч бедных сялян, узброеных палкамі, сякерамі, косамі. Сяляне шлі неарганізаваным натоўпам. Убачыўшы які-небудзь горад, яны пыталіся: «Ці не Іерусалім гэта?» *(Як вы думаеце, чаму сяляне не ведалі правільнага напрамку?)* Калі яны дасягнулі Малой Азіі, то ў пер-

Правообладатель Народная асвета

шым жа баі былі перабіты добра ўзброенымі і вопытнымі ў бітвах туркамі-сельджукамі.

Летам 1096 г. выступілі ў паход і старанна падрыхтаваныя феадалы. Пасля цяжкіх баёў яны прарваліся да Іерусаліма. *(Вайну паміж прадстаўнікамі розных рэлігій называюць **рэлігійнай вайной**.)* Летам **1099** г. пасля асады крыжаносцы штурмам захапілі горад. У Іерусаліме яны ўчынілі страшэнную разню, забіваючы мужчын і жанчын, старых і дзяцей. У выніку першага крыжовага паходу ў Палесціне і Сірыі былі створаны дзяржавы крыжаносцаў. Галоўным з іх правіцеляў лічыўся кароль іерусалімскі. У гэтых дзяржавах феадалы-крыжаносцы ўстанавілі прывычныя для іх парадкі і звычаі.

**3. Духоўна-рыцарскія ордэны.** У XII ст. у Палесціне ўзніклі ***духоўна-рыцарскія ордэны***. Самымі вядомымі з іх сталі ордэны тампліераў, шпітальераў і тэўтонаў, якія мелі свае статуты. У ордэны ўступалі веруючыя, якія кляліся быць паслухмянымі, жыць у беднасці, не жаніцца і весці барацьбу з іншаверцамі. У рыцараў-манахаў была вельмі строгая іерархія. Ніжэйшае звяно складалі браты-збраяносцы. Вяршыню займалі браты-рыцары, усе яны паходзілі з феадалаў. На чале духоўна-рыцарскага ордэна стаяў ***вялікі магістр***. Ён падпарадкаваўся непасрэдна Папе Рымскаму. У ордэнах была ўстаноўлена жорсткая дысцыпліна. Загады вялікага магістра выконваліся безагаворачна. Войскі ордэнаў абаранялі дзяржавы крыжаносцаў.

**4. Чацвёрты крыжовы паход і Візантыя.** У 1187 г. Іерусалім быў захоплены султанам Егіпта. У пачатку XIII ст. Папа Інакенцій III аб'явіў аб чацвёртым крыжовым паходзе. Галоўны ўдар планавалася нанесці па Егіпце. Але крыжаносцы змянілі напрамак паходу і накіраваліся да Канстанцінопаля.

Правообладатель Народная асвета

*Гістарычная даведка*

Сын звергнутага візантыйскага імператара Ісака Ангела звярнуўся па дапамогу да крыжаносцаў. За вяртанне на прастол свайго бацькі ён абяцаў вялікія грошы. Летам 1203 г. крыжаносцы прыбылі ад берагоў Адрыятычнага мора да Канстанцінопаля. Ісак Ангел зноў стаў імператарам. Але ў казне не было грошай, каб разлічыцца з крыжаносцамі.

У красавіку **1204** г. крыжаносцы захапілі Канстанцінопаль. Горад быў разграблены, многія жыхары забіты. Крыжаносцы абрабавалі нават праваслаўныя храмы. На захопленых візантыйскіх землях крыжаносцы стварылі яшчэ адну дзяржаву — ***Лацінскую імперыю***. Такім быў вынік чацвёртага крыжовага паходу. Ён быў здзейснены не супраць іншаверцаў, а супраць хрысціян Візантыі. У **1261** г. візантыйцы адваявалі Канстанцінопаль у крыжаносцаў. Візантыйская імперыя была адноўлена. Але яна ўжо не была вялікай дзяржавай, як раней.



Штурм Канстанцінопаля крыжаносцамі.
*З малюнка XVI ст.*

**5. Вынікі крыжовых паходаў.** Да канца XIII ст. крыжаносцы былі выгнаны з Палесціны, а іх дзяржавы знішчаны. Труна Хрыстова зноў апынулася ў руках іншаверцаў. Варожасць паміж хрысціянамі і іншаверцамі ўзрасла. Узрасла варожасць і паміж праваслаўнымі і каталікамі. У выніку чацвёртага крыжовага паходу была канчаткова падарвана магутнасць Візантыі.

Правообладатель Народная асвета

Феадалы-крыжаносцы не змаглі ўтрымаць свае ўладанні на Усходзе. Сяляне вельмі хутка зразумелі, што ў далёкіх землях іх чакаюць не багацце і свабода, а смерць або няволя. Купцам стала яшчэ больш цяжка гандляваць з усходнімі краінамі. І толькі часовае адцягненне ўвагі феадалаў многіх краін на барацьбу з «няверным» аслабіла феадальныя міжусобіцы ў самой Заходняй Еўропе.

**1.** Назавіце прычыны крыжовых паходаў. **2.** Раскажыце аб першым крыжовым паходзе. **3.** У чым заключаецца галоўнае адрозненне духоўна-рыцарскіх ордэнаў ад ордэна францысканцаў? **4.** У чым заключалася адрозненне чацвёртага крыжовага паходу ад іншых? **5.** Якімі былі вынікі чацвёртага крыжовага паходу для Візантыі? **6.** Якімі былі вынікі крыжовых паходаў?

### *Гістарычная крыніца*

**З выступлення Папы Урбана II у Клермоне.** Папа сказаў: «Зямля гэта, якую вы насяляеце, сціснута вашай шматлікасцю і ледзь пракармлівае тых, хто яе апрацоўвае. Адсюль адбываецца тое, што вы адзін аднаго кусаеце, ваюеце і наносіце смяротныя раны. Няхай жа спыніцца паміж вамі нянавісць, няхай змоўкне варожасць, сціхнуць войны і заснуць усялякія сваркі і разлады. Станавіцеся на шлях Святой труны, вызваліце зямлю гэту ў грэшнага народа, пакарыце яе сабе. Зямля тая, як гаворыць Біблія, цячэ малаком і мёдам. Іерусалім — гэта пуп зямлі, гэта зямля больш урадлівая, чым усе іншыя, зямля гэта быццам другі рай...» Калі Папа ў сваёй адмысловай прамове сказаў гэта, усе, хто там быў, крычалі: «Так хоча Бог! Так хоча Бог!» Многія з іх тут жа пачалі нашываць сабе на вопратку крыжы з чырвонай тканіны ў знак сваёй рашучасці адваяваць хрысціянскую святыню. Усім, хто адважыўся ісці ў паход, Папа абяцаў дараванне ўсіх грахоў. *(Як вы думаеце, да каго, перш за ўсё, звяртаўся Урбан II? Якія доказы ён прыводзіць для абгрунтавання неабходнасці пачаць паход на Іерусалім?)*

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

## § 12. Англія і краіны Скандынавіі ў X—XIII стст.

**Успомніце:** **1.** Назавіце германскія плямёны, якія заснавалі дзяржаву Англію. **2.** Растлумачце правіла: «васал майго васала — не мой васал». **3.** Дайце азначэнне паняццяў: феадалізм, феадальная лесвіца.

**1. Паходы нарманаў.** У паўночнай частцы Еўропы жылі германскія плямёны — продкі цяперашніх нарвежцаў, шведаў і датчан. У Заходняй Еўропе іх называлі ***нарманамі*** — «паўночнымі людзмі». Яшчэ ў канцы VIII ст. нарманы сталі нападаць на прыбярэжныя раёны краін Еўропы. Іх напады заўсёды былі нечаканымі, яны наводзілі на мясцовых жыхароў страх і жудасць.

Правадыры і знатныя нарманы збіралі дружыны і адпраўляліся ў паходы. Іх устойлівыя з мелкай пасадкай караблі-дракары лёгка плылі як па моры, так і па рэках.

*Гістарычная даведка*

Удзельнікі паходаў называлі сябе **вікінгамі.** Пры спадарожным ветры караблі вікінгаў дасягалі берагоў Англіі, Францыі, Германіі, Польшчы і Русі ўсяго за тры-чатыры дні. Вікінгі дабіраліся нават да Іспаніі, Італіі, Візантыі, арабскіх дзяржаў.

Пасля паходу большасць нарманаў з багатай здабычай вярталіся дадому. Некаторыя з іх аблюбоўвалі ў Еўропе землі, падобныя да іх суровага і лясістага краю, і сяліліся там.

*Гістарычная даведка*

У пачатку X ст. нарманы пасяліліся на поўначы Францыі. Гэта вобласць атрымала назву Нармандыя. У хуткім часе нарманы прынялі хрысціянства, асвоілі французскую мову і мясцовы спосаб жыцця. Па ўзоры французаў яны стварылі цяжкую рыцарскую конніцу. *(Як вы лічаце, чаму нарманы ўспрынялі французскую мову, норавы і звычаі, а не французы — нарманскую мову, традыцыі і норавы?)*

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета



Карабль нарманаў — дракар.
*Малюнак сучаснага мастака*

**2. Дзяржавы Скандынавіі.** Паходы нарманаў абагацілі знаць, прывялі да ўзмацнення ўплыву правадыроў і дружыннікаў. З'явілася грамадская няроўнасць. У выніку ў IX—X стст. узніклі скандынаўскія каралеўствы — ***Нарвегія***, ***Данія*** і ***Швецыя***. Правадыры і знаць сталі феадаламі. Яны атрымлівалі даходы з залежных сялян і не жадалі рызыкаваць жыццём у доўгіх паходах. У скандынаўскіх дзяржавах было прынята хрысціянства. Эпоха нарманскіх паходаў скончылася.

У XI ст. Данія, Швецыя і Нарвегія пачалі паміж сабой барацьбу за першынство ў Паўночнай Еўропе. Перамаглі дацкія каралі. Данія дасягнула вяршыні магутнасці ў тым жа XI ст. пры каралю ***Кануце Вялікім***. Ён стаў каралём Нарвегіі, Швецыі і нават Англіі. Але пасля смерці Канута яго дзяржава распалася.

**3. Нармандскае заваяванне Англіі. Каралеўская ўлада.** За сваю гісторыю Брытанскія астравы падвяргаліся шматлікім нашэсцям. У **1066** г. на брытанскую зямлю прыйшлі новыя заваёўнікі — з Нармандыі. *(Растлумачце розніцу паміж нарманамі і нармандцамі.)* У бітве пры ***Гастынгсе*** іх цяжкая конніца знішчыла пяхоту англасаксаў. Англійскі кароль Гаральд загінуў у баі. Новым каралём Англіі стаў герцаг Нармандыі ***Вільгельм І Заваёўнік***. У XI ст. каралеўская ўлада ў Англіі была мацнейшая, чым у іншых краінах Еўропы. Каралю падпарадкоўваліся ўсе англійскія феадалы. Для караля не дзейнічала феадальнае правіла «васал майго васала — не мой васал». Аднак на астатніх феадалаў гэтае правіла распаўсюджвалася. *(Чым адрознівалася феадальная лесвіца ў Англіі ад адносін паміж феадаламі ў другіх еўрапейскіх краінах?)*

Правообладатель Народная асвета



Атака конніцы ў бітве пры Гастынгсе.
*Фрагмент дывана з горада Байе. XI ст.*

У Англіі хутка ўстанавіўся феадалізм. Быў праведзены перапіс насельніцтва. Пры гэтым многія свабодныя сяляне трапілі ў спісы залежных людзей. У хуткім часе і іншыя сяляне сталі залежнымі.

**4. Войны англійскіх каралёў.** У сярэдзіне XII ст. англійскія каралі мелі вялізныя ўладанні і ў Францыі. Яны хацелі далучыць астатнія французскія землі і стаць яшчэ і каралямі Францыі. Каралі Англіі імкнуліся пакарыць таксама суседнія краіны на Брытанскіх астравах: Уэльс, Шатландыю, Ірландыю. У выніку доўгіх войнаў Уэльс быў заваяваны. У Ірландыі англічанам удалося захапіць толькі ўсходнія землі. Смелыя і мужныя шатландцы адстаялі сваю свабоду.

**5. Узнікненне парламента.** Англійскія каралі вялі частыя войны. Гэта патрабавала вялікіх расходаў. Каралі павялічвалі падаткі і жорстка распраўляліся з незадаволенымі. Цярплівасць англічан скончылася. Супраць караля ***Іаана Беззямельнага*** паўсталі буйныя феадалы. Іх падтрымалі рыцары і гараджане. У **1215** г. паўстанцы перамаглі і прымусілі караля падпісаць дагавор — Вялікую хартыю вольнасцей. (**Хартыя** — *грамата, якая давала або пацвярджала тыя ці іншыя правы.*)

Правообладатель Народная асвета

У ёй кароль пацвердзіў прыняцце ўсіх патрабаванняў паўстанцаў. Але галоўнае, што з гэтага часу кароль не мог ўводзіць самавольна падаткі і пошліны. За выкананнем хартыі павінен быў сачыць савет з 25 буйных феадалаў. Аднак англійскія каралі не хацелі выконваць хартыю. Успыхнула новае паўстанне. Кароль зноў пацярпеў паражэнне. У **1265** г. пераможцамі быў скліканы сход, у які ўвайшлі прадстаўнікі ад буйных феадалаў, духавенства, рыцараў і гараджан. *(Як вы думаеце, з якой мэтай быў скліканы сход саслоўяў?)* Слова «гаварыць» на французскай мове гучыць як «парле». Паколькі на сходзе саслоўяў абмяркоўвалі розныя пытанні і спрачаліся, яго сталі называць ***парламентам.***

Хутка ўлада караля была адноўлена. Але з гэтага часу парламент стаў склікацца рэгулярна. Ён ператварыўся ў пастаянную дзяржаўную ўстанову. *(Як вы думаеце, чаму сяляне не былі прадстаўлены ў парламенце?)*

**1.** Падлічыце, колькі стагоддзяў працягваліся напады нарманаў на краіны Еўропы. **2.** Чаму спыніліся напады нарманаў? **3.** Як нармандскае заваяванне паўплывала на развіццё Англіі? **4.** Землі якіх краін аказаліся пад уладай англійскіх каралёў у XII ст.? **5.** Чаму англійскі парламент стаў пастаяннай дзяржаўнай установай? **6.** Растлумачце значэнне паняццяў: парламент, Вялікая хартыя вольнасцей.

### *Гістарычная крыніца*

**З Вялікай хартыі вольнасцей.** 1. Падаравалі мы таксама ўсім свабодным людзям каралеўства нашага на вечныя часіны ўсе ніжэй напісаныя вольнасці... 39. Ні адзін свабодны чалавек не будзе арыштаваны, або заключаны ў турму, або пазбаўлены ўладання, або аб'яўлены стаячым па-за законам і выгнаны, або іншымі спосабамі абяздолены. Мы не пойдзем на яго, калі не будзе законнага прыгавору роўных яму і па закону краіны... 52. Калі хто быў пазбаўлены намі без законнага прыгавору... сваіх зямель, замкаў, вольнасцей або свайго права, мы зараз жа вернем яму іх... *(Якія правы давала хартыя «ўсім свабодным людзям каралеўства»? Ці датычылася гэта залежных сялян?)*

Правообладатель Народная асвета

**Гістарычная даведка**

**Адкрыцці нарманаў.** Нарманы былі ўмелымі мараплаўцамі. Часцей за ўсё нарманскія караблі плавалі ўздоўж берага, каб лёгка схавацца ад шторму. Але здараліся і доўгія плаванні па акіяне. У канцы IX ст. нарманы адкрылі Ісландыю. На іх мове гэта назва азначала «Краіна льдоў». Праз сто гадоў нарманы адкрылі «Зялёную краіну» — Грэнландыю. А каля 1000 г. грэнландскі пасяленца Лейв Шчаслівы адправіўся на сваім караблі далёка на паўднёвы захад. Ён дасягнуў пакрытай лясамі цёплай краіны, дзе рос вінаград. Лейв назваў гэты край «Краінай вінаграду» — Вінландам. Гэта быў востраў Ньюфаўндленд каля ўзбярэжжа Паўночнай Амерыкі. Аб падарожжах нарманаў мы ведаем па паданнях — сагах і раскопках археолагаў.

## § 13. Краіны Заходняй і Паўднёвай Еўропы

**Успомніце: 1.** Чаму ў X ст. у Заходняй Еўропе ўлада каралёў аслабла? **2.** Якая падзея ў гісторыі Заходняй Еўропы адбылася ў 962 г.? **3.** Растлумачце значэнне паняццяў: кароль, граф, феадальная раздробленасць, рэлігійная вайна.

**1. Францыя ў X—XIII стст.** У X ст. Францыя распалася на мноства феадальных уладанняў. Французскі кароль валодаў землямі вакол сваёй сталіцы Парыжа і горада Арлеана. Гэту тэрыторыю называлі ***«Востраў Францыя»***. З усіх бакоў яна была абкружана вялізнымі ўладаннямі буйных феадалаў. Графы і герцагі Нармандыі, Бургундыі, Шампані, Анжу былі багацейшымі і мацнейшымі за караля. Яны не падпарадкаваліся яму.

Кароль не мог дабіцца пакорнасці нават ад сваіх васалаў. Часам яны пачыналі міжусобныя войны на землях самога караля. З гэтай прычыны кароль адважваўся праехаць па сваіх уладаннях з Парыжа ў Арлеан толькі ў суправаджэнні ўзброенага атрада. *(Дзе каралеўская ўлада была мацнейшая — у Англіі або ў Францыі?)*

Не маючы рэальнай улады над ўсёй краінай, французскі кароль усё ж быў вышэйшай асобай у дзяржаве. Яго падтрымлівала царква. Ён меў самы высокі тытул, належыў да

Правообладатель Народная асвета

правячай у краіне дынастыі. Кароль прызнаваўся ўсімі феадаламі як галоўнакамандуючы войскамі краіны, вярхоўны суддзя.

У пачатку XII ст. улада каралёў Францыі пачала ўзмацняцца. Кароль Людовік VI павёў рашучую барацьбу са свавольствам уласных васалаў. Ён умацаваў сваю сталіцу — Парыж і арганізаваў добрае войска. Разграміўшы непакорных васалаў, кароль ***Людовік VI*** стаў гаспадаром на сваіх землях. Цяпер можна было думаць аб пашырэнні каралеўскіх уладанняў за кошт зямель буйных феадалаў. Пераемнікі Людовіка VI аб'ядноўвалі вакол «Вострава Францыі» ўсё новыя і новыя тэрыторыі.



Суд французскага караля. *Мініяцюра XIII ст.*

У сярэдзіне XII ст. граф Анжу ***Генрых Плантагенет*** стаў яшчэ і каралём Англіі. Генрых быў таксама герцагам Нармандыі і герцагам Аквітаніі. У выніку пад уладай англійскага караля ў Францыі апынуліся вялізныя тэрыторыі. Французскім каралям давялося адваёўваць уладанні Плантагенетаў у Францыі. У пачатку XIII ст. кароль Францыі ***Філіп II Аўгуст*** пашырыў свае ўладанні амаль у чатыры разы. Пад уладай англічан заставалася толькі невялікая частка французскіх зямель. Так паступова адбывалася аб'яднанне краіны пад уладай французскіх каралёў.

**2. Свяшчэнная Рымская імперыя ў Высокім сярэдневякоўі.** У X ст. у Германіі ўлада каралёў была моцнай. Яны сапраўды з'яўляліся гаспадарамі на сваіх вялікіх землях. Германскі кароль Атон I стварыў моцнае войска і разбіў качэўнікаў-венграў. Затым ён здолеў падпарадкаваць славян, што жылі паміж рэкамі Эльба і Одэр. Атон I устанавіў сваю ўладу і ў феадальна-раздробленай Паўночнай Італіі. У выніку Германія

Правообладатель Народная асвета

стала вялікай і ўплывовай дзяржавай у Еўропе. Атон I хацеў, каб яго лічылі главой усіх правіцеляў Еўропы.

У **962** г. Папа Рымскі ўсклаў на Атона I імператарскую карону. Так у Заходняй Еўропе з'явілася ***Свяшчэнная Рымская імперыя***. У яе, акрамя Германіі і Паўночнай Італіі, з цягам часу ўвайшлі землі Швейцарыі, Чэхіі, Нідэрландаў. Але з XII ст. улада германскіх каралёў-імператараў пачала слабець. Чаму? Нямецкія феадалы вялі войны ў землях славян, а пазней і ў Прыбалтыцы. Яны дабіваліся ад каралёў новых зямель і правоў наследавання. Таму нямецкія феадалы атрымлівалі ўсё большую самастойнасць. Гарады Італіі імкліва багацелі. Гараджане не жадалі дзяліцца даходамі з нямецкімі заваёўнікамі і ўзнімалі паўстанні. Германскія каралі, каб каранавацца ў Рыме як імператары, вымушаны былі рабіць паходы за Альпы, зноў і зноў пакараючы Італію. За ўдзел у гэтых паходах нямецкія феадалы атрымлівалі новыя землі. Гэта яшчэ больш умацоўвала іх становішча і аслабляла ўладу каралёў-імператараў. Усё гэта прывяло да феадальнай раздробленасці Германіі.

**3. Краіны Пірэнейскага паўвострава. Рэканкіста.** У X ст. на Пірэнейскім паўвостраве ўжо амаль два стагоддзі ішла бязлітасная барацьба паміж арабамі і еўрапейцамі-хрысціянамі.

***Гістарычная даведка***

У пачатку VIII ст. амаль увесь Пірэнейскі паўвостраў быў заваяваны арабамі. Апошнія атрады з мясцовых жыхароў адышлі на поўнач. Яны здолелі ўмацавацца толькі ў горных раёнах Пірэнеяў. Адсюль еўрапейцы вялі наступы на поўдзень паўвострава.

Гэта вайна вялася еўрапейцамі-хрысціянамі за вяртанне захопленай арабамі тэрыторыі. Яна атрымала назву ***Рэканкісты***. *(На іспанскай мове Рэканкіста азначае «Адваяванне».)* Вайна працягвалася каля васьмі стагоддзяў. *(Падлічыце, у якім стагоддзі яна скончылася.)* Рымскія папы не раз заклі-

Правообладатель Народная асвета

калі хрысціян да паходаў супраць арабаў у Іспаніі. У Рэканкісце, акрамя мясцовага насельніцтва, часам удзельнічалі французскія, нямецкія, італьянскія рыцары. У ходзе Рэканкісты ўтварыліся каралеўствы ***Кастылія***, ***Арагон***, ***Навара***, ***Партугалія***. У пачатку XIII ст. адбыўся рашаючы пералом у вайне. У **1212** г. войска пірэнейскіх каралеўстваў і атрады еўрапейскіх рыцараў ушчэнт разграміла арабаў. Да сярэдзіны XIII ст. большая частка паўвострава была адваявана хрысціянамі. Толькі на поўдні засталася невялікая дзяржава арабаў.



Крыж з горада Аўеда. Шанаваўся як свяшчэнны сімвал Рэканкісты. *VIII ст.*

**1.** Як французскія каралі ўмацоўвалі сваю ўладу над краінай? Параўнайце дзейнасць Людовіка VI і Філіпа II Аўгуста. **2.** Якія задачы адначасова вырашалі каралі Францыі ў вайне з каралямі Англіі? **3.** Якія краіны ўваходзілі ў Свяшчэнную Рымскую імперыю? Чаму войны германскіх каралёў-імператараў узмацнялі буйных феадалаў? Да чаго гэта прывяло? **4.** Што такое Рэканкіста? Хто ў ёй удзельнічаў? **5.** Якія новыя дзяржавы ўтварыліся ў ходзе Рэканкісты?

## § 14. Заходнееўрапейская культура Высокага сярэдневякоўя

**Успомніце:** **1.** Якія веды атрымлівалі вучні ў манастырскіх школах? **2.** Якая краіна была самай адукаванай і культурна развітай у Еўропе ў Раннім сярэдневякоўі? **3.** Як называўся адзін з перыядаў кароткага ўздыму культуры ў Франкскай імперыі? **4.** Растлумачце значэнне паняццяў: культура антычнасці, багаслоўе.

**1. Прычыны культурнага ўздыму ў Заходняй Еўропе.** У перыяд Ранняга сярэдневякоўя культура Заходняй Еўропы перажывала заняпад. Спадчына антычнасці была прыстасавана царквой для патрэб багаслоўя.

У X—XIII стст. у сярэдневяковай культуры адбываўся ўздым. Галоўнымі цэнтрамі культуры сталі гарады. Яны далі

Правообладатель Народная асвета

моцны штуршок развіццю адукацыі, навуковых ведаў, архітэктуры і літаратуры.

У Высокім сярэдневякоўі ўзрасла цікавасць да адукацыі і навукі. Тых ведаў, што захаваліся з часоў антычнасці, ужо не хапала. Патрэбны былі новыя веды для далейшага развіцця сельскай гаспадаркі, рамяства і гандлю. Гарадам і каралеўскай уладзе патрэбны былі адукаваныя людзі. Гарадам — для таго, каб весці гандлёвыя справы, арганізоўваць жыццё горада, адстойваць свае правы. Каралям — для таго, каб мець у дзяржаве падрыхтаваных суддзяў, знаўцаў закону — ***юрыстаў***.

**2. Развіццё адукацыі. Узнікненне універсітэтаў.** У Высокім сярэдневякоўі з'явіліся гарадскія школы. Гэтыя школы давалі пачатковую і сярэднюю адукацыю. Але навыкаў чытання, пісьма і лічэння было мала, каб стаць добрым юрыстам, урачом, багасловам. Таму з'явіліся першыя вышэйшыя навучальныя ўстановы — ***універсітэты***. *(«Універсітас» перакладаецца з латыні як «супольнасць», «аб'яднанне».)* Самымі вядомымі былі універсітэты Парыжа, Балонні, Оксфарда, Кембрыджа. Універсітэты з'яўляліся згуртаваннем настаўнікаў — прафесараў і навучэнцаў — ***студэнтаў***.

*Гістарычная даведка*

Выкладанне ва універсітэтах вялося на лацінскай мове. Таму студэнты, авалодаўшы латынню, маглі вучыцца і жыць у розных еўрапейскіх краінах.

Ва універсітэце студэнтам выкладалі граматыку, арыфметыку, геаметрыю, астраномію, музыку. Вучылі ўменню спрачацца. Усё гэта выкладалася на ***падрыхтоўчым факультэце***. Тыя, хто скончыў яго, маглі выбіраць спецыяльнасць юрыста, урача, багаслова на адным з трох факультэтаў: ***юрыдычным***, ***медыцынскім***, ***багаслоўскім***. Заняткі вяліся ў форме ***лекцый***. Прафесар чытаў студэнтам кнігу. Па ходу чытання

Правообладатель Народная асвета

ён тлумачыў незразумелыя словы і сэнс найбольш складаных сказаў. Студэнты слухалі і запісвалі яго словы. Яшчэ адной формай заняткаў былі славесныя паядынкі — ***дыспуты***. У іх выпрацоўвалася ўменне спрачацца.

**3. Развіццё навуковых ведаў.** У пачатку XII ст. вучоныя Заходняй Еўропы пераклалі з арабскай мовы на лацінскую кнігі старажытнагрэчаскага мысліцеля Арыстоцеля. З іх яны даведаліся пра спосабы доказу ісціны. Гэта выкарыстоўвалася ва універсітэцкіх дыспутах. Сярод выкладчыкаў разгараліся спрэчкі па розных пытаннях. Кожны са спаршчыкаў павінен быў даказаць справядлівасць свайго пункту гледжання ў прысутнасці студэнтаў. Такія спрэчкі вучылі студэнтаў даказваць і паслядоўна выкладаць свае думкі, абапірацца на ўменне разважаць.

***Гістарычная даведка***

Прадметам дыспутаў маглі быць любыя пытанні. Аднойчы на вуліцы горада два прафесары вялі доўгую спрэчку на тэму: «Колькі іголак у вожыка?». Адзін з прахожых параіў: «Ды злавіце вы ў лесе вожыка і пералічыце!» Прафесар адказаў на гэта: «Нас не цікавіць, колькі дакладна іголак у лясного вожыка, нас цікавіць спосаб доказу ісціны!» *(Як вы думаеце, ці можна было, скарыстаўшы прапанову гараджаніна, атрымаць веды аб колькасці іголак у вожыкаў? Чым адрозніваецца жыццёвы вопыт чалавека ад навуковых ведаў, што атрымліваюць з дапамогай доказаў?)*

У XII—XIII стст. сярод выкладчыкаў універсітэтаў вяліся спрэчкі аб спосабах доказу ісціны на падставе веры або ведаў і вопыту. Адны з іх лічылі, што падчас доказаў трэба абапірацца на царкоўных пісьменнікаў або Біблію. Яны адмаўлялі здольнасць чалавечага розуму пазнаваць свет. Іншыя выкладчыкі лічылі, што трэба давяраць уласным ведам, розуму і вопыту. *(Як вы думаеце, хто з іх абараняў пазіцыі багаслоўя?)* У XIII ст. вядомым вучоным быў прафесар ***Роджэр Бэкан***. Ён выкладаў ва універсітэтах Парыжа і Оксфарда.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

Бэкан вучыў сваіх студэнтаў, што сапраўдныя веды павінны пацвярджацца вопытам, а не спасылкамі на царкоўных дзеячаў мінулага. Ён вывучаў матэматыку, якую лічыў патрэбнай для доказу ісціны. Прафесар зрабіў многа вынаходстваў. У выніку сваіх вопытаў Бэкан атрымаў два рэчывы, сумесь якіх узрывалася. Багасловы асуджалі смелае вальнадумства і вынаходніцтва Бэкана. За свае погляды вучоны быў надоўга пасаджаны ў турму.

У Высокім сярэдневякоўі пашырыліся геаграфічныя ўяўленні еўрапейцаў, іх веды аб жыцці іншых народаў. У XIII ст. венецыянскі купец ***Марка Пола*** здзейсніў шматгадовае падарожжа ў Кітай і Цэнтральную Азію. Вярнуўшыся, ён напісаў аб гэтым кнігу, дзе расказаў пра жыццё і звычаі многіх народаў Усходу.

**4. Архітэктура.** У Высокім сярэдневякоўі ў Заходняй Еўропе разгарнулася вялікае будаўніцтва. Самымі буйнымі пабудовамі былі храмы, манастыры, замкі.

Жыхары Заходняй Еўропы былі веруючымі. Таму самымі важнымі пабудовамі з'яўляліся храмы. У X ст. сярэдневяковыя архітэктары па-ранейшаму пазычалі ў старажытных рымлян многія формы антычных будынкаў. Але цяпер яны ўнеслі шмат новага ў архітэктуру і тэхніку каменнага будаўніцтва.

Храмы велічна ўздымаліся над зямлёй падобна да магутных крэпасцей. Суровыя масіўныя сцены, грозныя вежы, вузкія вокны. Цяжкія скляпенні абапіраліся на сцены. І таму сцены будаваліся вельмі тоўстымі і трывалымі з малой колькасцю аконных праёмаў. Будынак казаўся цяжкім, прысадзістым, нягледзячы на свае вежы. Унутры храмаў было мала святла, сцены фарбаваліся ў цёмныя колеры. У змроку мігцелі свечы. Пазней гэты стыль у архітэктуры назвалі ***раманскім*** (ад лацінскага слова «Рома» — Рым).

У XII ст. архітэктары вынайшлі каркас. (**Каркас** — *гэта ўнутраная трывалая канструкцыя будынка, якая служыць*

Правообладатель Народная асвета



Царква ў Лаахскім манастыры. *XII ст.*



Сабор у горадзе Рэймс. *XIII ст.*

*для трываласці ўсяго збудавання.*) Цяпер з'явілася магчымасць узводзіць высокія будынкі. Для гэтага ўжо не патрэбны былі тоўстыя магутныя сцены. Цяжкія скляпенні збудавання падтрымліваліся апорнымі слупамі. А прастора паміж слупамі забудоўвалася лёгкімі сценамі. І, галоўнае, з'явілася магчымасць рабіць у гэтых сценах вялікія стральчатыя вокны. Храмы сталі значна вышэйшыя. Яны напоўніліся рознакаляровым святлом і таямнічым пераліваннем ценяў. Пазней гэты стыль архітэктуры назвалі ***гатычным*** — ад назвы германскага племені готаў. Абавязковым элементам кожнага гатычнага храма было круглае акно з вітражом, на якім знаходзілася выява розы — «гатычная роза». (**Вітраж** — *відарыс з каляровага шкла ў вокнах або дзвярах.*)

**5. Літаратура.** У Высокім сярэдневякоўі было створана шмат літаратурных твораў. Іх пісалі выхадцы са свяшчэннікаў, рыцараў і гараджан. Сяляне свае песні і апавяданні перадавалі з пакалення ў пакаленне вусна.

Асаблівага росквіту ў Высокім сярэдневякоўі дасягнула ***рыцарская літаратура***. У творах паэтаў-рыцараў галоўным быў вобраз ідэальнага рыцара і яго любоў да ідэальнай жанчыны — «прыгожай дамы». Рыцара паказвалі моцным,

Правообладатель Народная асвета

смелым, справядлівым, адданым свайму сеньёру і сваім ідэалам. Адной з самых папулярных паэм была «*Песня пра Раланда*». У ёй услаўлялася вернасць абавязку і каралю рыцара Раланда.

***Гістарычная даведка***

Паэма «Песня пра Раланда» была запісана ў Францыі ў XII ст. Яе сюжэт такі. Армія Карла Вялікага з баямі адступае з Іспаніі. Карл загадвае графу Раланду з атрадам рыцараў затрымаць «няверных». У няроўнай сутычцы Раланд і яго маленькі атрад гінуць. *(Успомніце, у якім стагоддзі жыў Карл Вялікі. На падставе вывучанага матэрыялу вызначце, з кім змагаўся рэальны Раланд і той, што апісваецца ў паэме.)*

У ***гарадской літаратуры*** высмейваліся чалавечыя заганы багатых і знатных людзей. Паэты і пісьменнікі, якія былі з гараджан, асуджалі вайну. Таму ў іх творах вобраз рыцара быў іншы. Рыцара паказвалі як фанабэрыстага чалавека, які не ўмее працаваць. Гараджане складалі таксама сціслыя смешныя апавяданні ў вершах. У іх усхваляліся кемлівасць і знаходлівасць простага чалавека.

***Гістарычная даведка***

Гараджане асабліва любілі казкі і байкі, дзе пад жывёламі падразумяваліся людзі. Шмат такіх баек увайшло ў «Раман пра Ліса». Ён быў створаны ў Францыі і затым перакладзены на іншыя мовы. Галоўны яго змест — пастаянная барацьба гараджаніна-ліса і рыцара-ваўка. Ліс дзякуючы сваёй хітрасці заўсёды пакідаў у дурнях ваўка. Мядзведзь-барон, асёл-архіепіскап таксама паказаны дурнямі ў параўнанні з хітрамудрым лісам. *(Як у гарадской літаратуры адлюстроўваўся дух язычніцкага мінулага еўрапейскіх народаў?)*

**1.** Якія былі прычыны культурнага ўздыму ў Заходняй Еўропе ў Высокім сярэдневякоўі? **2.** Чаму ў Высокім сярэдневякоўі ўзрасла цікавасць да адукацыі і навук? **3.** Чаму вучылі ў сярэдневяковых гарадскіх школах і ва універсітэтах? **4.** Якія формы навучання выкарыстоўваліся ў сярэдневяковых універсітэтах? **5.** Назавіце асаблівасці раманскага і гатычнага архітэктурных стыляў. **6.** Хто і чаму былі галоўнымі героямі рыцарскай і гарадской літаратуры?

Правообладатель Народная асвета

***Гістарычная крыніца***

**З сачыненняў вучонага Роджэра Бэкана.** Розум — вось правадыр правільнай волі. Розум скіроўвае волю да ратавання. Каб рабіць дабро, трэба яго ведаць, каб пазбягаць зла, трэба яго распазнаваць. Пакуль цягнецца невуцтва, чалавек не знаходзіць сродкаў супраць зла... Няма бяспекі большай, чым невуцтва.

Можна пабудаваць прыстасаванні для плавання без весляроў так, каб самыя вялікія караблі прыводзіліся ў рух сілай аднаго чалавека, рухаючыся са значна большай скорасцю. Можна зрабіць павозкі без выкарыстання сілы коней, якія могуць каціцца больш хутка; лятальныя машыны, седзячы ў якіх чалавек можа прыводзіць у рух крылы, якія ўдараюць па паветры таксама, як птушыныя. *(Якія вынаходствы і адкрыцці прадбачыў Бэкан? Вызначце, якія з поглядаў Бэкана маглі стаць прычынай яго праследавання.)*

## *АБАГУЛЬНЕННЕ ДА РАЗДЗЕЛА I*

### Заходняя Еўропа і Візантыя

У гэтым раздзеле вы пазнаёміліся з гісторыяй Заходняй Еўропы і Візантыі Ранняга і Высокага сярэдневякоўя (V—XIII стст.).

У гэты час сфарміраваліся і развіваліся дзве сярэдневяковыя цывілізацыі Еўропы: заходнееўрапейская і ўсходнееўрапейская. Аснову першай склалі Франкская дзяржава, затым дзяржавы, якія ўтварыліся пасля яе распаду. Да яе належалі таксама Англія, скандынаўскія і пірэнейскія дзяржавы. Асновай усходнееўрапейскай сярэдневяковай цывілізацыі з'яўлялася Візантыя — прамая наследніца цывілізацый антычнасці. Гэтыя еўрапейскія цывілізацыі мелі многа агульнага. Але былі і важныя адрозненні. У грамадстве Заходняй Еўропы сфарміраваліся феадальныя адносіны — дагэтуль невядомыя чалавецтву. У Візантыі ж яны так і не склаліся. Візантыя ў Раннім сярэдневякоўі валодала самай развітой культурай у Еўропе. А ў Заходняй Еўропе ў гэты час культурнае жыццё прыйшло ў заняпад. Візантыйская паэтэса Касія пі-

Правообладатель Народная асвета

сала: «Ненавіджу невука, як Іуду». А на захадзе непісьменны кароль быў звычайнай з'явай. Візантыю ў Раннім сярэдневякоўі называлі краінай гарадоў, а ў Заходняй Еўропе ў гэты перыяд гарадоў было вельмі мала. У Высокім сярэдневякоўі Заходняя Еўропа стала даганяць Візантыю ў сваім развіцці. Адбываўся бурны рост гарадоў, развівалася культура. З'явіліся універсітэты. Візантыя ж паступова прыйшла ў заняпад. Важную ролю ў гэтым адыграла бязлітасная барацьба з заваёўнікамі, якія нападалі з усіх бакоў. Заняпад Візантыі адмоўна адбіўся на развіцці ўсёй усходнееўрапейскай цывілізацыі.

## Пытанні і заданні

Назавіце даты падзей: 1. Падзел імперыі Карла Вялікага згодна з Вердэнскім дагаворам. 2. Захоп крыжаносцамі Канстанцінопаля. 3. Заваяванне франкамі Галіі. 4. Утварэнне імперыі Карла Вялікага. 5. Падзенне Заходняй Рымскай імперыі. 6. Утварэнне папскай дзяржавы.

Размясціце падзеі ў храналагічным парадку: 1. Уварванне манголаў у Заходнюю Еўропу. 2. Раскол хрысціянскай царквы і ўтварэнне каталіцкай і праваслаўнай цэркваў. 3. Узнікненне парламента. 4. Першы крыжовы паход. 5. Стварэнне Свяшчэннай Рымскай імперыі. 6. Нармандскае заваяванне Англіі. 7. Пачатак Рэканкісты.

Успомніце: Якія дзяржавы былі створаны германцамі на тэрыторыі Заходняй Рымскай імперыі? Якія дзяржавы былі створаны ў выніку першага крыжовага паходу? Якія дзяржавы ўтварыліся ў выніку падзелу Франкскай імперыі? Якія новыя дзяржавы ўтварыліся ў Заходняй Еўропе ў Высокім сярэдневякоўі? Якія краіны Еўропы зведалі спусташальныя нашэсці качэўнікаў-манголаў у XIII ст.?

Правообладатель Народная асвета

Суаднясіце імёны гістарычных дзеячаў і звязаныя з імі паняцці.

| | |
|---|---|
| 1. Юстыніян I | А. Вялікая хартыя вольнасцей |
| 2. Хлодвіг | Б. «Салічная праўда» |
| 3. Канут Вялікі | В. «Кодэкс Юстыніяна» |
| 4. Іаан Беззямельны | Г. «Жыццё Карла Вялікага» |
| 5. Эйнгард | Д. Стварэнне Свяшчэннай Рымскай імперыі |
| 6. Атон I | Е. Магутнасць Даніі |
| 7. Карл Вялікі | Ж. Стварэнне Франкскай імперыі |

Запоўніце схему «Шляхі, якімі сяляне траплялі ў залежнасць».

| | | |
|---|---|---|
| | 1. | |
| Свабодны селянін | 2. | Залежны селянін |
| | 3. | |

Выканайце заданні і адкажыце на пытанні:

Да якога стагоддзя адносяцца даты: 395 г., 476 г., 527 г., 800 г., 843 г., 1099 г., 1204 г., 1265 г.?

Вызначце храналагічныя рамкі: Вялікага перасялення народаў, нападаў нарманаў, распаўсюджвання хрысціянства ў Заходняй Еўропе, крыжовых паходаў.

Складзіце храналагічныя табліцы: «Дзяржавы Заходняй Еўропы ў Раннім сярэдневякоўі», «Візантыя ў Раннім сярэдневякоўі».

Юстыніян нарадзіўся ў 482 г. Падлічыце, колькі яму было гадоў, калі ён стаў імператарам, колькі гадоў ён правіў.

Правообладатель Народная асвета

Карл Вялікі памёр у 814 г. ва ўзросце 72 гадоў. Падлічыце, калі ён нарадзіўся, колькі яму было гадоў, калі ён стаў каралём і колькі гадоў ён насіў тытул імператара.

Суаднясіце паняцці і азначэнні.

| | |
|---|---|
| 1. Бенефіцый | А. Гаспадарка, у якой прадукты і рэчы вырабляюцца не на продаж, а для ўласнага ўжытку. |
| 2. Феод | Б. Феадальная павіннасць селяніна ў выглядзе плацяжу прадуктамі або вырабамі рамяства. |
| 3. Феадальны маёнтак | В. Зямельнае ўладанне, якое давалася пажыццёва пры ўмове нясення ваеннай службы. |
| 4. Натуральная гаспадарка | Г. Зямельнае ўладанне, якое давалася за службу і перадавалася ў спадчыну. |
| 5. Аброк | Д. Буйная зямельная гаспадарка, дзе зямля падзялялася на панскія палеткі і сялянскія надзелы, на якіх працавалі залежныя сяляне. |
| 6. Паншчына | Е. Феадальная павіннасць селяніна ў выглядзе працы ў гаспадарцы феадала. |

Вызначце, да гісторыі якіх краін сярэдневякоўя адносяцца наступныя паняцці: Вялікая хартыя вольнасцей, Каралінгі, парламент, імператар, «Кодэкс Юстыніяна», «Салічная праўда», «Каралінгскае адраджэнне», Рэканкіста.

Дайце разгорнутыя адказы на пытанні:

1. Чаму менавіта царква ў Заходняй Еўропе ў Раннім сярэдневякоўі была галоўнай захавальніцай культурнай спадчыны антычнасці? 2. Якія вынікі для Еўропы меў падзел хрысціян-

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

скай царквы на праваслаўную і каталіцкую? 3. Чаму ў Высокім сярэдневякоўі папы рымскія маглі ўмешвацца ў справы заходнееўрапейскіх дзяржаў і нават прымушаць каралёў выконваць іх волю? 4. Чаму рымскія папы і каталіцкая царква былі галоўнымі арганізатарамі крыжовых паходаў? 5. Якую ролю адыграла каталіцкая царква ў развіцці адукацыі ў сярэдневяковай Заходняй Еўропе?

Складзіце расказ на тэмы: «Жыццё феадальна-залежнага селяніна», «Жыццё французскага феадала-васала ў XI ст.», «Жыццё падмайстра ў сярэдневяковым горадзе».

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

# Раздзел II. СЛАВЯНЕ Ў РАННІМ І ВЫСОКІМ СЯРЭДНЕВЯКОЎІ

## § 15. Славяне ў Раннім сярэдневякоўі

**Успомніце:** **1.** Каго лічаць продкамі славян? **2.** Дзе знаходзілася прарадзіма славян, з якой тэрыторыі яны пачалі сваё рассяленне? **3.** Што такое Вялікае перасяленне народаў?

**1. Падзел славян на ўсходніх, заходніх і паўднёвых.** Доўгі час славяне жылі на невялікай тэрыторыі ў Цэнтральнай Еўропе. Гэту тэрыторыю — своеасаблівую «калыску» славян — называюць *прарадзімай*.

У выніку нашэсця гунаў і перамяшчэння германскіх плямёнаў многія здаўна асвоеныя землі ў Еўропе абязлюдзелі. У V — пачатку VI ст. на іх пачалі перасяляцца славяне. У выніку славянскія плямёны занялі неабсяжную прастору ад ракі Эльбы (славяне называлі яе «Лаба») на захадзе да Волгі на ўсходзе, ад Ладажскага возера на поўначы да ракі Дунай і Чорнага мора на поўдні. *(Знайдзіце на карце* (гл. с. 78) *названую тэрыторыю.)*

У ходзе рассялення асобныя славянскія плямёны аказаліся адарванымі адно ад аднаго. На новых землях яны сустрэліся з рознымі народамі, з якімі часткова змяшаліся. Пазней розныя групы славян стварылі свае дзяржавы. Усё гэта прывяло да распаду агульнаславянскага адзінства і падзелу славян на ***заходніх***, ***паўднёвых*** і ***ўсходніх***.

Заходнія славяне засялілі землі ад Віслы да Эльбы. Яны былі продкамі сучасных народаў: польскага, чэшскага і славацкага. Другая група славянскіх плямёнаў перайшла Дунай і ўварвалася ў межы Візантыйскай імперыі. Пасля цяжкіх войнаў з візантыйцамі яны засялілі Балканскі паўвостраў. Гэтыя плямёны склалі аснову паўднёвых славян — продкаў балгар, сербаў, харватаў і іншых народаў. Вялікая група славян па-

Правообладатель Народная асвета

ступова засяліла тэрыторыю Усходняй Еўропы. Яны з'явіліся асновай усходнеславянскай супольнасці. Гэта былі продкі беларускага, рускага і ўкраінскага народаў.

**2. Грамадскі лад і заняткі славян.** Славяне звычайна сяліліся ўздоўж берагоў рэк. Свае паселішчы яны ўмацоўвалі валамі і равамі.

Славяне жылі родамі, некалькі родаў складамі племя. Некалькі плямёнаў маглі аб'яднацца ў *саюз плямёнаў*. Вольныя супляменнікі лічыліся роўнымі. Усе важныя пытанні жыцця племені вырашаліся на народных сходах — *веча*. Але паступова зарадзілася няроўнасць, і вылучыліся багатыя людзі. Набыць багацце славяне маглі ў набегах на суседзяў. Гэтыя напады ўзначальвалі ваенныя правадыры — *князі*. Вакол князя ўтваралася група пастаянных баявых паплечнікаў і саветнікаў — *дружына*. З дапамогай дружыны князь узмацняў сваю ўладу сярод супляменнікаў.

Найважнейшым заняткам славян было земляробства. Яны вырошчвалі пшаніцу, проса, ячмень. Жыта і авёс пачалі сеяць пазней. Вялікую ролю ў гаспадарцы славян адыгрывала жывёлагадоўля. Разводзілі кароў, свіней, авечак, коней. Славяне былі ўмелымі паляўнічымі, рыбаловамі, збіралі мёд дзікіх пчол. Футра, мёд і воск былі галоўнымі таварамі ў іх гандлі з суседзямі, перш за ўсё з Візантыйскай імперыяй.

**3. Утварэнне першых дзяржаў.** З'яўленне бедных і багатых, узмацненне ўлады князёў сталі ўмовамі для ўзнікненння ў славян дзяржаў. У моцнай дзяржаўнай уладзе было зацікаўлена ўсё насельніцтва: яна вырашала ўнутраныя канфлікты і абараняла ад знешняй небяспекі. Са стэпаў Усходняй Еўропы на славянскія землі часта нападалі качэўнікі. Візантыя імкнулася падпарадкаваць сабе паўднёвых славян, а грозным праціўнікам заходніх славян выступала Франкская дзяржава.

У пачатку VII ст. на ўсходзе Балканскага паўвострава ўзнік саюз ***Сем родаў*** (ці Сем плямёнаў). Але ў канцы таго ж

Правообладатель Народная асвета

стагоддзя гэта міжплемянное аб'яднанне падпарадкавалі качэўнікі-*балгары*. Яны прыйшлі з далёкіх усходніх стэпаў. Качэўнікі-балгары перайшлі да аселага жыцця, засвоілі мову і культуру мясцовых славян і ў хуткім часе зліліся са славянскім насельніцтвам. Па назве гэтых качэўнікаў частка паўднёвых славян пачала называцца балгарамі.

У **681** г. правадыр балгараў хан ***Аспарух*** вымусіў візантыйцаў заключыць з імі мір. (**Хан** — *тытул правіцеля ў некаторых народаў-качэўнікаў.*) Гэты год лічыцца годам стварэння ***Першага Балгарскага царства***. *(Знайдзіце гэту дзяржаву на карце.)* У 864 г. балгары першымі сярод славян прынялі хрысціянства з Візантыі.

У VII ст. у разгар барацьбы з качэўнікамі-*аварамі* некалькі славянскіх плямёнаў у сярэднім цячэнні Дуная аб'ядналіся ў адно княства. Яго правіцелем стаў купец ***СаЉма***. Ён узначаліў барацьбу супраць заваёўнікаў. Былі разгромлены не толькі качэўнікі, але і магутныя франкі, якія таксама жадалі падпарадкаваць гэтае княства. Сама правіў на працягу 35 гадоў, але пасля яго смерці княства распалася.




Славяне і іх першыя дзяржавы

У IX ст. на тэрыторыі цяперашняй Чэхіі існавала ***Вялікамараўская дзяржава***. Яе правіцелі здолелі адстаяць незалежнасць сваёй дзяржавы ў барацьбе з Усходне-Франкскім каралеўствам. Аднак у пачатку X ст. Вялікая Маравія пала пад ударамі качэўнікаў-*венграў*, якія прыйшлі з усходу.

Правообладатель Народная асвета

**4. Дзейнасць Кірылы і Мяфодзія.** Прыняцце хрысціянства славянамі азначала не толькі адмаўленне ад язычніцтва і прызнанне веры ў адзінага Бога. Адным з найважнейшых вынікаў гэтага было далучэнне славянскіх народаў да вялікіх дасягненняў сусветнай культуры. Аднак святары, якія хрысцілі славян, прынеслі з сабой Біблію і іншыя кнігі на чужых для славян мовах — грэчаскай і лацінскай. На гэтых жа мовах вялося і богаслужэнне. Вялікую ролю ва ўстанаўленні хрысціянства сярод славян і ў развіцці іх культуры адыгралі браты ***Кірыла*** і ***Мяфодзій***. У 863 г. браты прыбылі ў Вялікую Маравію па просьбе князя Расціслава.



Старонка кнігі, напісаная кірыліцай

***Гістарычная даведка***

Браты Кірыла і Мяфодзій былі грэкамі з Візантыі, з горада Салонікі (славяне называлі яго Салунь). У наваколлі горада пражывала шмат славян. Таму браты добра ведалі славянскую мову. Валодалі яны і іншымі мовамі. Так, Кірыла, якога называлі таксама Канстанцінам Філосафам, прапаведаваў хрысціянства сярод арабаў і хазар. Як праваслаўная, так і каталіцкая цэрквы абвясцілі Кірылу і Мяфодзія святымі. З 1963 г. у славянскіх краінах штогод адзначаецца Дзень славянскага пісьменства і культуры ў гонар Кірылы і Мяфодзія.

Для таго каб хрысціянскае вучэнне зразумелі славянскія народы, выкладаць яго трэба было на даступнай для іх мове. Таму Кірыла стварыў азбуку для славян. Ад імя хрысціянскага асветніка яна і атрымала сваю назву — *кірыліца*.

Правообладатель Народная асвета

*Гістарычная даведка*

Першай асветнікі Кірыла і Мяфодзій склалі азбуку, якая называлася глаголіцай. Але яна была даволі складанай. Больш простай аказалася вынайдзеная пазней кірыліца, заснаваная на грэчаскім алфавіце.

Стварэнне славянскай пісьменнасці і пераклады кніг на славянскую мову Кірылам і Мяфодзіем мелі вялікае значэнне для развіцця культуры славянскіх народаў. Сучасныя беларускі, рускі, украінскі, балгарскі і сербскі алфавіты ў сваёй аснове маюць кірыліцу.

**1.** Якія тэрыторыі засялілі славяне ў V—VI стст.? **2.** На якія групы падзяліліся славяне? Продкамі якіх сучасных славянскіх народаў яны з'яўляюцца? **3.** Якія прычыны і ўмовы спрыялі ўтварэнню ў славян першых дзяржаў? **4.** Чым вядомы Кірыла і Мяфодзій? У чым значэнне іх дзейнасці для славянскіх народаў? **5.** Дайце вызначэнне паняццям: саюз плямёнаў, веча, князь, дружына.

## § 16. Заходнія славяне ў X—XIII стст.

**Успомніце:** **1**. Продкамі якіх сучасных народаў з'яўляюцца заходнія славяне? **2.** Калі ўзнікла і па якой прычыне загінула Вялікамараўская дзяржава? **3.** Калі адбыўся падзел хрысціянскай царквы на праваслаўную і каталіцкую?

**1. Утварэнне Чэшскай дзяржавы.** На тэрыторыі Чэхіі здаўна пражывалі славянскія плямёны *чэхаў*, *пшаван*, *лучан* і інш. Паступова сярод племянных князёў вылучыўся князь чэхаў. Ён умацаваў сваю сталіцу — Прагу — і здолеў падпарадкаваць суседнія плямёны.

*Гістарычная даведка*

Паводле падання, роданачальнікам чэшскіх князёў быў селянін Пржэмысл. Яго чэхі запрасілі на княжанне па савету мудрай жанчыны Лібушы. Калі паслы з'явіліся да Пржэмысла, той пасвіў валоў. Сялянскія лапці і торба Пржэмысла потым доўга захоўваліся як рэліквіі. Пры каранаванні чарговага чэшскага правіцеля іх выносілі на паказ народу. Дынастыя Пржэмыславічаў кіравала ў Чэхіі да 1306 г.

Правообладатель Народная асвета

У IX ст. чэшскія плямёны аказаліся пад уладай правіцеля Вялікай Маравіі. У канцы IX ст. чэхі прынялі хрысціянства. Чэшскага князя Баржывоя ў 885 г. хрысціў мараўскі епіскап Мяфодзій. Пасля падзення Вялікамараўскай дзяржавы чэшскія плямёны зноў сталі самастойнымі. Так у пачатку X ст. утварылася ***Чэшская дзяржава***.

Аднак становішча ў гэты час было вельмі цяжкім. Слабаму Чэшскаму княству ў адзіночку засцерагчыся і ад набегаў венграў, і ад дамаганняў нямецкіх феадалаў было немагчыма. Таму ў першай палове X ст. чэшскі князь прызнаў васальную залежнасць ад Германіі. *(Успомніце, што такое васальная залежнасць.)*

**2. Чэшскія правіцелі — Баляславы.** Доўгі час у Чэхіі кіравалі князі з аднолькавымі імёнамі: Баляслаў I Жорсткі, Баляслаў II і Баляслаў III Рыжы.

Баляслаў I спрабаваў вызваліцца з васальнай залежнасці. Ён вёў з Германіяй цяжкую вайну, але ў выніку быў вымушаны яе спыніць. Германіі з дапамогай Чэхіі ўдалося разграміць ваяўнічых венграў. У выніку частка славянскіх зямель, абяскроўленых венграмі, была далучана да Чэхіі.

У канцы X ст. на тэрыторыі Чэхіі яшчэ існавала некалькі невялікіх племянных княстваў. Не ўсе з іх прызнавалі ўладу князя чэхаў. Баляслаў II знішчыў апошняга племяннога князя. Пасля гэтага краіна была падзелена на вобласці, кожнай з якіх кіравалі адданыя князю людзі. Аднак ужо ў пачатку XI ст. пры Баляславе III Рыжым паміж чэшскімі князямі пачалася міжусобная барацьба за ўладу.

**3. Чэхія і Германія.** У XII ст. германскія каралі, а затым імператары Свяшчэннай Рымскай імперыі неаднаразова здзяйснялі ваенныя паходы ў Чэхію, пастаянна ўмешваліся ў яе ўнутраныя справы. Чэхі мужна абараняліся і нават рабілі паходы ў адказ.

Правообладатель Народная асвета

Аднак унутраныя разлады аслабілі Чэхію. Яна вымушана была ўвайсці ў склад Свяшчэннай Рымскай імперыі. Хаця ў імперыі Чэшская дзяржава карысталася вялікай самастойнасцю. Аб гэтым сведчыла прынятце чэшскім князем у 1158 г. тытула караля з правам перадачы яго ў спадчыну. Акрамя таго, у Чэхіі не дзейнічалі імперскія законы.

З цягам часу немцы ўсё больш актыўна пачалі прыбіраць да рук багацці Чэхіі. Сярод чэхаў нарастала незадаволенасць.

**4. Утварэнне Польскай дзяржавы.** Пры рассяленні славянскія плямёны занялі значную тэрыторыю паміж рэкамі Одра (Одэр) і Вістула (Вісла). Пазней тут вылучыліся саюзы плямёнаў *палян*, *мазаўшан*, *віслян*. Больш моцным спачатку аказаўся саюз віслян. Але затым першынство перайшло да палян. Іх сталіцай з'яўляўся горад Гнезна. З цягам часу землі віслян і палян пачалі называцца адпаведна Малой і Вялікай Польшчай.

*Гістарычная даведка*

У польскай хроніцы Гала Ананіма расказваецца, што першым князем у Гнезна быў Попел. Затым ён і яго нашчадкі былі выгнаны. Згодна з паданнем Попела праследавалі мышы, таму ён схаваўся на востраве. Але і тут мышы дабраліся да непрызнанага князя. Пакусаны імі, ён памёр страшнай смерцю. А князем у Гнезна стаў Земавіт — сын селяніна Пясты. Каралі з дынастыі Пястаў кіравалі ў Польшчы да 1370 г. У некаторых землях Пясты княжылі да XVII ст.

У другой палове X ст. польскія землі былі аб'яднаны ў адзіную дзяржаву князем ***Мешкам I***. У 966 г. ён прыняў хрысціянства з Рыма. Пераемнік Мешкі ***Баляслаў I*** значна пашырыў межы Польскай дзяржавы. Гэты правіцель адрозніваўся незвычайнай фізічнай сілай і адчайнай смеласцю, за што быў празваны Храбрым. У 1025 г. незадоўга перад смерцю Баляслаў I прыняў каралеўскі тытул. Гэта сведчыла аб поўнай незалежнасці краіны і росце яе міжнароднага аўтарытэту.

Правообладатель Народная асвета



Польскі князь Мешка I



Польскі кароль
Баляслаў I Храбры

**5. Польшча і яе суседзі.** Суседзямі Польшчы ў X—XIII стст. былі Свяшчэнная Рымская імперыя, Чэхія, Венгрыя і Старажытная Русь. Самай магутнай з гэтых дзяржаў з'яўлялася Свяшчэнная Рымская імперыя. У X ст. нямецкія феадалы захапілі землі заходнеславянскіх плямёнаў паміж рэкамі Одэр і Эльба. Так імперыя аказалася непасрэднай суседкай Польшчы. Адносіны паміж імі складваліся няпроста. Былі перыяды, калі Польшча з'яўлялася саюзніцай імперыі. З Руссю ў Польшчы адбывалася барацьба за спрэчныя пагранічныя гарады. Адносіны Польшчы з Венгрыяй на працягу Высокага сярэдневякоўя паступова паляпшаліся.

На паўночны ўсход ад Польшчы на ўзбярэжжы Балтыйскага мора (паміж рэкамі Нёман і Вісла) жылі плямёны балцкага народа прусаў. Між палякамі і прусамі пастаянна ўзнікалі канфлікты. У 1226 г. адзін з польскіх князёў запрасіў для барацьбы з прусамі рыцараў-манахаў Тэўтонскага ордэна. *(Успомніце, калі былі створаны першыя ордэны рыцараў-манахаў. Як яны называліся?)* На захопленых прускіх землях рыцары Тэўтонскага ордэна стварылі ўласную дзяржаву са сталіцай у горадзе Марыенбург. Яна стала самай небяспечнай суседкай Польшчы.

Правообладатель Народная асвета

**6. Грамадства і гаспадарка заходніх славян.** На працягу X—XIII стст. у Чэхіі і Польшчы паступова складвалася феадальнае грамадства. Найбольш магутнымі людзьмі былі князі (каралі) з правячых дынастый Пржэмыславічаў і Пястаў. У перыяд Высокага сярэдневякоўя большасць сялян у заходніх славян яшчэ заставаліся вольнымі. Але з цягам часу яны ператвараліся ў залежных. Адбывалася гэта па волі князя, калі ён дараваў землі з людзьмі, якія жылі на гэтых землях, камунебудзь ва ўласнасць. Акрамя таго, даведзеныя да галечы сяляне самі пераходзілі пад апеку знатных і багатых людзей.

У X—XIII стст. найважнейшай галіной гаспадаркі заходніх славян заставалася земляробства. У гарадах былі сканцэнтраваны рамяство і гандаль. Разам з тым існавалі цэлыя вёскі, якія спецыялізаваліся на тым або іншым відзе рамяства: Кавалі, Шаўцы, Шчытнікі. Гэтыя вёскі належалі князю і абслугоўвалі яго патрэбы. У цэлым фарміраванне феадальнага грамадства ў Чэхіі і Польшчы ў Высокім сярэдневякоўі яшчэ не завяршылася.

**1.** Калі і пры якіх абставінах узнікла Чэшская дзяржава? **2.** Вылучыце этапы ў развіцці Чэшскай дзяржавы ў перыяд Высокага сярэдневякоўя. **3.** Як складваліся ў Высокім сярэдневякоўі адносіны Чэхіі з Германіяй? **4.** Як і калі ўзнікла Польская дзяржава? Назавіце першых яе правіцеляў. **5.** Якімі ў Высокім сярэдневякоўі былі адносіны Польшчы з яе суседзямі? **6.** Ахарактарызуйце грамадства і гаспадарку заходніх славян у Высокім сярэдневякоўі.

## § 17. Краіны Балканскага паўвострава ў X—XIII стст.

**Успомніце:** **1.** Якая група славян засяліла Балканскі паўвостраў? **2.** Хто такія балгары? **3.** Калі ўзнікла Першае Балгарскае царства?

**1. Гаспадарка і асаблівасці развіцця балканскіх зямель.** На Балканскім паўвостраве ў X—XIII стст. размяшчаліся дзяржавы паўднёвых славян — Балгарыя, Сербія і Харватыя. Але найбольш магутнай дзяржавай была Візантыйская імперыя.

Правообладатель Народная асвета

Яна па-ранейшаму імкнулася падпарадкаваць сабе ўвесь Балканскі паўвостраў.

Паўднёвыя славяне засялілі тэрыторыі, якія раней уваходзілі ў склад Візантыі. Ад антычнасці тут захавалася шмат гандлёвых шляхоў, дарог, партоў на марскім узбярэжжы. Менавіта праз Балканскі паўвостраў праходзілі найважнейшыя гандлёвыя шляхі з Азіі ў Еўропу.

Як бачым, дзяржавы паўднёвых славян узніклі там, дзе раней існавала старажытная рымская цывілізацыя. Але феадальныя адносіны ў іх складваліся інакш, чым у варварскіх каралеўствах Заходняй Еўропы. У паўднёвых славян яны фарміраваліся марудней. Пазней з'яўляецца прыватная ўласнасць на зямлю. Першымі ад славянскіх правіцеляў землі з сялянамі атрымлівала не знаць, а манастыры. Доўгі час выкарыстоўвалася праца рабоў.

**2. Славяне і Візантыя.** Страціўшы многія землі на Балканскім паўвостраве, Візантыя не прымірылася з гэтым. Яна імкнулася вярнуць гэтыя землі. Але для гэтага не хапала войскаў. Таму аблюбаваным прыёмам візантыйцаў стала падбухторванне адных ворагаў на другіх. Так, для вайны супраць Балгарыі быў запрошаны кіеўскі князь Святаслаў. Часта ў войнах са славянамі Візантыя выкарыстоўвала качэўнікаў Паўночнага Прычарнамор'я. У адносінах са славянамі прымяняліся таксама подкуп, падман, утрыманне заложнікаў.

У той жа час паміж Візантыяй і славянскімі дзяржавамі развіваўся гандаль, выгадны для абодвух бакоў. Хоць на візантыйскіх рынках не рэдкім быў і такі «ходкі» тавар, як рабы-славяне.

Вялікая заслуга Візантыі ў культурнай асвеце славянскіх народаў. Дзякуючы Візантыі славяне далучыліся да хрысціянства і антычнай спадчыны. *(Успомніце, які славянскі народ першым прыняў хрысціянства.)* Аднак услед за распаўсюджваннем хрысціянства візантыйцы спрабавалі навязаць і сваю ўладу над маладымі славянскімі дзяржавамі.

Правообладатель Народная асвета



Клімент Охрыдскі.
*Ікона XIV ст.*

**3. Балгарскія царствы.** У канцы IX — пачатку X ст. Першае Балгарскае царства дасягнула сваёй найвышэйшай магутнасці. ***Сімяон***, які кіраваў у гэты час у Балгарыі, абвясціў сябе «царом усіх балгараў і рамеяў».

Балгарыя пры цару Сімяоне распасціралася ад Чорнага мора на ўсходзе да Адрыятычнага мора на захадзе. Сімяон меў намер адваяваць у Візантыі ўсе яе ўладанні на Балканах і захапіць Канстанцінопаль. Але аблога сталіцы Візантыі завяршылася няўдачай.

Пры цару Сімяоне перажывала ўздым і балгарская культура. У Балгарыі ў гэты час дзейнічала шмат вучняў Кірылы і Мяфодзія. З іх найбольш праславіўся ***Клімент Охрыдскі***.

Пасля смерці цара Сімяона Балгарыя яшчэ некаторы час захоўвала незалежнасць. Але ў 1014 г. у рашаючай бітве візантыйская армія разграміла балгарскае войска.

***Гістарычная даведка***

Больш за 14 тысяч балгараў трапілі ў палон. Візантыйскі імператар Васіль II быў да іх небывала бязлітасным. Усіх іх асляпілі (на кожныя 100 чалавек быў пакінуты адзін аднавокі павадыр) і адправілі ў Балгарыю. За такую лютасць Васіль II быў празваны Балгарабойцам.

У **1018** г. уся Балгарыя апынулася пад уладай Візантыі. Першае Балгарскае царства пала.

Балгарскі народ не зміраўся з візантыйскім уладараннем. У канцы XII ст. Балгарыя вярнула сабе незалежнасць. Гэту аднаўленую балгарскую дзяржаву гісторыкі называюць ***Другім Балгарскім царствам***. Неўзабаве яно стала самым моцным на Балканскім паўвостраве.

Правообладатель Народная асвета

**4. Сербскія дзяржавы.** Першыя племянныя княствы сербаў, якія пасяліліся ў цэнтральнай частцы Балканскага паўвострава, узніклі ў VIII—IX стст. Але захоўваць сваю самастойнасць у акружэнні моцных дзяржаў сербам у гэты перыяд было цяжка. Сербскія землі падпарадкоўвалі сабе то балгарскія цары, то візантыйскія імператары.




Славянскія дзяржавы ў IX — першай палове XI ст.

Правообладатель Народная асвета

У X—XI стст. некаторым сербскім правіцелям удавалася толькі на кароткі час аб'яднаць усе сербскія землі. Адзін з іх у 70-я гг. XI ст. нават атрымаў ад Папы Рымскага Грыгорыя VII каралеўскую карону. У канцы XII ст. была ўтворана адзіная ***Сербская дзяржава***. Адбылося гэта ў **1190** г., калі правіцелем Сербіі быў ***Стэфан Нэманя***.

*Гістарычная даведка*

Незадоўга перад смерцю Стэфан Нэманя пастрыгся ў манахі. На гары Афон, што на ўсходзе Грэцыі, разам са сваім сынам ён заснаваў першы сербскі манастыр.

Сын Нэмані ***Стэфан Першавенчаны*** прыняў тытул караля. Адзінае Сербскае каралеўства на чале з дынастыяй Няманічаў праіснавала каля паўтара стагоддзя.

**5. Харвацкая дзяржава.** Паводле пагаднення Карла Вялікага з візантыйскім імператарам харвацкія землі павінны былі належаць Франкскай імперыі. *(Успомніце, калі правіў Карл Вялікі.)* Але ў другой палове IX ст. Харватыя дабілася незалежнасці. У падпарадкаванні харвацкага князя апынуліся старажытныя гарады рымскай правінцыі Далмацыя. У пачатку X ст. Харватыя перажывала свой росквіт. Аднак затым Харвацкую дзяржаву аслабілі міжусобіцы князёў.

У 1102 г. харвацкая знаць заключыла пагадненне з венгерскім каралём аб уключэнні Харватыі ў склад Венгрыі. Але пры гэтым Харватыя заставалася каралеўствам і захоўвала ўнутраную самастойнасць.

У 1242 г. харвацкія землі былі разбураны манголамі. Харватыя стала апошняй краінай на захадзе, да якой дайшло мангольскае войска.

Такім чынам, лёс славянскіх дзяржаў на Балканах ужо ў Высокім сярэдневякоўі разышоўся. Развіццё Балгарыі і Сербіі ў многім вызначалася адносінамі з Візантыяй, а Харватыя ўвайшла ў склад Венгерскага каралеўства.

Правообладатель Народная асвета

**1.** У чым заключаліся асаблівасці развіцця славянскіх дзяржаў Балканскага паўвострава ў Высокім сярэдневякоўі? **2.** Як паўплывала Візантыя на развіццё славянскіх дзяржаў Балканскага паўвострава? **3.** Чаму час праўлення Сімяона лічыцца перыядам найвышэйшага росквіту Першага Балгарскага царства? **4.** Які лёс Першага Балгарскага царства? Ці ўдалося балгарам узнавіць сваю дзяржаўнасць у Высокім сярэдневякоўі? **5.** Раскажыце, як і калі ўзнікла адзіная Сербская дзяржава. **6.** Калі ўзнікла Харвацкая дзяржава? Чаму Харватыя не здолела захаваць сваю незалежнасць?

## § 18. Утварэнне Старажытнарускай дзяржавы

**Успомніце:** **1.** Адкуль прыйшлі славяне ва Усходнюю Еўропу? **2.** Якія дзяржавы першымі ўзніклі ў славян? 3. Якія заняткі былі асноўнымі ў славян?

**1. Усходнія славяне і іх суседзі.** Славяне з'явіліся ва Усходняй Еўропе ў VI ст. Два-тры стагоддзі спатрэбілася ім, каб асвоіць вялізную тэрыторыю да Волгі і Дона. *(Знайдзіце на карце* (гл. с. 87) *тэрыторыю рассялення ўсходніх славян.)*

Звесткі аб тых далёкіх часах захаваліся ў старажытнейшым рускім летапісе — *«Аповесці мінулых гадоў»*. Гэты унікальны твор напісаў манах ***Нестар*** каля ***1113*** г.

У «Аповесці мінулых гадоў» упамінаюцца 12 усходнеславянскіх «плямёнаў», якія рассяліліся на абсяжных прасторах Усходняй Еўропы. «Плямёнамі» гэтыя вялікія супольнасці людзей называе сам Нестар. Гісторыкі называюць іх саюзамі плямёнаў. У кожнага ***саюза плямёнаў*** былі свае звычаі, традыцыі.

На чале некаторых саюзаў плямёнаў стаялі князі. Племяннное княжанне існавала ў *палян*, якія пасяліліся на землях уздоўж сярэдняга цячэння Дняпра. Паводле падання, князь палян Кій заснаваў горад Кіеў. *Драўляне* жылі сярод лясоў, на захад ад палян — іх даўнейшых сапернікаў. На поўнач ад драўлян вакол прыпяцкіх балот размясціліся *дрыгавічы*. Свой князь быў і ў *палачан*, якія сваё імя атрымалі ад ракі Палаты. Палачане былі часткай вялікага саюза *крывічоў*. Іншыя групы

Правообладатель Народная асвета

крывічоў рассяліліся вакол будучых гарадоў Смаленска і Пскова. Самы паўночны славянскі саюз плямёнаў называўся ўласным іменем — *славене*. Каля возера Ільмень ужо пазней яны пабудавалі славуты горад Ноўгарад Вялікі.

Ва Усходняй Еўропе славяне сутыкнуліся з вялікай колькасцю мясцовых народаў. Толькі адзін летапісец Нестар называе больш як 20 балцкіх і фіна-угорскіх народаў. З цягам часу некаторыя з гэтых народаў змяшаліся са славянамі. Другія, захаваўшы сваю самабытнасць, увайшлі ў склад Старажытнарускай дзяржавы. Трэція плацілі даніну Русі, а затым набылі самастойнасць або апынуліся ў складзе іншых дзяржаў.

**2. Ля вытокаў старажытнарускай дзяржаўнасці.** На новай тэрыторыі славяне апынуліся ў акружэнні ваяўнічых суседзяў. На поўначы ўсходнеславянскія саюзы плямёнаў пастаянна зведвалі напады *варагаў*. Так на Русі называлі скандынаўскіх воінаў-вікінгаў. *(Успомніце, хто такія вікінгі.)* Варагаў прыцягвалі ва Усходняй Еўропе выгадныя гандлёвыя шляхі, якія вялі на багатыя рынкі краін Усходу і Візантыі. Акрамя таго, футра пушных звяроў, якія ў вялікай колькасці вадзіліся ва ўсходнееўрапейскіх лясах, паўсюдна карысталася немалым попытам.



Заморскія госці.
*Мастак С. М. Рэрых*

На поўначы ўсходнеславянскія плямёны вымушаны былі плаціць даніну качэўнікам-*хазарам*. Яны стварылі сваю дзяржаву на Паўночным Каўказе і ў Ніжнім Паволжы. Правіцель хазар насіў тытул кагана. Таму гэту дзяржаву называлі ***Хазарскім каганатам*** або ***Хазарыяй***.

У VIII—IX стст. важныя змены адбываліся ў самім грамад-

Правообладатель Народная асвета

стве ўсходніх славян. З'явіліся бедныя і багатыя, паміж імі ўзніклі канфлікты. Каб вырашыць гэтыя і іншыя праблемы, патрабаваўся пасрэднік, які б карыстаўся бясспрэчным аўтарытэтам. Ён павінен быў узяць на сябе і арганізацыю абароны ад знешніх ворагаў. Так працэсы ўнутры грамадства і варожае акружэнне патрабавалі аб'яднання ўсходніх славян.

У сярэдзіне IX ст. усходнія славяне стварылі два буйныя саюзы. На поўначы на чале некалькіх славянскіх і некаторых фіна-угорскіх плямёнаў апынуўся варажскі князь ***Рурык***. Прыблізна ў гэты ж час узнік моцны саюз у Сярэднім Падняпроўі. З летапісу вядомы яго князі: *Аскольд* і *Дзір*. Яны быццам бы пайшлі ад Рурыка і сталі кіраваць у Кіеве ў палян.

Гэты саюз быў вядомы і ў Заходняй Еўропе, і ў арабаў. Замежныя аўтары яго насельніцтва называлі «*русамі*» або «*росамі*». Вядома, что ў 860 г. росы на чале з Аскольдам і Дзірам ажыццявілі дзёрзкі напад на сталіцу Візантыі.

**3. Праўленне Алега.** Рурык на поўначы Усходняй Еўропы здолеў не толькі захаваць сваю ўладу, але і ўмацаваць яе. Калі верыць летапісу, ён падпарадкаваў Полацк і Растоў.

Пераемнікам Рурыка павінен быў стаць яго сын Ігар. Але ён быў яшчэ вельмі малы. Таму новым правіцелем стаў сваяк Рурыка Алег.

У 882 г., паводле «Аповесці мінулых гадоў», Алег вераломна захапіў Кіеў. Князі Аскольд і Дзір былі забітыя. Кіеў Алег назваў «маці гарадоў рускіх». Услед за гэтым Алег заваяваў драўлян, севяран і радзімічаў. Даніну, якую тыя раней выплачвалі хазарам, Алег пачаў збіраць сабе.

Так, ва Усходняй Еўропе ўзнікла дзяржава, якую гісторыкі называюць ***Старажытнарускай дзяржавай*** або ***Кіеўскай Руссю***. **882** *год лічыцца годам заснавання гэтай дзяржавы.*

Аб кіраванні Алега вядома няшмат. У 907 г. ён хадзіў на сталіцу Візантыі Канстанцінопаль (Царград). Вынікам

Правообладатель Народная асвета

стала заключэнне дагавора з візантыйцамі. Па яго ўмовах з рускіх купцоў у Візантыі перасталі збіраць гандлёвыя пошліны.

Але пры князю Алегу Старажытнаруская дзяржава была яшчэ вельмі нетрывалай. Не ўсе ўсходнеславянскія плямёны яму пакарыліся. А пасля смерці Алега Кіеву адмовіліся падпарадкоўвацца драўляне.

**4. Першыя Рурыкавічы.** Улада ў Кіеве пасля Алега дасталася законнаму нашчадку Рурыка князю ***Ігару***. Яму ўдалося заваяваць драўлян. Аднак менавіта ў сутыкненні з імі Ігар у 945 г. загінуў. Прычынай таму стала прагнасць князя і яго дружыны. Сабраўшы даніну з драўлян, Ігар патрабаваў яшчэ. Драўляне паўсталі і забілі князя.

Кіеўскія князі збіралі даніну з падуладных плямёнаў у ходзе *палюддзя*. Князь з дружынай адпраўляўся ў палюддзе восенню і вяртаўся ў Кіеў толькі вясной. У гэты час князь не толькі збіраў даніну, але і забяспечваў сваіх дружыннікаў усім неабходным.

Удава князя Ігара ***Вольга*** адпомсціла драўлянам. Услед за гэтым яна ўнесла важныя змены ў спосаб збору даніны. Для чаго былі створаны спецыяльныя пункты — *пагосты*.

Княгіня Вольга, быўшы хрысціянкай, хацела ўсталяваць у Старажытнарускай дзяржаве хрысціянства. Але зрабіць гэта не здолела. Стаўшы больш дарослым, сын Ігара і Вольгі ***Святаслаў*** адхіліў ад улады сваю маці. Святаслаў быў першым князем Старажытнай Русі, які меў не скандынаўскае, а славянскае імя.



Збор даніны

Першыя князі Рурыкавічы шмат часу праводзілі ў ваенных паходах. З Візантыяй ваяваў князь Ігар. Яго сын Святаслаў разграміў Хазарскі ка-

Правообладатель Народная асвета

ганат, нанёс паражэнне Балгарыі, распачаў вайну з магутнай Візантыйскай імперыяй. Але візантыйцы ўсё ж такі прымусілі Святаслава пайсці з Балгарыі. *(Успомніце, які быў лёс Першага Балгарскага царства.)* Пастаянную небяспеку для Русі пачалі ўяўляць сабою качэўнікі прычарнаморскіх стэпаў — *печанегі.*

Такім чынам, у X ст. Кіеўская Русь ужо валодала ўсімі прыкметамі дзяржавы: існавалі вярхоўная ўлада, адзіная тэрыторыя, падпарадкаванае насельніцтва і сістэма збору падаткаў.

**1.** Якія саюзы плямёнаў усходніх славян упамінаюцца ў «Аповесці мінулых гадоў»? Якія тэрыторыі яны займалі? **2.** Якія прычыны выклікалі неабходнасць утварэння дзяржавы ва ўсходніх славян? **3.** Якія два буйныя саюзы ўзніклі ва ўсходніх славян да сярэдзіны IX ст.? **4.** У выніку якой падзеі ўзнікла Старажытнаруская дзяржава, або Кіеўская Русь? **5.** Чым вядомы першыя князі-Рурыкавічы? **6.** Дайце тлумачэнне паняццям: саюз плямёнаў, варагі, палюддзе, пагост.

***Гістарычная даведка***

**Шлях «з вараг у грэкі»**

Аб'яднанню ўсходніх славян садзейнічаў гандлёвы шлях «з вараг у грэкі». Ён звязваў скандынаўскія краіны з Візантыяй. Большая частка гэтага шляху праходзіла па тэрыторыі ўсходніх славян, па рацэ Днепр. Асобае значэнне гэты гандлёвы маршрут набыў у другой палове IX ст.

Да таго часу купцы часцей карысталіся Вялікім Волжскім шляхам. Ён ішоў ад Брытанскіх астравоў праз Балтыйскае мора па Волзе і далей праз Каспійскае мора ў Арабскі халіфат. У тых мясцінах, дзе рэк не было, судны перацягваліся волакам па сушы. Але Хазарскі каганат перакрыў гэты шлях для рускіх купцоў. Спатрэбілася знайсці іншы шлях. І ён быў знойдзены.

Кантроль над найважнейшым адрэзкам шляху «з вараг у грэкі» даваў вялікія выгады. З купецкіх суднаў, якія праходзілі па ім, спаганяліся гандлёвыя пошліны. Вялікі прыбытак прыносіў продаж на візантыйскіх і ўсходніх рынках футра, мёду, воску і зброі. *(Як вы думаеце, якую ролю адыграў шлях «з вараг у грэкі» ва ўтварэнні Старажытнарускай дзяржавы?)*

Правообладатель Народная асвета

## § 19. Росквіт Старажытнай Русі

**Успомніце:** **1.** З якіх саслоўяў складалася феадальнае грамадства? **2.** Якія дзяржавы паўднёвых і заходніх славян існавалі ў X—XI стст.? **3.** Калі ўзнікла Старажытнаруская дзяржава? Назавіце імёны першых князёў-Рурыкавічаў.

**1. Русь у часы Уладзіміра Краснае Сонейка.** Кіеўская Русь пасля нядоўгай усобіцы паміж сынамі Святаслава ўступіла ў перыяд свайго росквіту. У 980 г. на трон у Кіеве сеў ***Уладзімір Святаславіч***. Народ даў яму імя *Краснае Сонейка*, а праваслаўная царква назвала *Святым*.

У канцы X ст. у асобных землях Русі яшчэ захоўвалася ўлада племянных князёў. Яны падпарадкоўваліся кіеўскаму князю і па яго загаду павінны былі з'яўляцца са сваімі дружынамі. Насельніцтва гэтых зямель выплачвала даніну кіеўскаму князю. Але ў сваіх землях мясцовыя князі кіравалі самі.

Князь Уладзімір канчаткова падпарадкаваў усе ўсходнеславянскія землі Кіеву і знішчыў племянных князёў. Замест іх з'явіліся намеснікі кіеўскага князя — *пасаднікі*. Іх памочнікамі былі *тысяцкія*, якія ў час ваенных дзеянняў узначальвалі апалчэнне («тысячу»). Гэтыя меры далі магчымасць умацаваць уладу кіеўскага князя ў дзяржаве.

Пазней князь Уладзімір у найважнейшыя гарады Русі адправіў сваіх сыноў. Але надзея на тое, што гэта дазволіць умацаваць дзяржаву, не спраўдзілася. Незадоўга перад смерцю Уладзіміра ў 1015 г. супраць яго выступіў сын Яраслаў. Яму бацька даў у праўленне Ноўгарад.

Князь Уладзімір здолеў забяспечыць бяспеку Русі ад знешніх ворагаў. Супраць іх кіеўскі князь правёў мноства паходаў. Аб магутнасці князя Уладзіміра сведчыла чаканка ўласных манет: залатых (златнікаў) і сярэбраных (срэбранікаў).

Праўленне Уладзіміра ў Кіеве пачалося з рэформы язычніцтва. *(Успомніце, што такое язычніцтва.)*

Правообладатель Народная асвета

*Гістарычная даведка*

**З «Аповесці мінулых гадоў».** І пачаў Уладзімір княжыць у Кіеве адзін, і паставіў куміры на ўзгорку за церамным дваром: драўлянага Перуна з сярэбранай галавой і залатымі вусамі, і Хорса, і Дажбога, і Стрыбога, і Сімаргла, і Мокаш. І прыносілі ім ахвяры, называючы іх багамі, і прыводзілі сваіх сыноў і дачок, і прыносілі ахвяры д'яблам, і апаганьвалі зямлю ахвярапрынашэннямі сваімі.

Але вельмі хутка князь зразумеў, што яго дзяржаве патрэбна іншая рэлігія.

**2. Прыняцце хрысціянства.** Язычніцкая рэлігія славян склалася яшчэ ва ўмовах першабытнага грамадства, калі галоўным клопатам для чалавека была барацьба з прыроднай стыхіяй. Але ў грамадстве, дзе існавала дзяржава, дзе адны людзі падпарадкоўвалі сабе другіх, чалавека непакоіла ўжо іншае. Бо да галоднага і жабрацкага жыцця земляроба маглі прывесці не толькі засуха ці ліўні, а і празмерная даніна або спусташальны штраф. Як жа жыць у гэтым новым грамадстве, як чалавеку паводзіць сябе ў ім? Язычніцтва на гэтыя пытанні не магло даць адказ.

Паводле легенды, кіеўскаму князю Уладзіміру раілі прыняць розныя рэлігіі, у тым ліку і хрысціянства з Рыма, і іслам. Уладзімір спыніў свой выбар на хрысціянстве з праваслаўнай Візантыі. З Візантыяй Русь звязвалі даўнія адносіны. На працягу IX—X стст. ужо многія русы хрысціліся ў Канстанцінопале. Сярод іх — і княгіня Вольга.



Хрышчэнне вялікага князя Уладзіміра

У **988** г. князь Уладзімір хрысціўся сам і патрабаваў таго ж ад сваіх падданых. Першымі хрысціліся жыхары Кіева,

Правообладатель Народная асвета

затым — Ноўгарада. У іншых мясцовасцях Русі хрысціянства ўсталёўвалася цяжка, асабліва ў глухіх кутках, якіх не дасягала ўлада князя. Нядаўнія язычнікі не жадалі адмаўляцца ад сваіх багоў — яны ж маліліся ім стагоддзямі.

Услед за прыняццем хрысціянства ў Кіеўскай Русі была створана царкоўная арганізацыя. На чале яе стаяў *кіеўскі мітрапаліт*, які назначаўся ў Канстанцінопалі. Мітрапаліту падпарадкоўваліся *епіскапы* ў найважнейшых гарадах Кіеўскай Русі. Кіеўскі князь для патрэб царквы вылучыў дзесятую частку сваіх прыбыткаў.

Прыняцце хрысціянства садзейнічала ўмацаванню ўлады кіеўскага князя, росту міжнароднага аўтарытэту Старажытнарускай дзяржавы. Русь далучылася да дасягненняў візантыйскай і антычнай культур.

**3. Русь пры Яраславе Мудрым.** У перыяд праўлення ў Кіеве князя ***Яраслава***, празванага ***Мудрым*** (1019—1054 гг.), Старажытная Русь дасягнула найбольшай магутнасці. Русь на роўных будавала свае ўзаемаадносіны з Візантыяй. Была канчаткова ліквідавана пагроза печанежскіх набегаў. Пашырыліся і ўмацаваліся межы Старажытнарускай дзяржавы.

***Гістарычная даведка***

Яраслаў Мудры праславіўся як выдатны дыпламат. Праз сваіх сыноў і дачок ён пароднiўся са многімі моцнымі ўладарамі тагачаснай Еўропы. Так, дачка Яраслава Елізавета ўзяла шлюб з каралём Нарвегіі, Анастасія — з каралём Венгрыі, Ганна — з каралём Францыі. Сын князя Яраслава Усевалад ажаніўся з візантыйскай прынцэсай Ганнай, дачкой імператара Канстанціна IX Манамаха.

Яраслаў Мудры ўдзяляў вялікую ўвагу развіццю адукацыі і культуры. У час яго праўлення будаваліся цэрквы і манастыры, перапісваліся кнігі.

Вядомы Яраслаў Мудры і як заканадавец. Пры ім быў створаны звод пісьмовых законаў — ***«Руская праўда»***. Законы ў ім абаранялі перш за ўсё жыццё і маёмасць багатых людзей.

Правообладатель Народная асвета

За злачынствы супраць княжацкіх дружыннікаў і слуг прадугледжваліся вялікія штрафы. У зводзе ўжо названы катэгорыі залежнага насельніцтва.


Яраслаў Мудры. *Рэканструкцыя М. М. Герасімава*

**4. Старажытнарускае грамадства.** Адносіны паміж людзьмі, іх становішча ў Старажытнай Русі вельмі адрозніваліся ад прывычных нам. Для чалавека ў тыя даўнія часы было важна з'яўляцца часткай якога-небудзь калектыву. Большасць насельніцтва Старажытнай Русі складалі вольныя сяляне — «*людзі*». Яны аб'ядналіся ў абшчыны — *верві* (ад слова «верв» — вяроўка). У гарадах рамеснікі таксама маглі аб'яднацца ў абшчыны — *сотні*. Толькі разам абшчына магла выплачваць вялізны штраф («віру»), які накладваўся за злачынства каго-небудзь з абшчыннікаў. Абшчына абараняла чалавека ад любой небяспекі, дапамагала весці гаспадарку. Выгнаны з абшчыны чалавек пазбаўляўся ўсіх сродкаў да існавання. Такога чалавека называлі *ізгоем*.

На вяршыні старажытнарускага грамадства знаходзіліся *князі*. Сваё паходжанне яны вялі ад Рурыка і ўсю Рускую зямлю разглядалі як родавае ўладанне.

Толькі ад князя чалавек мог атрымаць высокае становішча і вес у грамадстве. Да ліку найбольш багатых людзей на Русі адносіліся «*княжацкія мужы*» і *баяры*. Усе яны ўваходзілі ў дружыну князя. Князь забяспечваў іх усім неабходным за кошт даніны з насельніцтва і ваеннай здабычы. Гэтым жа людзям князь даваў найбольш адказныя даручэнні.

У Старажытнай Русі былі несвабодныя і напаўсвабодныя людзі. Зусім бяспраўнымі былі *чэлядзь*, *халопы*. Часова, пакуль не выплаціць купу (доўг), станавіўся несвабодным *закуп*. Да напаўсвабодных людзей адносіліся *смерды*. Яны выконвалі павіннасці на карысць князя.

Правообладатель Народная асвета

Такім чынам, старажытнарускае грамадства яшчэ не было феадальным: у ім толькі намецілася фарміраванне асноўных саслоўяў феадальнага грамадства. Таму Старажытнарускую дзяржаву называюць *раннефеадальнай*.

**1.** Раскажыце пра дзейнасць князя Уладзіміра Святаславіча. **2.** Якія прычыны прывялі да прыняцця хрысціянства на Русі? Якое значэнне мела гэта падзея? **3.** Калі было прынята хрысціянства на Русі? **4.** Чаму час кіравання Яраслава Мудрага быў перыядам найвышэйшай магутнасці Старажытнай Русі? **5.** Чаму чалавеку ў Старажытнай Русі важна было належаць да абшчыны? **6.** Якія групы насельніцтва Старажытнай Русі адносіліся да пануючых, а якія — да залежных?

## § 20. Палітычная раздробленасць Старажытнай Русі

**Успомніце:** **1.** Калі распалася Франкская імперыя? Чаму гэта адбылося? **2.** Якія функцыі выконвалі князі ў Старажытнай Русі? **3.** Што такое феадальныя адносіны?

**1. Прычыны раздробленасці Старажытнай дзяржавы.** Палітычная раздробленасць — гэта заканамерны этап у развіцці раннефеадальных дзяржаў. Яна была выклікана некалькімі прычынамі.

Кіеўскія князі імкнуліся забяспечыць сваім сынам жыццё, вартае прадстаўніка княжацкага роду. Падобна правіцелям дзяржаў раннесярэдневяковай Заходняй Еўропы, яны раздавалі частку сваіх уладанняў сынам. Ужо праз некалькі пакаленняў усе гарады Русі былі размеркаваны паміж князямі-Рурыкавічамі. У кожнага ж з іх былі свае сыны, а ў тых — свае. Яраслаў Мудры, напрыклад, завяшчаў Рускую зямлю пяці сваім сынам, а ў старэйшага з іх было тры сыны, у другога — пяць і г. д.

У Старажытнай Русі панавала натуральная гаспадарка. Гэта значыла, што асобная сям'я або абшчына ў стане была поўнасцю забяспечыць сябе ўсім неабходным. (*Падумайце, якія тавары ці прадукты не маглі быць выраблены ў кожнай аб-*

Правообладатель Народная асвета

*шчыне.)* Таму эканамічныя сувязі паміж рознымі абласцямі былі нетрывалымі.

Адбывалася і развіццё феадальных адносін. Дружыннікі князя атрымлівалі зямлю ва ўласнасць. Так з’явіліся баярскія вотчыны. Губляць свае ўладанні баяры не жадалі. Таму былі зацікаўлены ў тым, каб князі заставаліся ў сваіх княствах. Баяры станавіліся ўсё больш незалежнымі. Ад князя яны патрабавалі праводзіць палітыку ў іх інтарэсах.

Аднак палітычная раздробленасць не была заняпадам старажытнарускіх княстваў. У іх раслі гарады, развіваліся рамёствы і гандаль. Для гэтага перыяду характэрны росквіт культуры. Да таго ж захавалася і тое, што аб’яднала Рускую зямлю: адзіны княжацкі род, які правіў, агульны звод законаў «Руская праўда», адна царкоўная арганізацыя.

**2. Аслабленне ўлады кіеўскіх князёў.** Правіцель, які займаў прастол у Кіеве, у летапісах называецца ***вялікім князем***. Усе іншыя князі павінны былі яму падпарадкоўвацца. Аднак ужо ў пачатку XI ст. самастойным стала Полацкае княства. Пасля смерці Яраслава Мудрага (1054 г.) сваркі паміж князямі станавяцца ўсё больш частымі.

У **1097** г. князі сабраліся на з’езд у Любечы. Яны прызналі, што ўсобіцы на руку толькі ворагам Русі — качэўнікам-полаўцам. Каб прадухіліць сваркі, было прынята рашэнне, што кожны князь уладарыць землямі, атрыманымі ад свайго бацькі ў спадчыну. З гэтага часу рознымі княствамі сталі кіраваць свае дынастыі: Вольгавічы ў Чарнігаўскай зямлі, Манамашычы ва Уладзіміра-Суздальскай зямлі і г. д.



З’езд князёў.
*Мастак С. В. Іваноў*

Правообладатель Народная асвета

У Кіеве па-ранейшаму павінен быў кіраваць старэйшы ў Рускай зямлі князь. Але ў 1113 г. кіяўляне, якія паўсталі, запрасілі вядомага сваёй барацьбой з качэўнікамі ***Уладзіміра Манамаха.*** Ён быў адным з унукаў Яраслава Мудрага, але зусім не старэйшым.

Уладзіміру Манамаху ўдалося на час аднавіць уладу Кіева амаль на ўсёй тэрыторыі Русі. Ён уладарна кіраваў сваімі шматлікімі сваякамі — князямі розных зямель-княстваў. Але пасля смерці Уладзіміра ў 1125 г. разлады паміж князямі рэзка абвастрыліся.

Ужо ў другой палове XII ст. Русь уяўляла сабой тэрыторыю, якая складалася з пятнаццаці самастойных дзяржаў-княстваў. Яны не падпарадкоўваліся кіеўскаму князю.

**3. Буйнейшыя дзяржавы-княствы.** Сярод мноства самастойных дзяржаў-княстваў найбольш моцнымі былі Валынскае, Галіцкае, Полацкае, Уладзіміра-Суздальскае, Чарнігаўскае, Смаленскае. *(Знайдзіце на карце гэтыя княствы і іх сталіцы.)* Адметны дзяржаўны лад меў Ноўгарад Вялікі.

На паўднёвым захадзе Кіеўскай Русі ўзнікла адно з наймацнейшых старажытнарускіх княстваў — ***Галіцкае.*** У **1199** г. князь ***Раман Мсціславіч*** аб'яднаў пад сваёй уладай Галіцкае і Валынскае княствы. У гэту вялізную дзяржаву ўваходзілі некаторыя землі сучасных Украіны, Беларусі, Польшчы, Малдовы і Румыніі. У Галіцка-Валынскім княстве вельмі моцнымі былі баяры. Пасля смерці Рамана Мсціславіча яны па свайму жаданню мянялі правіцеляў.



Андрэй Багалюбскі. *Рэканструкцыя М. М. Герасімава*

Старэйшымі гарадамі Паўночна-Усходняй Русі былі Растоў і Суздаль. Але мясцовыя князі палічылі за лепшае перанесці сталіцу ў новы горад Уладзімір. ***Уладзіміра-Суздальскае*** княства ў другой палове XII — па-

Правообладатель Народная асвета

чатку XIII ст. было адным з мацнейшых на Русі. На прастоле ва Уладзіміры ў гэты час знаходзіліся ***Андрэй Багалюбскі*** і ***Усевалад Вялікае Гняздо***.

«Гаспадар Вялікі Ноўгарад» — так з павагай называлі адзін з багацейшых гарадоў паўночных зямель Русі. Спачатку ў Ноўгарадзе была вельмі моцнай улада кіеўскага князя, сюды ён адпраўляў свайго старэйшага сына. Пад кантролем Кіева,




Старажытная Русь у перыяд раздробленасці

Правообладатель Народная асвета

такім чынам, заставаўся гандлёвы шлях «з вараг у грэкі». Але ў 1136 г. наўгародцы выгналі ўнука Уладзіміра Манамаха, які княжыў у іх. Улада перайшла да баяр. Так у XII ст. на поўначы Русі сфарміравалася своеасаблівая дзяржава — ***Наўгародская баярская рэспубліка***.

*Гістарычная даведка*

Галоўнай службовай асобай у Ноўгарадзе быў *пасаднік*. Наўгародскае апалчэнне ўзначальваў *тысяцкі*. Гэтых кіраўнікоў у Ноўгарадзе выбіралі на *веча*. Па сігнале звана на веча маглі збірацца ўсе свабодныя мужчыны горада. Але ў рэальнасці рашэнні на ім прымалі найбольш уплывовыя баяры.

Аднак Наўгародская рэспубліка не магла абысціся без князя. Князь запрашаўся наўгародцамі і заключаў з імі асобы дагавор. Яго ўмовы ён павінен быў строга выконваць. Князь узначальваў войска, ажыццяўляў суд, на яго імя збіралася даніна.

**4. Міжусобныя войны.** Князі імкнуліся сілай даказаць сваю перавагу над іншымі, захапіць чужыя ўладанні. Разлады паміж князямі вялі да спусташэння гарадоў і паселішчаў, гібелі людзей, перашкаджалі аб’яднанню сіл для барацьбы з качэўнікамі і іншымі захопнікамі.

Адным з найбольш актыўных удзельнікаў міжусобных войнаў быў уладзіміра-суздальскі князь Юрый, сын Уладзіміра Манамаха. За тое што ён імкнуўся пашырыць рубяжы свайго княства і валодаць Кіевам, які не належаў яму, Юрыя празвалі Далгарукім. У 1157 г. князь Юрый быў атручаны кіеўскімі баярамі.

*Гістарычная даведка*

Паводле летапіснага паведамлення, у 1147 г. Юрый Далгарукі запрасіў на сустрэчу свайго саюзніка — чарнігаўскага князя. У пасланні ён пісаў: «Прыйдзі да мяне, браце, у Маскву». Гэта першае згадванне ў летапісе пра Маскву.

Правообладатель Народная асвета

Князям асобных зямель не было неабходнасці пастаянна трымаць пры сабе вялікую дружыну, як гэта рабіў кіеўскі князь. Але для таго каб іх дружыннікі маглі самі сябе забяспечыць, князі раздавалі ім за службу землі з сялянамі. Так фарміравалася катэгорыя феадалаў-васалаў, якіх пазней назавуць ***дваранамі***, г. зн. людзьмі княжацкага двара. Яны павінны былі цалкам падпарадкоўвацца свайму князю-гаспадару.

Міжусобныя войны — характэрная з'ява перыяду палітычнай раздробленасці. Яны аслабілі княствы Русі і зрабілі іх безабароннымі перад мангольскім нашэсцем.

**1.** Якія прычыны прывялі да раздраблення Старажытнарускай дзяржавы? **2.** Чаму аслабла ўлада кіеўскага князя? **3.** Назавіце найбольш моцныя старажытнарускія дзяржавы-княствы перыяду раздробленасці. **4.** Якія асаблівасці Наўгародскай баярскай рэспублікі адрознівалі яе ад іншых зямель-княстваў? **5.** Якія прычыны і вынікі міжусобных войнаў у Старажытнай Русі?

## § 21. Барацьба Русі са знешнімі ворагамі

**Успомніце:** **1.** Якія качэўнікі адыгралі важную ролю ў лёсе паўднёвых і заходніх славян? **2.** Якім князям Кіеўскай Русі даводзілася весці войны з качэўнікамі? **3.** Калі Тэўтонскі ордэн замацаваўся на ўзбярэжжы Балтыйскага мора?

**1. Качэўнікі прычарнаморскіх стэпаў.** Стэпавыя прасторы Паўночнага Прычарнамор'я здаўна прыцягвалі качэўнікаў. Тутэйшыя прыродныя ўмовы дазвалялі весці качавую жывёлагадоўлю. На працягу многіх стагоддзяў прычарнаморскія стэпы насялялі, змяняючы адно аднаго, розныя качавыя плямёны: венгры, печанегі, полаўцы.

Качавая жывёлагадоўля вызначала спосаб жыцця стэпавікоў. Яны жылі ў юртах, якія лёгка разбіраліся (на Русі іх называлі вежамі). Шмат часу праводзілі на конях, з дзяцінства прывыкаючы да сядла. Конь даваў качэўнікам асноўныя прадукты: малако і мяса.

Правообладатель Народная асвета

Прывычным заняткам для качэўнікаў была вайна. Яны часта рабілі грабежніцкія набегі на суседзяў. Здаралася, у пошуках месца для жыцця качэўнікі знішчалі цэлыя дзяржавы. Качэўнікі маглі падпарадкаваць земляробаў і з цягам часу змяшацца з імі.

**2. Барацьба з печанегамі і полаўцамі.** Амаль паўтара стагоддзя Русь вяла напружаную барацьбу з качэўнікамі-*печанегамі*. Ад іх набегаў цярпелі безабаронныя паселішчы. Не заўсёды іх жыхары паспявалі схавацца за моцнымі сценамі гарадоў.

Кіеўскі князь Уладзімір Краснае Сонейка здолеў арганізаваць абарону стэпавага пагранічча. *(Успомніце, у якія гады правіў князь Уладзімір.)* За два дні шляху ад Кіева на поўдзень былі ўзведзены магутныя абарончыя збудаванні: насыпаны валы і пабудаваны крэпасці.

Барацьбу з печанегамі працягваў Яраслаў Мудры. Ён таксама будаваў крэпасці-гарады на мяжы. Але ў гэты час старажытнарускія дружыны яшчэ не хадзілі паходамі на качэўнікаў у іх стэпы. Нават рашаючае паражэнне печанегам у 1036 г. Яраслаў нанёс пад Кіевам.

Пасля печанегаў на шмат гадоў прычарнаморскія стэпы занялі родныя ім *полаўцы*. З іх прыходам небяспека для зямель Русі яшчэ больш узрасла. Полаўцы ледзь не кожны год нападалі на Русь. Яны разбуралі сёлы і гарады, перакрывалі гандлёвыя шляхі. Акрамя таго, полаўцы сталі актыўна ўдзельнічаць у міжусобіцах старажытнарускіх князёў.

У 1185 г. ноўгарад-северскі князь Ігар Святаславіч зрабіў паход на полаўцаў. Але яго дружына была разгромлена, а сам князь трапіў у палон. Гэта сведчыла аб тым, што поспеху ў барацьбе з качэўнікамі можна было дабіцца толькі разам. Адсутнасць адзінства сярод старажытнарускіх князёў асабліва згубна адбілася ў ходзе мангольскага нашэсця.

**3. Мангольскае нашэсце на Русь.** У пачатку XIII ст. у прычарнаморскіх стэпах з'явіліся новыя качэўнікі — *манголы*. На Русі іх называлі *татарамі*.

Правообладатель Народная асвета

Да гэтага часу мангольскія плямёны, аб'яднаныя таленавітым палкаводцам Чынгісханам, заваявалі ўжо многія народы. У 1223 г. адзін з атрадаў манголаў апынуўся каля меж Русі. *(Успомніце, якія тэрыторыі захапілі манголы да гэтага часу.)*

### Гістарычная даведка

Мангольскі атрад узначальвалі лепшыя палкаводцы Чынгісхана. Манголы нанеслі паражэнне полаўцам, і тыя звярнуліся па дапамогу да рускіх князёў. Насустрач захопнікам выступіла аб'яднанае войска паўднёварускіх князёў і палавецкіх ханаў. Але няўзгодненасць іх дзеянняў прывяла да знішчальнага паражэння на рацэ Калцы.

Пасля смерці Чынгісхана заваяваныя манголамі землі былі падзелены. Вобласць на захад ад ракі Урал была аддадзена ўнуку Чынгісхана — *Батыю*.

У канцы **1237** г. манголы абрынуліся на Разанскае княства. Затым Батый адным за другім стаў авалодваць гарадамі Паўночна-Усходняй Русі.

Уладзімірскі князь Юрый Усеваладавіч паспрабаваў даць адпор манголам. Але на рацэ Сіці вясной 1238 г. ён быў разбіты. Здавалася, што ўжо нішто не можа перашкодзіць манголам рабаваць Паўночна-Усходнюю Русь. Аднак чамусьці, не дайшоўшы да Ноўгарада, яны павярнулі на поўдзень.

У 1239 г. Батый зноў рушыў на Русь. На гэты раз мангольская арда прайшла па Паўднёвай і Паўднёва-Заходняй Русі. Былі разрабаваны і спалены найбуйнейшыя і найпрыгажэйшыя старажытнарускія гарады — Пераяслаўль, Чарнігаў, Галіч. 6 снежня **1240** г. манголы захапілі Кіеў. У наступным годзе яны распачалі заваяванне суседніх з Руссю краін. Але сіл на гэта ў манголаў ужо не было.



Мангольскі коннік

Правообладатель Народная асвета

Наступствы Батыева нашэсця на Русь былі жудасныя. У ходзе мангольскага ўварвання былі забіты і захоплены ў палон дзесяткі тысяч людзей. Загінулі унікальныя помнікі культуры, кнігі, летапісы, іконы. Такога спусташэння Русь яшчэ не ведала.

**4. Залатая Арда.** Разрабаваныя старажытнарускія княствы апынуліся ў залежнасці ад *Залатой Арды*. Так называлася створаная манголамі дзяржава. Яна распасціралася ад ракі Днестр на захадзе да ракі Іртыш на ўсходзе. Яе сталіцай стаў горад Сарай, заснаваны Батыем у нізоўях Волгі.

240 гадоў над Руссю вісела ***«мангола-татарскае іга»***. *(Слова «іга» ў старажытнарускай мове — «валовае ярмо», «хамут».)* Так гісторыкі называюць адносіны Русі і Арды. Старажытнарускія княствы павінны былі выплачваць даніну залатаардынскім ханам. Яе збіралі спецыяльныя чыноўнікі, але неўзабаве гэты абавязак перайшоў да князёў. Яны павінны былі ездзіць у Залатую Арду, каб атрымаць *ярлык* (спецыяльны дакумент) на княжанне. Паслухмянасць князёў і іх падданых падтрымлівалася карнымі атрадамі мангола-татар і ханскімі намеснікамі — *баскакамі*.

**5. Барацьба з крыжаносцамі.** Землі Наўгародскай рэспублікі і Усходняй Прыбалтыкі здаўна прыцягвалі прагныя позіркі нямецкіх і шведскіх феадалаў. Іх падтрымлівала каталіцкая царква, якая імкнулася распаўсюдзіць свой уплыў на ўсход.

У пачатку XIII ст. нямецкія рыцары-крыжаносцы стварылі ва Усходняй Прыбалтыцы *Ордэн мечаносцаў*. Яго намаганнямі былі захоплены землі, на якіх жылі продкі сучасных латышоў і эстонцаў. Пад пагрозай апынуліся Наўгародская зямля і Полацкае княства. Аднак заваёўнікі наткнуліся на рашучы адпор. Наўгародскія і полацкія князі, а таксама літоўцы нанеслі некалькі паражэнняў рыцарам. Гэтыя паражэнні прымусілі Ордэн мечаносцаў аб'яднацца з больш моцным Тэўтонскім ордэнам.

Правообладатель Народная асвета

Між тым у падзеі ў Прыбалтыцы ўмяшаліся і шведскія феадалы. Але ў **1240** г. малады наўгародскі князь ***Аляксандр Яраславіч*** нанёс ім знішчальнае паражэнне ў бітве на беразе ракі Нявы. За гэту перамогу палкаводзец быў празваны ***Неўскім***. Затым вясной **1242** г. Аляксандр Неўскі разграміў рыцараў Тэўтонскага ордэна на лёдзе Чудскага возера. Гэту бітву назвалі «Лядовым пабоішчам». Перамога Аляксандра Неўскага прымусіла Тэўтонскі ордэн адмовіцца ад сваіх заваёўніцкіх намераў у адносінах да Русі.



Аляксандр Неўскі. *Мастак П. Дз. Корын*

**1.** Якія плямёны качэўнікаў засялялі прычарнаморскія стэпы? **2.** У чым заключаліся асаблівасці гаспадаркі і спосабу жыцця качэўнікаў? **3.** Раскажыце пра барацьбу Русі з печанегамі і полаўцамі. **4.** Як адбывалася заваяванне Русі манголамі? **5.** Якія наступствы мангольскага нашэсця на Русь? **6.** Раскажыце пра барацьбу Русі са шведскімі і нямецкімі феадаламі. Чым яна завяршылася?

## § 22. Культура Старажытнай Русі

**Успомніце: 1.** Хто такія Кірыл і Мяфодзій? Якую ролю яны адыгралі ў развіцці славянскай культуры? **2.** Калі на Русі было прынята хрысціянства? **3.** Хто з кіеўскіх князёў удзяляў вялікую ўвагу развіццю адукацыі і культуры?

**1. Царква ў культурным жыцці Старажытнай Русі.** Прынянцце хрысціянства карэнным чынам змяніла жыццё ўсходніх славян. Разам з хрысціянствам на Русі з'явіліся пісьменнасць, мураваная архітэктура, жывапіс. Свяшчэннікі і манахі былі найбольш адукаванымі людзьмі. Пры манастырах ствараліся летапісы, перапісваліся кнігі, працавалі школы мастакоў-іканапісцаў.

Хрысціянства садзейнічала развіццю ўласнай старажытнарускай літаратуры. Гэтаму дапамаглі прывезеныя з Балгарыі кнігі. Галоўнай кнігай была Біблія.

Правообладатель Народная асвета

Далучэнне Русі да хрысціянства і яго злучэнне са славянскімі язычніцкімі звычаямі і традыцыямі прывялі да стварэння самабытнай старажытнарускай культуры.

**2. Пісьменнасць і літаратура.** З прыняццем хрысціянства на старажытнарускіх землях стала хутка распаўсюджвацца пісьменнасць. На Русі пісьменнымі былі не толькі святары, але таксама знаць і гараджане.

Сведчаннем таму з'яўляюцца ***берасцяныя граматы***, знойдзеныя археолагамі. (**Берасцяная грамата** — *гэта пісьмовы дакумент, запіска, зробленыя на кары бярозы.*) Асабліва часта іх выяўляюць пры раскопках у Ноўгарадзе. Берасцяныя граматы выкарыстоўваліся ў асноўным для перапіскі паміж людзьмі. Гэта каштоўная крыніца нашых ведаў аб штодзённым жыцці людзей таго часу.

Асобай з'явай у культуры Старажытнай Русі сталі ***рукапісныя кнігі***. Кнігі ствараліся на працягу многіх месяцаў. Яны пісаліся ўручную. Заказаць іх мог толькі вельмі багаты чалавек. Зборы кніг мелі князі, манастыры, буйныя цэрквы. Адной з найстаражытнейшых кніг, якая захавалася да нашых дзён, з'яўляецца *Астрамірава Евангелле* (сярэдзіна XI ст.).

***Гістарычная даведка***

Кнігі ў Старажытнай Русі пісалі на спецыяльна апрацаваных цялячых скурах — пергаменце (пергамене). Таму яны былі вельмі дарагімі. Не так даўно гісторыкам стала вядома, што на Русі існавалі і недарагія, не складаныя для вырабу драўляныя кнігі. На драўляных дошчачках рабіліся спецыяльныя прамавугольныя паглыбленні, якія заліваліся воскам. Па воску пісалі спецыяльнымі металічнымі або касцянымі стрыжнямі — *пісаламі*. Пляскатай лапаткай можна было папраўляць напісаны тэкст або зусім яго выводзіць, каб напісаць новы. Такая кніга («Наўгародскі псалтыр») была знойдзена археолагамі ў 2000 г. у Ноўгарадзе. Яна была створана ў пачатку XI ст. Гэта найстаражытнейшая ў славянскім свеце кніга з напісаным кірыліцай тэкстам. *(Як вы думаеце, якога характару тэкст мог быць запісаны ў такой кнізе?)*

Правообладатель Народная асвета

Аб гісторыі Старажытнай Русі мы ведаем дзякуючы ***летапісам***. Дзесяткі летапісцаў дзень пры дні карпатліва заносілі на пергаментныя старонкі самыя важныя падзеі. Працавалі яны пры манастырах і пры дварах князёў. Найстаражытнейшым летапісам, які дайшоў да нас, з'яўляецца *«Аповесць мінулых гадоў»*. Ён быў завершаны каля 1113 г. *(Успомніце, хто быў яго аўтарам.)* Летапісы ствараліся і раней, але яны не захаваліся. Пазней летапісы сталі ствараца, акрамя Кіева, у цэнтрах найбуйнейшых зямель-княстваў: Ноўгарадзе, Уладзіміры, Галічы.



Наўгародскі псалтыр. *XI ст.*

У XI ст. на Русі з'яўляюцца ўласныя ***жыціі святых***. Так называліся павучальныя расказы аб жыцці, пакутах і подзвігах людзей, якіх царква прызнала святымі. Першымі старажытнарускімі святымі сталі князі-браты Барыс і Глеб. Яны былі забіты князем Святаполкам, празваным Акаянным (ад біблейскага персанажа Каіна, які забіў свайго брата Авеля).

Вяршыняй старажытнарускай літаратуры стаў напісаны ў канцы XII ст. унікальны твор «Слова аб палку Ігаравым».

**3. «Слова аб палку Ігаравым».** Гэта паэма невядомага аўтара была знойдзена толькі ў канцы XVIII ст. Але адзіны яе рукапіс згарэў у Маскве ў час нашэсця Напалеона ў 1812 г. На шчасце, напярэдадні было зроблена некалькі копій.

У паэме расказваецца аб няўдалым паходзе ноўгарад-северскага князя Ігара Святаславіча супраць полаўцаў. Гэты паход паслужыў сюжэтнай асновай для стварэння пранікнёнай паэмы аб Русі, яе мужных, хоць і ганарыстых, кня-

Правообладатель Народная асвета

зях, таленавітым народзе, незвычайным характве роднай зямлі. Аўтар «Слова» заклікае князёў спыніць міжусобіцы і аб'яднацца для барацьбы са знешнімі ворагамі — качэўнікамі.

**4. Архітэктура і жывапіс.** У Старажытнай Русі асноўным матэрыялам для будаўніцтва служыла дрэва. Старажытнарускія майстры дасягалі вялікага майстэрства ў драўляным дойлідстве. Многія пабудовы, асабліва жыллё знаці, аздабляліся разьбой, абкружаліся пераходамі, лесвічкамі. З прыняццем хрысціянства на Русі з'яўляюцца мураваныя храмы — саборы, цэрквы. З каменю сталі ўзводзіцца таксама княжацкія церамы і галоўныя («залатыя») брамы гарадоў. Гарады абавязкова абгароджваліся моцнымі сценамі. Непаўторныя сваёй магутнасцю і прыгажосцю збудаванні Кіева, Уладзіміра, Смаленска і іншых старажытнарускіх гарадоў.

Асаблівай гордасцю горада з'яўляліся саборы, цэрквы. У XI ст. былі пабудаваны *саборы Святой Сафіі* ў Кіеве, Ноўгарадзе і Полацку. Яны сталі сімваламі велічы і характва трох найбуйнейшых цэнтраў тагачаснай Русі.

Перыяд раздробленасці быў часам росквіту старажытнарускай культуры. Князі не шкадавалі сродкаў, каб упрыгожыць свае гарады і тым самым пера-



Сафійскі сабор у Ноўгарадзе



Ікона Уладзімірскай Божай Маці

Правообладатель Народная асвета

сягнуць суседзяў. Храмы абавязкова аздабляліся фрэскамі і іконамі. У найбагацейшых храмах мелася мазаіка. Пры манастырах, княжацкіх і баярскіх дварах існавалі майстэрні, дзе малявалі і багата аздаблялі іконы. Тэхніка і манера пісьма ікон былі перанесены на Русь з Візантыі. Мастакі аздаблялі кнігі мініяцюрамі.

**5. Майстэрства старажытнарускіх рамеснікаў.** Высокага ўзроўню майстэрства дасягнулі старажытнарускія рамеснікі. У гарадах налічваліся дзесяткі рамесных прафесій.

Самым распаўсюджаным было кавальскае рамяство. Старажытнарускія кавалі выраблялі косы, сярпы, сякеры і мноства іншых прылад працы. Вырабы збройнікаў — мячы, кальчугі, шлемы — высока цаніліся ў суседніх краінах. Майстры-ювеліры («кавалі злату, срэбру і медзі») рабілі завушніцы, пярсцёнкі, кара́лі. Ганчары выраблялі з гліны не толькі посуд, але і цэглу, абліцовачную плітку і нават цацкі. Усюды, ледзь не ў кожнай хаце, на Русі ткалі адзенне. *(Якія яшчэ рамесныя прафесіі існавалі на Русі?)*

Вырабы старажытнарускіх рамеснікаў мелі вялікі попыт у еўрапейскіх краінах. Асаблівай папулярнасцю там карысталіся мудрагелістыя рускія замкі і ювелірныя вырабы. Сакрэты іх вытворчасці былі згублены пасля мангольскага нашэсця.

**6. Штодзённае жыццё.** У Старажытнай Русі людзей турбавалі такія ж штодзённыя праблемы, што і нас: у што апрануцца, што есці, як бавіць вольны час.

Адзенне і сялян, і гараджан шылася з даматканага палатна ці сукна. У адзенне з прывазных тканін, асабліва шаўковае, апраналіся толькі вельмі багатыя людзі. Асновай старажытнарускага строю была кашуля. Мужчынская кашуля была даўжынёй да калена, а жаночая — да падлогі. Мужчыны насілі штаны (порткі), жанчыны — спадніцы. Мужчыны абувалі скураныя боты з анучамі — доўгімі вузкімі палосамі

Правообладатель Народная асвета

тканіны, якія абмотвалі вакол нагі. Боты шылі на адну нагу, не адрозніваючы правай і левай, таму іх даводзілася разношваць.

Суровыя зімы вымушалі апранацца ў тоўстыя кажухі. Футра знаці вышывалася золатам. Князі і іх прыбліжаныя насілі плашчы (карзно) з дарагіх усходніх тканін, таксама шытых золатам.

У ежу ў той час ужывалі хлеб, мяса, рыбу, агародніну, сыры, кісялі з пшаніцы. Пілі мёд, віно, піва, квас. Садавіна прысутнічала на сталах толькі багатых людзей. *(Як вы думаеце, якіх прывычных нам прадуктаў не магло быць на стале чалавека ў Старажытнай Русі?)*

***Гістарычная даведка***

Пра быт гараджан таго часу можна меркаваць дзякуючы сенсацыйным адкрыццям археолагаў у Ноўгарадзе. Ужо ў X ст. у Ноўгарадзе былі вуліцы, якія масціліся дрэвам. Прыблізна кожныя 20 гадоў насцілалася новая маставая. У Парыжы ўпершыню маставыя з'явіліся ў XII ст., а ў Лондане — у XV ст. Аднак, як і ў заходнееўрапейскіх гарадах, ніхто не клапаціўся аб чысціні вуліц. Яны вельмі хутка зарасталі пластом смецця і гразі. Што яшчэ больш здзіўляе, у Ноўгарадзе з XI ст. існаваў водаправод. Водаправодныя трубы выраблялiся з выдзеўбаных хваёвых бярвёнаў. З дапамогай водаправода вада падавалася не толькі на княжацкі двор, але і ў іншыя раёны горада. Наўгародскі водаправод быў найстаражытнейшым у Паўночнай Еўропе.

Князі і дружыннікі шмат часу праводзілі ў баляваннях. Іншаземцы заўсёды са здзіўленнем адзначалі цягу ўсходніх славян да лазні.

У гарадах і сёлах Старажытнай Русі вялікай папулярнасцю карысталіся паказы скамарохаў, хоць яны і забараняліся царквою. Захоўваліся многія язычніцкія святы. Усведамляючы сваё бяссілле іх выкараніць, царква прымеркавала да іх хрысціянскія святы.

Правообладатель Народная асвета

1. Якія дасягненні сусветнай культуры прыйшлі на Русь разам з прыняццем хрысціянства? **2.** Што з'яўляецца сведчаннем высокага ўзроўню пісьменнасці насельніцтва Старажытнай Русі? **3.** Раскажыце аб развіцці старажытнарускай літаратуры. Назавіце яе найбольш вядомыя творы. **4.** Раскажыце аб развіцці архітэктуры і жывапісу ў Старажытнай Русі. **5.** Чым славіліся старажытнарускія рамеснікі? **6.** Раскажыце аб асаблівасцях штодзённага жыцця старажытнарускіх людзей.

## *АБАГУЛЬНЕННЕ ДА РАЗДЗЕЛА II*

### Славяне ў Раннім і Высокім сярэдневякоўі

У гэтым раздзеле вы пазнаёміліся з асаблівасцямі развіцця славянскага свету ў VI—XIII стст.: ад рассялення славян і іх падзелу на тры групы да стварэння сваіх дзяржаў і іх палітычнага раздраблення.

Славяне сталі вядомымі пад сваім іменем толькі ў VI ст. н. э. Рассяліўшыся, яны занялі вялізныя прасторы Усходняй, Заходняй і Паўднёвай Еўропы. Тут яны змяшаліся з мясцовымі народамі і здабылі новых суседзяў. Гэта прывяло да распаду агульнаславянскага адзінства і падзелу славян на ўсходніх, заходніх і паўднёвых. Разам з тым у славян захавалася шмат агульнага ў гаспадарцы і культуры.

З'яўленне дзяржаў у славян было выклікана ўнутранымі і знешнімі прычынамі: неабходнасцю вырашаць канфлікты ў грамадстве і абараняць яго ад ворагаў. Характэрнай для ўсіх славянскіх дзяржаў у Высокім сярэдневякоўі стала і палітычная раздробленасць. Вялікае значэнне для развіцця славянскіх дзяржаў мела прыняцце хрысціянства. Гэта садзейнічала развіццю культуры славянскіх народаў, іх зносінам на роўных з іншымі хрысціянскімі народамі.

У канцы Ранняга і ў Высокім сярэдневякоўі славянскі свет падзяліўся. Заходнія і частка паўднёвых славян апынуліся пад моцным уплывам заходнееўрапейскіх краін. Усходнія і

Правообладатель Народная асвета

большая частка паўднёвых славян зведвалі моцнае ўздзеянне Візантыі. Акрамя таго, усходнія славяне каля сярэдзіны XIII ст. аказаліся адарванымі ад астатняй Еўропы мангольскім нашэсцем.

## Пытанні і заданні

Успомніце, якія важныя падзеі ў гісторыі славянскіх народаў адбыліся ў 681, 1025, 1102, 1125 гг.

Успомніце, у якім годзе: князь Алег захапіў Кіеў, князь Уладзімір хрысціў Русь, адбыўся з'езд старажытнарускіх князёў у Любечы.

Вызначце храналагічную паслядоўнасць стварэння дзяржаў: Першага Балгарскага царства, Сербскага, Чэшскага, Польскага, Харвацкага і Старажытнарускага.

Вызначце храналагічную паслядоўнасць наступных падзей: аб'яднанне Галіцкага і Валынскага княстваў, падзенне Першага Балгарскага царства, разгром крыжаносцаў на Чудскім возеры.

Вызначце, якія правіцелі Польскай і Старажытнарускай дзяржаў з'яўляліся сучаснікамі: Уладзімір Святаславіч, Яраслаў Мудры, Уладзімір Манамах; Баляслаў I Храбры, Мешка.

Складзіце храналагічную табліцу: «Процістаянне Русі і качэўнікаў прычарнаморскіх стэпаў».

Дайце азначэнне наступным паняццям: вотчына, баяры, Залатая Арда, берасцяная грамата, племяннoе княжанне, веча, князь, дружына, палюддзе, пагост, кірыліца, пасаднік, верв.

Вызначце, якія паняцці адносяцца да гісторыі ўсходніх, заходніх або паўднёвых славян: палюддзе, Пржэмыславічы, Пясты, Рурыкавічы, пшаване, драўляне, мазаўшане, Няманічы, славене.

Запоўніце табліцу.

Правообладатель Народная асвета

| | Старажытная Русь | Чэхія | Польшча |
|---|---|---|---|
| Узнікненне дзяржавы | | | |
| Прыняцце хрысціянства | | | |
| Пачатак палітычнай раздробленасці | | | |

Запоўніце табліцу «Славянскія дзяржавы ў IX—XIII стст.».

| | Кіеўская Русь | Балгарыя | Чэхія | Польшча |
|---|---|---|---|---|
| Найбольш вядомыя правіцелі | | | | |
| Асаблівасці ўнутранага развіцця | | | | |
| Знешнепалітычнае становішча | | | | |

Дайце разгорнутыя адказы на пытанні: Якую ролю адыграла Візантыя ў развіцці культуры ўсходніх і паўднёвых славян? Якое значэнне мела для ўсходніх славян прыняцце хрысціянства? Які ўплыў на развіццё дзяржаў заходніх славян зрабілі іх суседзі? Якія агульныя рысы можна знайсці ў развіцці гаспадаркі ва ўсходніх, заходніх і паўднёвых славян? Якія наступствы мела мангольскае нашэсце для развіцця Русі?

Назавіце прычыны: узнікнення дзяржаў у славян; прыняцця хрысціянства ў Старажытнай Русі; палітычнай раздробле-

Правообладатель Народная асвета

насці славянскіх дзяржаў; міжусобных войнаў паміж князямі; перамог манголаў у ходзе Батыева нашэсця на Русь.

Вызначце характар узаемаадносін: Візантыі і славян у Раннім сярэдневякоўі, Чэхіі і Свяшчэннай Рымскай імперыі, Польшчы і Тэўтонскага ордэна, Харватыі і Венгрыі, Кіеўскай Русі і качэўнікаў Паўночнага Прычарнамор'я, Русі і Залатой Арды.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

# Раздзел III. ЦЫВІЛІЗАЦЫІ АЗІІ, АФРЫКІ І АМЕРЫКІ Ў V—XIII стст.

## § 23. Узнікненне ісламу і Арабскі халіфат

**Успомніце:** **1.** Дзе пражывалі старажытныя егіпцяне, персы, яўрэі? **2.** Якая рэлігія была пануючая ў Візантыі? **3.** Ад якой падзеі вядзецца адлік нашай эры?

**1. Прыродныя ўмовы і насельніцтва Аравійскага паўвострава.** Арабы здаўна жылі на ***Аравійскім паўвостраве***, ад іх ён і атрымаў сваю назву. Клімат Аравіі вельмі суровы — гэта адзін з найбольш гарачых і сухіх куткоў свету. Большую частку паўвострава займаюць бясконцыя пустыні і стэпы. Дажджоў выпадае вельмі мала, і нават вятры не ўратоўваюць людзей і жывёл ад знясільваючай дзённай спякоты.

У пустыні ў пачатку нашай эры жыла большая частка насельніцтва Аравійскага паўвострава — качэўныя ***арабы-бедуіны***. Галоўным іх заняткам была жывёлагадоўля. Яны разводзілі вярблюдаў, авечак, пераганяючы іх з месца на месца, дзе жывёлы маглі знайсці сабе ежу. Але сустракаліся на Аравійскім паўвостраве і месцы, дзе была вада і білі крыніцы, — ***аазісы***. Іх жыхары займаліся земляробствам, разводзілі сады, вінаграднікі, а затым агародніну і садавіну абменьвалі ў бедуінаў на прадукты жывёлагадоўлі.

**2. Арабы напярэдадні аб'яднання ў адзіную дзяржаву.** У сярэдзіне I тысячагоддзя арабы жылі яшчэ ва ўмовах першабытнаабшчыннага ладу. Арабы верылі ў мноства багоў. Яны былі язычнікамі. Кожнае племя пакланялася сваім багам.

Праз Аравійскі паўвостраў праходзілі важныя гандлёвыя шляхі. Па іх з Індыі, Усходняй Афрыкі караваны перавозілі шоўк, вострыя прыправы, алмазы, слановую косць і іншыя тавары на поўнач. Бедуіны ўдзельнічалі ў караванным гандлі. Яны за плату давалі караваншчыкам вярблюдаў, ахоўвалі

Правообладатель Народная асвета

караваны, а то і самі былі пагоншчыкамі. На гандлёвых шляхах узнікалі буйныя гандлёвыя пасяленні. Адным з іх быў горад ***Мекка***.

Плямёны бедуінаў вялі частыя войны з-за пашы. Войны ўспыхвалі таксама за кантроль над гандлёвымі шляхамі. Знаць бедуінаў шукала крыніцы даходаў і ў набегах на суседнія дзяржавы. *(Якіх качэўнікаў, што нападалі на Візантыю і славянскія краіны, вы ўжо ведаеце?)* Узнікненне маёмаснай няроўнасці, супярэчнасці паміж знаццю і простымі арабамі, неабходнасць адпору знешнім ворагам, імкненне да захопу багаццяў суседніх земляробчых краін прывялі да аб'яднання арабаў у адзіную дзяржаву.

**3. Узнікненне ісламу і аб'яднанне арабаў.** Вялікую ролю ў аб'яднанні арабаў і стварэнні арабскай дзяржавы адыграла новая рэлігія — ***іслам*** (па-арабску гэта азначае «пакорнасць»). Тых, хто прымаў іслам, называлі ***мусульманамі*** (гэта значыць «пакорнымі Богу»). Заснавальнікам ісламу і аб'яднальнікам арабаў быў ***Мухамед***.

*Гістарычная даведка*

Мухамед нарадзіўся ў 570 г. у горадзе Мецы ў небагатай купецкай сям'і. У раннім дзяцінстве застаўся круглым сіратою. Мухамед жыў бедна, хадзіў з караванамі. Потым ён стаў купцом. У 40 гадоў Мухамед пачаў выступаць са сваімі пропаведзямі. Ён гаварыў, што да яго ва ўяўленнях прыходзіў пасланнік Бога архангел Джэбраіл і перадаваў словы Бога, якія Мухамед павінен быў данесці да ўсіх людзей. Тыя, хто яго слухаў і верыў яму, называлі Мухамеда прарокам. (**Прарок** — *у ісламе пасланнік Бога; той, хто адкрывае людзям веру ў Бога.*)

Мухамед прапаведаваў, што ёсць толькі адзін Бог — ***Алах***, а ўсе астатнія багі, якім пакланяюцца арабы, на самай справе такімі не з'яўляюцца. Але толькі няшмат людзей у Мецы спачатку паверылі пропаведзям Мухамеда. Большасць жыхароў горада насміхаліся з яго. І тады ў **622** г. прарок і некалькі дзесяткаў яго паслядоўнікаў вымушаны былі перася-

Правообладатель Народная асвета

ліцца з Меккі ў суседні горад Медыну. *Гэтае перасяленне першай мусульманскай абшчыны пазней было абвешчана першым годам мусульманскай эры.*



Надпіс «Няма Бога, акрамя Алаха, і Мухамед — прарок яго».

Жыхары гэтага горада паверылі ў вучэнне прарока. Стаўшы на чале медынцаў, ён пачаў узброеную барацьбу супраць гараджан Меккі. У **630** г., калі Мухамеда падтрымалі многія плямёны качэўнікаў, Мекка падпарадкавалася яму. Неўзабаве ўсе плямёны Аравіі прызналі Мухамеда сваім уладаром і прынялі іслам. Так была створана адзіная ***дзяржава арабаў***. Цяпер іх аб'ядноўвала не прыналежнасць да аднаго племені, як было раней, а вера ў адзінага Бога (Алаха). На чале дзяржавы стаяў Мухамед — «намеснік Алаха на Зямлі». Ён лічыў усіх мусульман сваімі падданымі.

**4. Заваяванні арабаў.** Пасля смерці Мухамеда арабскай дзяржавай правілі ***халіфы***. (Гэта перакладаецца як «намеснікі прарока».) Таму дзяржаву арабаў называлі ***халіфатам***.

Арабы пачалі свае заваёўніцкія паходы ўжо пры першых халіфах у VII ст. Арабскае войска было шматлікім. Яго складалі ўсе мужчыны, здольныя трымаць у руках зброю. На вярблюдах і конях войска хутка перамяшчалася, з'яўляючыся нечакана для ворага.



Арабскія воіны

Арабы марылі заваяваць Візантыю і Іран. Гэта былі дзве наймацнейшыя дзяржавы таго часу на Усходзе. Яны вялі цяжкія войны паміж сабою. Войны знясілілі Іран і Візантыю. І арабы скарысталі

Правообладатель Народная асвета

гэта. Жыхары многіх візантыйскіх і іранскіх гарадоў, якія пакутавалі ад непасільных падаткаў на вайну, самі адчынялі ім брамы. Арабы ж абяцалі гараджанам бяспеку і змяншэнне падаткаў. Спачатку былі захоплены Сірыя, Палесціна і Егіпет, якія належалі Візантыі. Адначасова арабы заваявалі Іран і частку Сярэдняй Азіі. Яны здолелі захапіць і раёны Індыі ў даліне ракі Інд. У пачатку VIII ст. арабы ўварваліся ў Еўропу. За тры гады яны авалодалі амаль усім Пірэнейскім паўвостравам. Пасля гэтага арабы рушылі на дзяржаву франкаў. Але франкі спынілі іх далейшае прасоўванне ў Еўропу.

Такім чынам, на працягу VII—VIII стст. утварылася велізарная дзяржава арабаў — ***Арабскі халіфат***. Яго ўладанні распасцерліся ад берагоў Атлантычнага акіяна да Індыі. Сталіцай дзяржавы спачатку быў *Дамаск*, а потым *Багдад* (на рацэ Тыгр).

**5. Росквіт Арабскага халіфата і яго распад.** Насельніцтва халіфата было вельмі шматлікім — 70—80 мільёнаў чалавек. Асноўным заняткам з'яўлялася земляробства. Егіпет і Іран давалі багатыя ўраджаі пшаніцы і рысу. У Сірыі і Палесціне вырошчвалі лепшыя гатункі вінаграду і садавіны. Славіліся фінікі з Аравіі. Увесь свет ведаў выдатных арабскіх скакуноў.

Стварэнне адзінай вялікай дзяржавы спрыяла развіццю рамяства і гандлю. Квітнелі старыя гарады, з'яўляліся новыя. Найбольш буйнымі з іх былі Дамаск, Багдад, Каір і Самарканд. Тут працавалі рамеснікі самых розных прафесій. Іх вырабы карысталіся вялікім попытам і славіліся далёка за межамі халіфата. У кожным горадзе былі шматлюдныя базары, якія здзіўлялі разнастайнасцю тавараў. Халіфат меў гандлёвыя сувязі са шмат якімі краінамі Азіі і Еўропы.

Свайго найвышэйшага росквіту халіфат дасягнуў у IX ст. Але ўжо ў канцы гэтага стагоддзя ён распаўся. Яго

Правообладатель Народная асвета

моц падарвалі паўстанні пакораных народаў, перш за ўсё прыгнечаных сялян і рамеснікаў.

Аднак галоўную ролю ў распадзе халіфата адыграла ўзмацненне правіцеляў асобных правінцый. Яны сталі поўнымі гаспадарамі на падначаленых ім тэрыторыях і мелі ўласныя ваенныя сілы. Правіцелі правінцый не жадалі дзяліцца даходамі з халіфамі і перадавалі свае пасады ў спадчыну сынам.

Арабскі халіфат распаўся на мноства самастойных дзяржаў. Але асноўнай мовай у іх заставалася арабская, а рэлігіяй — іслам.

**1.** Апішыце прыродныя ўмовы і заняткі насельніцтва Аравійскага паўвострава ў пачатку нашай эры. **2.** Назавіце прычыны аб'яднання арабаў у адзіную дзяржаву. Якую ролю ў гэтым адыграла прыняцце арабамі новай рэлігіі — ісламу? **3.** У чым былі прычыны заваёўніцкіх паходаў арабаў? **4.** З чым быў звязаны росквіт Арабскага халіфата? **5.** Чаму Арабскі халіфат аказаўся нетрывалым? Калі ён распаўся?

## § 24. Араба-ісламская культура

**Успомніце:** **1.** Якія краіны з развітой культурай заваявалі арабы? **2.** Як называецца свяшчэнная кніга хрысціян? **3.** Назавіце вядомыя вам дасягненні культуры народаў Старажытнага Усходу.

**1. Каран — свяшчэнная кніга мусульман.** Пасля смерці Мухамеда яго пропаведзі былі запісаны паплечнікамі і склалі свяшчэнную кнігу мусульман — ***Каран*** ( у перакладзе з арабскай мовы — «чытанне»). Мусульмане вераць, што Каран — гэта словы Алаха, якія перададзены ім прароку Мухамеду.


Старонка Карана. *VIII—IX стст.*

Галоўнае ў ісламе — вера ў адзінага Бога (Алаха). Мусульмане перакананы ў тым, што чалавечая душа бессмяротная. Алах стварыў

Правообладатель Народная асвета

свет і чалавека, даў людзям сродкі для існавання, дастатак. Але настане канец свету, і на апошнім судзе Алах вынесе свой прысуд кожнаму чалавеку за ўсе яго добрыя і злыя ўчынкі. Праведнікі трапяць у рай, а грэшнікі і няверуючыя ў Алаха апынуцца ў пекле. Мухамед сцвярджаў, што Алах адзін як у арабаў, так і ў яўрэяў, і ў хрысціян, якім Бог адкрыў сябе праз папярэдніх прарокаў — *Мусу* (Майсея) і *Ісу* (Ісуса).

Паколькі іслам узнік побач з тымі тэрыторыямі, дзе раней з'явіліся іудаізм і хрысціянства, то можна заўважыць падабенства Бібліі і Карана. У іх амаль аднолькава распавядаецца пра стварэнне Богам свету за шэсць дзён, пра стварэнне першых людзей, пра іх грэхападзенне і выгнанне з раю, пра сусветны патоп і шмат іншае.

Іслам спачатку быў рэлігіяй толькі арабаў, але ў хуткім часе яго прынялі многія народы свету. Яго распаўсюджванню на велізарнай тэрыторыі спрыялі арабскія заваяванні.

*Гістарычная даведка*

Адно з важных палажэнняў Карана — ідэя джыхада. (**Джыхад** — *гэта шчырасць, стараннасць у распаўсюджванні ісламу, у тым ліку і шляхам вайны супраць людзей іншай веры.*) Каран абяцае, што тыя, хто загінуў у свяшчэннай вайне з «нявернымі», адразу трапяць у рай. Лозунг джыхада адыграў значную ролю ў заваяваннях арабаў. Воіны-мусульмане бясстрашна ішлі ў бой, спадзеючыся, што нічога з імі не адбудзецца без волі на тое Алаха. І нават смерць прынясе ім райскую асалоду. *(Успомніце, хто такія крыжаносцы. Каго яны называлі «нявернымі»?)*

**2. Іслам у жыцці сярэдневяковых мусульман.** Мухамед заклікаў веруючых падпарадкоўвацца ўладам, таму што яны пастаўлены Алахам. Халіф з'яўляўся не толькі галавой дзяржавы, але і галавой усіх мусульман. Тыя, хто не прымаў іслам, плацілі асобы падатак.

Мусульмане павінны былі абавязкова адпраўляць пяць малітваў у дзень. Калі гучаў заклік да малітвы, усе мусульмане

Правообладатель Народная асвета

кідалі свае справы і маліліся. Гэта рабілі ўсе — ад халіфа да жабрака. Маліліся веруючыя ў спецыяльных збудаваннях — ***мячэцях*** ці ў любым прыдатным месцы, таму што лічылася, што Алах адусюль пачуе веруючага. Кожны мусульманін павінен быў хаця б аднойчы ў жыцці здзейсніць падарожжа ў Мекку і наведаць галоўную святыню ісламу — храм *Каабу*. Гэта падарожжа называлася *хадж*. *(Успомніце, дзе знаходзяцца галоўныя святыні хрысціянства.)*

Мусульманам не дазвалялася піць віно, есці свініну. Іслам у сярэдневякоўі забараняў ствараць выявы людзей, жывёл. Таму мастакі дасягнулі асаблівага мастацтва ў арнаменце — выяве мудрагеліста пераплеценых ліній. У Еўропе гэты арнамент так і называлі — *арабеска*.

**3. Росквіт культуры халіфата.** Культура заваёўнікаў-арабаў знаходзілася на больш нізкім узроўні, чым культура пакораных імі народаў. Аднак менавіта ў Арабскім халіфаце ўзнікла новая вялікая культура. Яе называюць ***араба-ісламскай***, і яна была значна вышэйшай, чым культура Заходняй Еўропы таго часу. У чым прычыны гэтага?

Па-першае, вялікая арабская дзяржава аб'яднала многія краіны і народы, гісторыя і культура якіх бралі пачатак у глыбокай старажытнасці: Егіпце, Месапатаміі, Палесціне, Іране, Сярэдняй Азіі. Гаспадарка і навука ў гэтых краінах да часу іх заваявання арабамі дасягнулі высокага ўзроўню развіцця.

Па-другое, арабская мова зрабілася адзінай дзяржаўнай мовай у халіфаце, мовай адукаваных людзей. Гэта значна аблягчыла ўзаемны абмен навуковымі ведамі і дасягненнямі культуры паміж далёкімі раней краінамі.

Па-трэцяе, у Арабскім халіфаце панавала адзіная рэлігія — іслам, якая аб'ядноўвала не толькі арабаў, але і ўсё насельніцтва краіны.

Так у араба-ісламскай культуры зліліся дасягненні культуры розных народаў, аб'яднаныя арабскай мовай і ісламам.

Правообладатель Народная асвета



Інда-арабскія лічбы

**4. Навука, літаратура і мастацтва.** Арабы вельмі любілі і цанілі паэзію. Спачатку паэты больш усхвалялі адвагу воінаў-бедуінаў. Затым усё часцей пачалі пісаць аб прыгажосці прыроды, чалавечых пачуццях. Нямала з іх асуджалі багацце, прагнасць, уладалюбства. На працягу некалькіх стагоддзяў многімі народамі Арабскага халіфата ствараўся вядомы зборнік казак «*Тысяча і адна ноч*». Гэта казкі аб высакародных людзях, аб каханні, аб дзівосных падарожжах, людскіх хітрыках і чараўніках.

Вялікіх дасягненняў у халіфаце дабілася навука. «Найважнейшае ўпрыгажэнне чалавека — веды», — казалі арабскія вучоныя. Арабы стварылі алгебру (па-арабску гэта азначае «лічэнне»). Яны пачалі выкарыстоўваць індыйскія лічбы, якія праз арабаў трапілі ў Еўропу і сталі называцца «*арабскімі*». У Багдадзе, Каіры, Кордаве (на Пірэнейскім паўвостраве) існавалі вышэйшыя навучальныя ўстановы. У вялікіх бібліятэках захоўваліся многія тысячы кніг. Напрыклад, у бібліятэцы Кордавы налічвалася каля 400 тысяч рукапісных кніг.

Архітэктары і будаўнікі халіфата стварылі нямала цудоўных будынкаў, палацаў правіцеляў і мячэцей. Мячэці ўвенчваліся круглым купалам. Унутры будынка была зала з мноствам ажурных калон. Каля мячэці заўсёды будаваўся *мінарэт*. Гэта высокая вежа, з якой веруючых заклікалі да малітвы.

Араба-ісламская культура адыграла важную ролю як у жыцці народаў халіфата, так і ў гісторыі ўсяго чалавецтва. Яна аб'яднала ў сабе культуры многіх народаў. Гэта садзейнічала іх узаемапранікненню і ўзбагачэнню.

**1.** Што з'яўляецца галоўным у ісламе? У што вераць мусульмане? **2.** У чым падабенства і адрозненне ісламу і хрысціянства? **3.** Як іслам уплываў на паўсядзённае жыццё мусульман? **4.** Чаму араба-ісламская культура была значна вышэйшая за культуру Заходняй Еўропы таго часу? **5.** Якія дасягненні араба-ісламскай навукі і культуры ўвайшлі ў сусветную культуру? **6.** Растлумачце значэнне паняццяў: Каран, джыхад, мячэць, Кааба, хадж, арабеска, мінарэт.

Правообладатель Народная асвета

## § 25. Іран і Сярэдняя Азія

**Успомніце: 1.** Якая магутная дзяржава старажытнасці знаходзілася на тэрыторыі Ірана і Сярэдняй Азіі? Які вялікі палкаводзец пакарыў яе? **2.** Калі на Русі ўстанавілася мангола-татарскае іга? **3.** Растлумачце значэнне паняццяў: халіфат, іслам, мусульманін.

**1. Іран і Сярэдняя Азія пасля распаду Арабскага халіфата.** Арабскае заваяванне прывяло да распаўсюджвання ў Іране і Сярэдняй Азіі ісламу і арабскай мовы, але не была забыта і персідская мова. Многія выдатныя дзеячы навукі і культуры Ірана і Сярэдняй Азіі пісалі свае працы як на той, так і на другой мове.

Іран і Сярэдняя Азія са старажытных часоў былі раёнамі арашальнага земляробства. Дзякуючы дамбам і каналам землі заставаліся ўрадлівымі і давалі добрыя ўраджаі. Многія жыхары стэпаў і пустынь займаліся качавой жывёлагадоўляй. Земляробы і жывёлаводы абменьваліся прадуктамі сваёй працы. У гарадах рамеснікі выраблялі высакаякасныя тканіны, цудоўныя дываны, дзіўны посуд і трывалую зброю. Усё гэта карысталася вялікім попытам і ў іншых краінах, куды дабіраліся мясцовыя купцы. Іран і Сярэдняя Азія мелі трывалыя гандлёвыя сувязі з Кітаем, Індыяй, Руссю і Візантыяй.

Пасля распаду Арабскага халіфата ўлада апынулася ў руках мясцовай знаці. Каля сярэдзіны XI ст. Сярэдняя Азія і Іран былі падпарадкаваны сярэднеазіяцкай дынастыяй качэўнікаў *Сельджукідаў*. Заснавальнікам гэтай дынастыі быў ***Сельджук***, які прыняў іслам. Сельджукіды стварылі вялікую дзяржаву, якая распасціралася ад Сярэдняй Азіі да берагоў Міжземнага мора. Але іх дзяржава не была трывалай. Яна распалася праз некалькі дзесяцігоддзяў. У канцы XII ст. у Сярэдняй Азіі ўзвысіліся ўладары ***Харэзма***. Яны падпарадкавалі сабе Сярэднюю Азію і частку Ірана. Дзяржава шахаў Харэзма дасягнула свайго росквіту ў пачатку XIII ст. (**Шах** — *тытул правіцеляў дзяржавы ў шэрагу краін Сярэдняй Азіі і Іране.*)

Правообладатель Народная асвета

**2. Культура Ірана і Сярэдняй Азіі.** Нягледзячы на пастаянныя войны, народы Ірана і Сярэдняй Азіі падарылі чалавецтву ў X—XIII стст. цэлае сузор'е выдатных вучоных, паэтаў і пісьменнікаў.

Сярэднеазіяцкі астраном ***Біруні*** яшчэ ў першай палове XI ст. выказаў думку, што Зямля рухаецца вакол Сонца. Вялікім вучоным у розных навуках быў ураджэнец Бухары ***Ібн Сіна***, якога ў Еўропе называлі ***Авіцэна***. Больш за ўсё ён праславіўся як медык. Сапраўднай энцыклапедыяй па медыцыне стаў яго вялікі твор «*Канон*», над якім Ібн Сіна працаваў шмат гадоў. У «Каноне» ён падрабязна апісаў розныя захворванні, спосабы іх лячэння, разнастайныя лекі. На многія стагоддзі гэты твор Ібн Сіны стаў асноўным падручнікам і дапаможнікам для ўрачоў розных краін свету. Вучыўся па ім на доктара медыцыны і беларускі першадрукар Францыск Скарына.



«Канон» Ібн Сіны, перакладзены на лацінскую мову. *XIV ст.*

Галоўным творам выдатнага іранскага паэта ***Фірдаўсі*** з'яўляецца паэма «*Шахнамэ*» («Кніга цароў»). У ёй расказваецца аб цараванні шахаў Ірана ў часы, калі ісламу ў Іране не ведалі. Але большая частка твора прысвечана не царам, а волатам — змагарам за мірнае жыццё свайго народа.

«Цар філосафаў Усходу і Захаду» — так называлі сучаснікі іранскага вучонага і паэта ***Амара Хаяма***. І сапраўды, цяжка было знайсці чалавека, роўнага яму па ведах у матэматыцы і астраноміі. Ён стварыў новы каляндар, які па дакладнасці перасягаў усе астатнія. Погляды на жыццё і свет Амар Хаям выклаў у сваіх выдатных вершах, якія і цяпер карыстаюцца вялікай папулярнасцю.

Правообладатель Народная асвета

Культура Ірана і Сярэдняй Азіі ў Высокім сярэдневякоўі была адной з самых развітых у свеце. Вучоныя, паэты, пісьменнікі ўнеслі вялікі ўклад у культуру чалавецтва. Іх творы паслужылі асновай для культуры сучасных народаў гэтых краін.



Мініяцюра з «Шахнамэ» Фірдаўсі

**3. Мангольскае нашэсце.** У пачатку XIII ст. адзін з мангольскіх ханаў Чынгісхан аб'яднаў пад сваёй уладай усе мангольскія плямёны. У **1219** г. войска Чынгісхана ўварвалася ў Сярэднюю Азію. На сваім шляху манголы разбуралі арашальныя збудаванні, знішчалі гарады, бязлітасна забівалі людзей, нават немаўлят, рабавалі тое, што было створана цяжкай працай чалавечых рук. Калі які-небудзь горад доўга не здаваўся, манголы пасля яго захопу пачыналі «ўсеагульную разню» — забівалі ўсіх жыхароў. Нярэдка мясцовая знаць, ратуючы свае жыццё і багацце, здавала гарады манголам. Сярэдняя Азія была захоплена манголамі за два гады.

*Гістарычная крыніца*

**З апісання наведвання горада Мерва арабскім пісьменнікам Якутам.** «Палацы сцёртыя з зямлі, як радкі пісьма бываюць сцёртыя з паперы, і гэтыя месцы сталі жыллём соў і варон, у гэтых мясцінах пераклікаюцца злавесныя совы, і вятры стогнуць у залах, паўтараючы самум». Чынгісхана называюць вялікім палкаводцам. *(А якую характарыстыку Чынгісхану далі б вы?)*

Правообладатель Народная асвета

Такі ж бязлітасны лёс напаткаў і іранскія землі. Манголы на чале з унукам Чынгісхана *Хулагу* завяршылі іх заваяванне ў сярэдзіне XIII ст. На захопленых землях Ірана, большай часткі Сярэдняй Азіі Хулагу стварыў асобную мангольскую дзяржаву. Яна варагавала з Залатой Ардой. *(Успомніце, што такое Залатая Арда. Калі і кім яна была ўтворана?)* Частка Сярэдняй Азіі з горадам Самаркандам адышла да нашчадкаў сына Чынгісхана Чагатая. Адзіная вялікая мангольская дзяржава канчаткова распалася да канца XIII ст.

Мангольскія заваёўнікі жорстка прыгняталі мясцовае насельніцтва. Галоўнай іх мэтай было атрымаць як мага больш падаткаў. Ніколі яшчэ Іран і Сярэдняя Азія не ведалі такога разбуральнага прыгнёту, як пры манголах. Падаткі забіралі ў сялян больш чым тры чвэрці сабранага ўраджаю. Часта, даведаўшыся аб набліжэнні збіральнікаў падаткаў, сяляне ўцякалі цэлымі вёскамі. Пры галечы і голадзе большасці насельніцтва ў роскашы жыла мангольская і мясцовая знаць, якая супрацоўнічала з заваёўнікамі.

? **1.** Якія наступствы мела арабскае панаванне для Ірана і Сярэдняй Азіі? **2.** Якія дзяржавы ўзніклі ў Сярэдняй Азіі і Іране ў XI—XII стст.? **3.** Чым праславіліся выдатныя вучоныя і паэты Ірана і Сярэдняй Азіі X—XII стст.? **4.** Раскажыце пра мангольскае нашэсце на Сярэднюю Азію і Іран. **5.** Якія мангольскія дзяржавы ўтварыліся ў Сярэдняй Азіі і Іране? **6.** Чым адрозніваліся заваяванне і панаванне манголаў у Іране ад заваявання і панавання арабаў?

*Гістарычная крыніца*

**Амар Хаям**

Калі безліч дзяржаў пакарыў уладар,
І здалёку, і зблізку забраў сабе ў дар,
Ты ўсё ж бессмяротным ніколі не станеш,
Тры аршыны зямлі — вось што лёс табе даў.

*(Як вы думаеце, ці падабаліся такія вершы Амара Хаяма правіцелям дзяржаў тых часоў?)*

Правообладатель Народная асвета

## § 26. Індыйская цывілізацыя

**Успомніце:** **1.** У даліне якой вялікай ракі ўзнікла першая цывілізацыя на тэрыторыі Індыі? **2.** Якія дасягненні ў культуры мелі народы Індыі ў старажытнасці? **3.** Дайце азначэнне паняццям: варны, індуізм, іслам, будызм.

**1. Гаспадарчае жыццё Індыі.** У пачатку нашай эры ў Індыі жыло шмат народаў і плямёнаў. Стэпы насялялі плямёны ваяўнічых качэўнікаў. А ў непраходных джунглях і высокіх гарах жылі людзі, якія займаліся паляўнічтвам і збіральніцтвам. На найбольш высокім узроўні развіцця знаходзілася насельніцтва старажытных раёнаў земляробства — далін вялікіх рэк Інда і Ганга, прыморскіх тэрыторый. Менавіта тут сфарміраваліся цэнтры індыйскай цывілізацыі і ўтварыліся наймацнейшыя дзяржавы Індыі.

Выкарыстоўваючы штучнае арашэнне, індыйскія сяляне ў пачатку сярэдневякоўя дабіваліся багатых ураджаяў рысу, пшаніцы, ячменю, проса. На ўсходзе краіны збіралі па два-тры ўраджаі ў год. Вырошчвалі цукровы трыснёг, бавоўнік, кавуны, дыні, апельсіны і культуры, з якіх атрымлівалі вострыя прыправы. *(Як вы думаеце, дзе ў пачатку сярэдневякоўя збіралі большыя ўраджаі збожжавых — у Індыі ці ў Еўропе?)*

У Высокім сярэдневякоўі ў Індыі ўзнікла шмат новых гарадоў. Самым вялікім горадам стаў Дэлі. Асноўным заняткам большасці гараджан было рамяство і гандаль. Індыйскія рамеснікі дасягнулі вялікіх поспехаў у апрацоўцы жалеза. У Паўднёвай Індыі навучыліся вырабляць стальную зброю. Адсюль сакрэт яе вытворчасці трапіў на Блізкі Усход да арабаў, а потым стаў вядомы еўрапейцам як «*дамаская сталь*».

Індыйцы навучыліся ствараць і выкарыстоўваць прыгожыя і трывалыя фарбы, якіх не ведалі ў іншых краінах. Многія рамесныя вырабы, асабліва тканіны і ювелірныя ўпрыгажэнні, вывозілі з краіны. Высока цаніліся індыйскія вострыя прыправы і духмяныя рэчывы. У іншых краінах свету Індыю лічылі краінай казачных багаццяў.

Правообладатель Народная асвета



Гопурам. Індуісцкі храм. *X ст.*

**2. Рэлігія і каставы лад.** Будызм, які ўзнік у старажытнасці ў Індыі, паступова страціў сваю папулярнасць на радзіме. У пачатку нашай эры самай распаўсюджанай рэлігіяй у Індыі стаў ***індуізм***. У ім існуе пакланенне мноству багоў. Галоўнымі сярод іх з’яўляюцца *Брахма*, *Вішну* і *Шыва*. *(Успомніце, каму пакланяюцца будысты.)* Для ўшаноўвання сваіх багоў індуісты пабудавалі храмы. Яны і сёння здзіўляюць сваімі велізарнымі памерамі і мноствам скульптурных выяў багоў.

Індуізм асвячаў падзел людзей на ***касты***. Падзел насельніцтва на касты стаў асаблівасцю грамадства сярэдневяковай Індыі. Касты склаліся ў Раннім сярэдневякоўі на аснове чатырох *варн* — галоўных саслоўяў у Старажытнай Індыі. Вышэйшымі лічыліся варны *брахманаў* (жрацоў) і *кшатрыяў* (воінаў-землеўладальнікаў). Ніжэй стаялі варны *вайш’яў* і *шудраў*. У сярэднія вякі асноўным заняткам вайш’яў стаў гандаль, а да шудраў адносілі земляробаў, жывёлаводаў, рамеснікаў. Паступова варны (асабліва ніжэйшыя) раздзяліліся на меншыя групы людзей у залежнасці ад іх роду заняткаў, прафесіі. Такія групы сталі называць *кастамі*. Калі ў старажытнасці індыйскае грамадства падзялялася на чатыры варны, то каст у сярэднія вякі ў Індыі налічвалася ўжо некалькі тысяч.

***Гістарычная даведка***

У людзей кожнай касты існавалі свае правы і абавязкі. Калі рамеснік належаў, напрыклад, да касты ткачоў, то ён павінен быў займацца вырабам тканін і нічым болей. Брахманы і воіны не апрацоўвалі самі свае землі, гэта трэба было рабіць людзям з ніжэйшых каст. І ўсе ў індыйскім грамадстве былі ўпэўнены, што так і павінна быць. Пераходы з адной касты ў іншую забараняліся, як і шлюбы людзей з розных каст. *(Ці можна лічыць, што падзел людзей на варны і касты ў Індыі адпавядаў саслоўнаму падзелу ў Заходняй Еўропе?)*

Правообладатель Народная асвета

**3. Дэлійскі султанат.** З канца X ст. на Паўночную Індыю пачалі нападаць правіцелі мусульманскіх дзяржаў, якія ўзніклі на тэрыторыі Сярэдняй Азіі і Ірана.

Яны жорстка ставіліся да індыйцаў, разбуралі і рабавалі іх гарады, паселішчы і храмы. Пастунова заваёўнікі-мусульмане падпарадкавалі сабе ўсю Паўночную Індыю. У **1206** г. яны стварылі тут дзяржаву на чале з правіцелем горада Дэлі, якога абвясцілі *султанам*. Так узнік ***Дэлійскі султанат***. Дзяржаўнай рэлігіяй у Дэлійскім султанаце стаў іслам. Кіруючая роля ў дзяржаве належала нешматлікай мусульманскай знаці. Гэтыя людзі былі чужыя для мясцовага насельніцтва як па веры, так і па мове. Мясцовае насельніцтва, якое не прымала веры заваёўнікаў, мусульмане называлі *індусамі*. Большая частка індыйцаў засталася прыхільнікамі індуізму.

**4. Навука і культура.** Традыцыі навукі Старажытнай Індыі працягвалі развівацца і з пачаткам сярэдневякоўя.

Вялікую ролю для развіцця сусветнай матэматыкі адыграла стварэнне індыйцамі лічбаў, якімі мы карыстаемся і цяпер. Еўрапейцы назвалі іх не «індыйскімі», а «арабскімі», таму што яны трапілі ў Еўропу з Індыі праз арабаў. Асобае значэнне для матэматыкі мела ўвядзенне паняцця «нуль». *(Успомніце, якімі лічбамі карысталіся старажытныя рымляне.)*

Вялікіх поспехаў у Раннім сярэдневякоўі дасягнулі індыйскія хірургі. Яны ў гэты час былі самымі ўмелымі ў свеце і рабілі складаныя аперацыі нават на чэрапе. Пры аперацыях індыйскія медыкі выкарыстоўвалі больш за 200 хірургічных інструментаў, маглі рабіць абязбольванне.

Стварэнне Дэлійскага султаната прывяло да распаўсюджвання ў Індыі ісламу. З гэтага часу ў індыйскай культуры было дзве плыні — індуская і мусульманская.

Мусульманскі ўплыў яскрава праявіўся ў архітэктуры. З'явіліся новыя формы будынкаў — перш за ўсё мячэці і мінарэты. Яны адрозніваліся ад велічэзных індуісцкіх храмаў лёгкасцю сваіх форм.

Правообладатель Народная асвета



Мінарэт Кутб-Мінар.
*XIII ст.*

***Гістарычная даведка***

Шэдэўрам архітэктуры Індыі стаў мінарэт Кутб-Мінар. Ён быў пабудаваны ў XIII ст. у горадзе Дэлі. Вышыня яго больш за 70 метраў. Гэты будынак паступова звужаецца ўверсе. Ён круглы з бакоў, але гэта акружнасць складаецца з 24 рэбраў-выступаў, упрыгожаных арнаментам.

Культура сярэдневяковай Індыі была шматнацыянальнай. Яна ўвабрала ў сябе дасягненні многіх народаў як Індыі, так і суседніх краін. З іншага боку, яна многае ўнесла ў развіццё культуры ўсяго чалавецтва.

**1.** Назавіце асноўныя заняткі насельніцтва Індыі ў Раннім і Высокім сярэдневякоўі. **2.** Што такое касты? Калі і на якой аснове яны сфарміраваліся? **3.** Калі і на якой тэрыторыі Індыі ўтварыўся Дэлійскі султанат? **4.** Якая рэлігія была дзяржаўнай у Дэлійскім султанаце? Чаму? Чым адрознівалася становішча ў гэтай дзяржаве мусульман і індусаў? **5.** Назавіце найважнейшыя дасягненні навукі і культуры Індыі ў V—XIII стст. Якія з гэтых дасягненняў былі пераняты іншымі народамі?

## § 27. Кітайская цывілізацыя

**Успомніце:** **1.** Калі Кітай стаў адзінай імперыяй? Хто такі Цынь Шыхуандзі? **2.** Якое грандыёзнае збудаванне ён пачаў узводзіць на поўначы краіны для абароны ад уварвання качэўнікаў? **3.** Якія дасягненні культуры Старажытнага Кітая вам вядомы?

**1. Насельніцтва і заняткі.** У VI—XIII стст. кітайская дзяржава па-ранейшаму развівалася ў асноўным ва ўрадлівых далінах рэк Хуанхэ і Янцзы. Тэрыторыя краіны ў гэты перыяд была меншай за сённяшнюю больш чым удвая. Але і тады Кітай быў адной з буйнейшых краін свету. У XI ст. яго насель-

Правообладатель Народная асвета

ніцтва складала больш за 100 млн чалавек. Росту насельніцтва краіны садзейнічала хуткае развіццё земляробства. Здаўна земляробства, галоўным чынам арашальнае, было асноўным заняткам жыхароў Кітая. Як галоўную культуру вырошчвалі рыс. Большасць насельніцтва краіны складалі сяляне-земляробы.

У пачатку VII ст. у Кітаі пачала правіць дынастыя ***Тан***. Сталіцай імперыі Тан з'яўляўся горад Чан'ань. Ён быў пабудаваны паводле адзінага плана і стаў узорам для многіх гарадоў у Кітаі і ў суседніх краінах. Цэнтр горада быў акружаны прамавугольнай абарональнай сцяной з магутнымі вежамі. Прамыя вуліцы дзялілі горад на роўныя кварталы. На ўсходзе, дзе ўзыходзіла сонца, узвышаўся палац імператара. Астатнія гараджане жылі на захадзе сталіцы. Насельніцтва горада ў асноўным займалася рамяством. У сталіцы жыло больш за мільён чалавек, і тады гэта быў самы вялікі горад у свеце.

***Гістарычная даведка***

У Кітаі і іншыя гарады былі мнагалюднымі. У некаторых з іх таксама жыло больш за мільён чалавек. Гарады Еўропы ў параўнанні з імі выглядалі маленькімі, звычайна ў іх жыло некалькі тысяч чалавек, зрэдку — больш за 100 тысяч.

У сталіцы Чан'ань пачынаўся славуты Вялікі шаўковы шлях. Па ім і многіх іншых гандлёвых шляхах з Кітаю вывозіліся дарагія тавары. Шоўк заставаўся асноўным прадметам гандлю кітайскіх купцоў. У Кітаі навучыліся вырабляць ***фарфор***. З яго атрымліваўся прыгожы напаўпразрысты і лёгкі посуд. *(Як вы думаеце, чаму шоўк і фарфор вельмі дорага каштавалі ў Еўропе?)* Жыхарам многіх краін Кітай казаўся краінай казачных багаццяў.

**2. Дзяржаўны лад Кітая.** Вярхоўным правіцелем Кітая быў *імператар*. Са старажытных часоў яго называлі «Сынам Неба». Неба ж кітайцы лічылі вярхоўным бажаствам. Імпе-

Правообладатель Народная асвета



Кітайскі імператар.
*IX ст.*

ратары кіравалі вялікай краінай, абапіраючыся на шматлікіх чыноўнікаў. Яны адказвалі за ўсе бакі жыцця: за збор падаткаў, за грамадскія работы (будаўніцтва каналаў, дамб, дарог, палацаў), за войска, за выкананне людзьмі норм паводзін, за вынясенне судовых прыгавораў. Усіх чыноўнікаў кантралявалі асобыя чыноўнікі — *інспектары*, якія дакладвалі аб парушэннях непасрэдна імператару. Насельніцтва Кітая было падзелена на групы. Яны адрозніваліся сваім месцам у грамадстве, матэрыяльным дабрабытам, правамі, нормамі паводзін і нават сваім адзеннем.

***Гістарычная даведка***

Імператар і яго сям'я мелі права насіць адзенне жоўтага колеру. Гэты колер быў сімвалам зямлі, а яе ўладаром быў толькі «Сын Неба». Усе, нават самыя высокія чыноўнікі, пры наведванні імператара абавязаны былі станавіцца на калені і падаць ніц.

Вышэйшую групу насельніцтва Кітая складала знаць. Гэта былі вельмі багатыя людзі, яны мелі многа зямлі і залежных людзей, якія на іх працавалі. Ніжэй знаходзіліся шматлікія чыноўнікі. Яны таксама былі багатымі, але не такімі, як знаць. У залежнасці ад свайго чына кожны з іх атрымліваў пэўную колькасць зямлі і залежных людзей.

Асноўная маса насельніцтва была падзелена на «добры» і «подлы» народ. Да «добрага» належала большая частка сялян, рамеснікі, гандляры — усе тыя, хто плаціў дзяржаве падаткі. Тыя, хто іх не плаціў, — слугі, рабы — адносіліся да «подлага» народа і былі амаль бяспраўнымі.

Правообладатель Народная асвета

**3. Рэлігія і культура Кітая.** У Кітаі ў V—XIII стст. не было адзінай рэлігіі. Тут існавалі тры галоўныя рэлігіі: ***канфуцыянства***, ***будызм*** і ***даасізм***.

Канфуцыянства прыйшло яшчэ са старажытнасці. *(Успомніце, чаму вучыў Канфуцый.)* Будызм распаўсюдзіўся з Індыі ў Кітай не ў сваім першапачатковым выглядзе. У адрозненне ад ранняга будызму Буда ўжо лічыўся не настаўнікам або святым, а Богам. Пакланенне яму стала пышным, з мноствам урачыстых працэсій, абрадаў. Колькасць свяшчэннаслужыцеляў значна павялічылася. У Кітаі былі пабудаваны раскошныя будыйскія храмы, вялізныя манастыры.

Даасізм быў чыста кітайскай рэлігіяй. Ён прыцягваў тым, што ўключыў у сябе многія старажытныя вераванні і абрады кітайцаў. Даасізм захаваў веру ў мноства духаў і багоў, у тым ліку грозных і магутных драконаў.

Большасць кітайцаў малілася ў храмах усіх трох рэлігій. Гэта было асаблівасцю рэлігійнага жыцця Кітая. Нават нягледзячы на тое, што некаторыя імператары падтрымлівалі якую-небудзь адну рэлігію і прыгняталі іншыя.

У V—XIII стст. кітайскі народ стварыў вялікую культуру, якая пераўзыходзіла дасягненні культуры многіх іншых краін свету. «*Залатым векам*» кітайскай паэзіі называюць VIII ст. Тады выдатныя паэты ***Лі Бо*** і ***Ду Фу*** стварылі мноства шэдэўраў, якія ўвайшлі ў скарбніцу лепшых твораў усяго чалавецтва.

***Гістарычная даведка***

Лі Бо з юнацтва марыў аб тым, як дапамагчы людзям. Ён адмовіўся ад чыноўніцкай службы, пакінуў дом і да сарака гадоў вандраваў па краіне. Лі Бо пісаў такія цудоўныя вершы, што, прачытаўшы іх, імператар выклікаў яго да сябе і прысвоіў паэту ганаровае званне. У вершах Лі Бо апяваў радасці жыцця, добрыя чалавечыя пачуцці, прыгажосць прыроды.

Сучаснікам вялікіх паэтаў быў вядомы мастак ***Ван Вэй***. Ён маляваў свае цудоўныя пейзажы на шоўку. Творы мастака па-

Правообладатель Народная асвета



Старонка друкаванай кнігі. *X ст.*

казваюць небывалае хараство гор, рэк, раўнін, лясоў краіны.

Кітайская культура V—XIII стст. была адной з самых развітых у свеце. Многія найважнейшыя адкрыцці ўпершыню былі зроблены менавіта кітайцамі. Яшчэ ў першай палове VIII ст. у Кітаі пачала выдавацца першая ў свеце газета «Сталічны веснік». *(Успомніце, калі ў Кітаі навучыліся вырабляць паперу.)* Спачатку яна была рукапіснай. Потым пачала друкавацца з дапамогай неразборнага шрыфту. Тэкст выразаўся на драўляных дошках, намазваўся фарбай. Затым да дошак прыціскалі паперу, і тэкст адбіваўся на ёй. Такім жа спосабам друкаваліся і кнігі. У XI ст. быў вынайдзены *разборны шрыфт*. Еўрапейцы ж вынайшлі кнігадрукаванне толькі праз некалькі стагоддзяў. *(Успомніце, якімі знакамі пісьма карысталіся кітайцы.)*

**4. Кітай і качэўнікі.** У пачатку X ст. імперыя Тан пала. Ізноў у Кітаі пачаліся ўнутраныя разлады. Узмацнілася пагроза з боку качэўнікаў, якія жылі на поўнач і захад ад Кітая. Багацці земляробчай краіны вабілі іх, і яны часта нападалі на Кітай. Яшчэ ў старажытнасці для абароны ад качэўнікаў кітайцы пабудавалі на сваіх паўночных граніцах Вялікую Кітайскую сцяну. Але і гэта сцяна не выратоўвала, асабліва калі кітайская дзяржава аслабевала. На працягу Ранняга і Высокага сярэдневякоўя Кітай пастаянна падвяргаўся нашэсцям качэўнікаў.

Самым небяспечным і разбуральным для Кітая стала мангольскае нашэсце. Манголы ўварваліся ў кітайскія землі ў самым пачатку XIII ст. Ад іх рук загінулі мільёны жыхароў. Але Кітай, у адрозненне ад многіх іншых краін, вельмі доўга супраціўляўся манголам. Яны заваёўвалі яго амаль 70 га-

Правообладатель Народная асвета

доў. Толькі ў **1279** г. манголы ўстанавілі сваё панаванне над краінай. Мангольскае ўладаранне стала бедствам для Кітая. Было знішчана шмат гарадоў, паселішчаў, разбурана дамб і каналаў.

Мангольскі вялікі хан ***Хубілай*** перанёс сваю сталіцу з Манголіі ў Кітай. Ёю быў абраны горад на поўначы Кітая, па суседству са стэпам. Ён атрымаў назву *Пекін*. Хубілай прыняў тытул імператара і пачаў кіраваць паводле кітайскіх традыцый. Многія манголы перасяліліся ў Кітай.

**1.** Раскажыце аб насельніцтве Кітая і яго занятках у пачатку сярэдневякоўя. **2.** Якую ролю ў кітайскай дзяржаве і грамадстве VII—XIII стст. адыгрывалі чыноўнікі? Чаму ў феадальнай Еўропе чыноўнікаў было значна менш, чым у Кітаі таго часу? **3.** Якія рэлігіі былі распаўсюджаны ў Кітаі ў V—XIII стст.? У чым іх адрозненні? **4.** Назавіце найважнейшыя дасягненні кітайскай культуры V—XIII стст. **5.** Раскажыце аб заваяванні Кітая манголамі. **6.** Растлумачце значэнне паняццяў: даасізм, інспектар, фарфор.

**Вынаходствы ў Кітаі і Еўропе**

| Вынаходствы | Стагоддзі, гады | |
|---|---|---|
| | Кітай | Еўропа |
| Шоўк | II тыс. да н.э. | VI ст. |
| Арбалет | IV ст. да н. э. | XII ст. |
| Чыгун | Каля 500 г. да н. э. | XIV ст. |
| Папера | Каля 100 г. да н. э. | XI ст. |
| Фарфор | IV ст. | XVI ст. |
| Разборны шрыфт | 1041 г. | 1445 г. |

*(Ці можна сцвярджаць, што кітайская цывілізацыя ў V—XIII стст. апярэджвала ў сваім развіцці заходнееўрапейскую цывілізацыю?)*

Правообладатель Народная асвета

## § 28. Японская цывілізацыя

**Успомніце:** **1.** Якія вядомыя вам дзяржавы Азіі заваявалі манголы? **2.** Дайце азначэнне паняццям: іерогліф, дружына, сеньёр, васал, феадал, рыцар.

**1. Утварэнне Японскай дзяржавы.** ***Японія*** — краіна на Далёкім Усходзе, якая складаецца з чатырох буйных і больш як чатырох тысяч малых астравоў. Гэтыя астравы ў асноўным гарыстыя. Здаўна жыхары Японіі выкарыстоўвалі кожны куток зямлі, прыдатны для земляробства. Догляд пасеваў патрабаваў выключнай працавітасці. Рыс — галоўная культура, якую вырошчвалі японскія земляробы.

Каля сярэдзіны I тысячагоддзя н. э. узнікла японская дзяржава. Яна ў хуткім часе пачала называцца «*Ніпон*», што азначае «***Краіна ўзыходзячага сонца***». Японцы і цяпер так называюць сваю краіну.

На чале дзяржавы стаяў *імператар*. З роду, да якога ён належаў, у далейшым паходзілі амаль усе імператары Японіі. Манарх кіраваў краінай, абапіраючыся на вялікую колькасць чыноўнікаў. Уся зямля ў дзяржаве ў Раннім сярэдневякоўі з'яўлялася ўласнасцю імператара. Кожны селянін атрымліваў надзел зямлі ад імператара і за гэта павінен быў плаціць яму падаткі. Чыноўнікі атрымлівалі свае вялікія надзелы за службу, але іх апрацоўвалі сяляне.

У X ст. такі парадак уладання зямлёй змяніўся. Знаць, буйныя чыноўнікі сталі самі перадаваць свае надзелы ў спадчыну. Гэтыя землі былі ператвораны ў іх уласнасць. У сваіх маёнтках такі ўласнік быў поўным гаспадаром. Сяляне цяпер працавалі толькі на яго, а падаткі дзяржаве не плацілі. Уладальнікі зямель самі чынілі суд і расправу над залежнымі ад іх сялянамі. Так у Японіі сфарміравалася пазямельная і асабістая залежнасць сялян.

На ўладальнікаў невялікіх маёнткаў часта нападалі моцныя суседзі. Каб усцерагчы свае ўладанні, яны пераходзілі пад абарону буйных уласнікаў і станавіліся іх васаламі. Такім

Правообладатель Народная асвета

чынам складваліся адносіны сеньёр — васал. Японія ў Высокім сярэдневякоўі стала адзінай нееўрапейскай краінай, дзе сфарміраваліся феадальныя адносіны.

**2. Самураі.** Буйныя феадалы мелі свае войскі. Спачатку гэта былі дружыны. Набіралі дружыннікаў пераважна з заможных сялян. Дружыннікаў з цягам часу сталі называць ***самураямі*** («тыя, хто служаць гаспадару»). Пазней такім дружыннікам буйныя феадалы за іх службу пачалі раздаваць зямельныя надзелы з сялянамі. Так самураі з дружыннікаў станавіліся васаламі сваіх гаспадароў. З гэтага часу яны забяспечваліся не часткай здабычы і прадуктамі ад гаспадара, а працай залежных сялян на атрыманых надзелах.

У Японіі самураі складалі асобны слой насельніцтва. Галоўным іх абавязкам была ваенная справа. Толькі самураі маглі насіць зброю.

У самураяў былі свае правілы паводзін. Згодна з імі кожны самурай павінен быў свята захоўваць вернасць свайму гаспадару. Гэта з'яўлялася самым галоўным абавязкам. Ад самурая патрабавалася быць храбрым, адважным, а таксама дасканала валодаць воінскім майстэрствам. Нормамі паводзін для самурая былі сумленнасць і шчырасць, устрыманасць, пагарда да ўласнай выгады.

Гонар у самураяў цаніўся даражэй за жыццё. Ганьбай лічылася збегчы з поля бою, здацца ў палон або не адпомсціць таму, хто пакрыўдзіў яго гаспадара. Калі гэта адбывалася, то самурай выконваў абрад самазабойства — *харакіры*.

***Гістарычная даведка***

Харакіры па-японску значыць «рэзаць жывот». Жывот, паводле ўяўленняў японцаў, быў тым месцам, дзе знаходзілася душа чалавека. У час правядзення абраду самураю належала быць абсалютна спакойным: на яго твары не павінны былі з'явіцца якія-небудзь прыметы таго страшнага болю, што ён адчуваў. Інакш — ганьба, і не толькі для самога самурая, але і для яго патомкаў. *(Як вы думаеце, чаму еўрапейскія рыцары пры пагрозе палону не рабілі самазабойства?)*

Правообладатель Народная асвета



Сёгун і самурай.
*Японская мініяцюра*

Самураі лічылі нікчэмнымі заняткамі працу на зямлі, рамесніцтва, гандаль. Яны зняважліва ставіліся да рамеснікаў, купцоў, сялян, якія складалі большасць насельніцтва Японіі.

Устанаўленне ў Японіі феадальных адносін прывяло да аслаблення імператарскай улады і міжусобіц. Абапіраючыся на самураяў, у канцы XII ст. уладу ў краіне захапіў буйны феадальны род ***Мінамота***. Яго галава абвясціў сябе ваенным правадыром — ***сёгунам***. З гэтага часу яму стала належаць уся ўлада ў краіне. Хаця імператарская дынастыя працягвала існаваць — яна ж лічылася свяшчэннай. Галоўнай апорай сёгуна былі самураі, а сам ён быў абвешчаны «першым самураем».

**3. Барацьба з мангольскім нашэсцем.** У другой палове XIII ст. на Японію напалі манголы. Іх вялікая армія дабралася да паўднёвых японскіх астравоў на караблях, захопленых у кітайцаў і карэйцаў. Самураі самааддана змагаліся з манголамі. Яны не мелі права адступіць і знясславіць сябе. Сустрэўшы моцнае супраціўленне, манголы вымушаны былі вярнуцца назад.

Праз некалькі гадоў мангольскі флот зноў з'явіўся каля берагоў Японіі. Сілы былі няроўныя — манголаў было значна больш. Але ў апошні момант амаль увесь флот манголаў знішчыў тайфун. Японцы вырашылі, што ім дапамаглі багі, і з таго часу ўшаноўваюць *камікадзе* — «боскі вецер». Так японцы здолелі адстаяць сваю незалежнасць у барацьбе з манголамі. І ўвогуле, Японія была адной з нямногіх краін сярэдневякоўя, якую нікому не ўдалося пакарыць.

Правообладатель Народная асвета

**4. Рэлігія і культура.** Яшчэ са старажытных часоў японцы мелі сваю рэлігію — ***сінтаізм*** («сінта» па-японску азначае «шлях багоў»). Прыхільнікі гэтай рэлігіі лічаць, што свайго духа або бога мае ўсё на свеце: горы, расліны, з'явы прыроды, кожная рэч і г. д. Галоўным богам сінтаізму лічылася багіня Сонца, ад яе вёў свае паходжанне імператарскі род. Яе выявы ў выглядзе чырвонага дыска Сонца ёсць і на сучасным сцягу Японіі.

*Гістарычная даведка*

Японцы адносіліся з глыбокай павагай да бога самай высокай гары Японіі — Фудзіямы. Яны таксама ўшаноўвалі іншых багоў — *камі*. Японцы лічылі, што ўбачыць такіх багоў немагчыма. Не ўяўлялі яны іх і падобнымі на чалавека. Таму ў сінтаісцкіх храмах няма выяў багоў. На стужках тканіны або паперы напісаны толькі імёны тых багоў, якім прысвечаны храм. А часам свяшчэннае месца проста акружана вяроўкай. *(Ці можна сказаць, што сінтаізм — гэта разнавіднасць язычніцтва?)*

У Раннім сярэднявякоўі ў Японіі з'явіўся будызм. Ён не выцесніў сінтаізм. З таго часу японцы з'яўляюцца прыхільнікамі адразу дзвюх рэлігій. Са з'яўленнем будызму ў Японіі пачалі будаваць шмат цудоўных храмаў. Японскія скульптары стварылі мноства выяў Буды. Некаторыя з іх дасягалі вышыні больш за 20 метраў.



Статуя Буды ў Японіі. *XIII ст.*

Вялікі ўплыў на японскую культуру аказала культура Кітая. Японскія *пісьменнікі* спачатку выкарыстоўвалі кітайскую мову і пісьменнасць. Потым была створана *японская іерагліфічная* пісьменнасць. Даволі рана ў Японіі з'явілася кнігадрукаванне. Яно было запазычана з Кітая і Карэі.

Правообладатель Народная асвета

У VIII ст. быў створаны зборнік вершаў японскіх паэтаў «*Мірыяды пялёсткаў*». У ім сабраны чатыры з паловай тысячы вершаў, у якіх апісана хараство прыроды. З цягам часу з'явілася і *самурайская паэзія*, дзе ўсхваляўся гераізм воінаў-самураяў.

**1.** Калі ўзнікла японская дзяржава? Як яе называюць японцы? **2.** Калі і як у Японіі сфарміраваліся феадальныя адносіны? **3.** Хто такія самураі? Раскажыце пра іх. **4.** Чаму манголы не здолелі пакарыць Японію? **5.** Што такое сінтаізм? Чаму японцы з Ранняга сярэдневякоўя з'яўляюцца прыхільнікамі адразу дзвюх рэлігій — сінтаізму і будызму? **6.** Раскажыце аб развіцці японскай культуры ў V—XIII стст.

## § 29. Цывілізацыі Трапічнай Афрыкі і Амерыкі

**Успомніце:** **1.** Якія дзяржавы існавалі ў старажытнасці на поўначы Афрыкі? **2.** Якое з «сямі цудаў свету» ў старажытнасці звычайна называлася першым? **3.** Хто такія альмекі?

**1. Асноўныя цывілізацыі Трапічнай Афрыкі.** Трапічнай Афрыкай прынята называць тую частку Афрыканскага кантынента, якая знаходзіцца на поўдні ад вялікай пустыні Сахары. Аб цывілізацыях Трапічнай Афрыкі еўрапейцы доўгі час нічога не ведалі.

Развіццё народаў Трапічнай Афрыкі ішло неаднолькава. У Раннім сярэдневякоўі цывілізацыі склаліся тут толькі ў асобных рэгіёнах. Гэта былі тэрыторыі па цячэнні ракі Нігер, каля возера Чад, землі сучаснай Эфіопіі. Паміж імі распасціраліся вялізныя прасторы джунгляў, стэпаў, пустынь, дзе людзі жылі яшчэ ва ўмовах першабытнага ладу.

Большасць насельніцтва Трапічнай Афрыкі займалася земляробствам. Вырошчваліся збожжавыя расліны, бабы, цукровы трыснёг, бавоўнік, садавіна. *(Успомніце, якія культуры вырошчвалі жыхары сярэдневяковай Еўропы.)*

Афрыканскія рамеснікі навучыліся выплаўляць жалеза, здабывалі і па-майстэрску апрацоўвалі медзь, бронзу, золата,

Правообладатель Народная асвета

выраблялі зброю, тканіны, посуд, шкляныя і скураныя рэчы. Мастакі і скульптары стваралі з абпаленай гліны і бронзы цудоўныя статуэткі людзей, маскі для рэлігійных абрадаў.

Афрыканцы, якія жылі ўздоўж цячэння ракі Нігер, гандлявалі з арабамі Паўночнай Афрыкі. Галоўным таварам, што завозілі арабы, была каменная соль. Яе абменьвалі на золата, і звычайна яна цанілася даражэй за гэты высакародны метал. Караваны арабскіх купцоў пераадольвалі цяжкі шлях праз пустыню Сахара, далей тавары перавозілі на лодках па Нігеры.

*Гістарычная даведка*

Арабскіх купцоў не пускалі ў тыя месцы, дзе здабывалася золата. Звычайна гандаль адбываўся такім чынам: арабскія купцы пакідалі свой тавар ва ўмоўленым месцы і адыходзілі, каб не бачыць афрыканцаў. Тыя, у сваю чаргу, клалі каля тавару пэўную колькасць золата. Калі арабаў задавальняла плата за соль, то яны забіралі золата і пакідалі свой тавар. У выпадку, калі плата здавалася ім недастатковай, яны зноў адыходзілі, а афрыканцы дабаўлялі яшчэ золата. Такі спосаб гандлю быў вядомы яшчэ са старажытных часоў, і яго называлі «нямым» гандлем. *(Як вы думаеце, чаму паміж арабамі і афрыканцамі існаваў менавіта такі спосаб гандлю?)*

Найбуйнейшымі дзяржавамі ў басейне ракі Нігер былі ***Гана*** і ***Малі***. Яны ўзніклі ў VIII ст. Да канца XI ст. кантроль за гандлем з арабамі Паўночнай Афрыкі належаў Гане. Але затым правіцелі Малі падпарадкавалі сабе Гану. Ад арабаў у гэтых дзяржавах быў запазычаны іслам. Гэтую ж рэлігію прынялі і цары дзяржавы ***Канем***, якая ўзнікла ў VIII ст. каля возера Чад.



Статуэткі багіні ўрадлівасці. Гана.

Існавала ў сярэдневяковай Афрыцы і хрысціянская краіна — ***Эфіопія***. Яшчэ ў старажытнасці на яе тэрыторыі ўтвары-

Правообладатель Народная асвета

лася дзяржава. Яе правіцель у IV ст. прыняў хрысціянства. Войны з мусульманамі Аравійскага паўвострава аслабілі краіну, і ў X ст. яна распалася. Але праз два стагоддзя эфіопская хрысціянская дзяржава адрадзілася.

Аднак большасць насельніцтва Афрыкі верыла ў мноства багоў, якія ўвасаблялі ў сабе сілы прыроды, сонца, месяца. Багамі лічылі і продкаў правіцеляў. *(Успомніце, як называецца вера ў мноства багоў.)*

У афрыканскіх цывілізацыях не сфарміраваліся феадальныя адносіны. Сяляне жылі абшчынамі з іх натуральнай гаспадаркай. Унутраны гандаль быў развіты слаба. Магутнасць і багацце правіцеляў дзяржаў забяспечваліся іх кантролем над знешнім гандлем і здабычай золата, падаткамі з заваяванага насельніцтва і арміямі з рабоў і наёмнікаў.

**2. Амерыканскія цывілізацыі.** Як і ў старажытнасці, найбольш развітыя амерыканскія цывілізацыі Ранняга і Высокага сярэдневякоўя ўзнікалі ў Цэнтральнай Амерыцы. Гэта была адна з найстаражытнейшых зон земляробства, якое з'яўлялася галоўным заняткам мясцовага насельніцтва. Тут стварылі свае цывілізацыі ***майя***, ***тальтэкі***, ***сапатэкі***. Самай развітой з іх была цывілізацыя майя.

***Гістарычная даведка***

Ад майя да нашых дзён захаваліся не толькі рэчавыя помнікі, але і пісьмовыя. Гэта кнігі з іерогліфамі, напісанымі на паперы, выраблены з кары фікуса. Вучоныя здолелі расшыфраваць пісьменнасць майя. Гэта дазволіла даведацца аб жыцці народа значна болей, чым аб іншых цывілізацыях Амерыкі, якія не пакінулі такіх помнікаў.

Ранняе сярэдневякоўе было часам росквіту цывілізацыі майя. У непраходных джунглях яны расчышчалі землі для пасеваў, будавалі гарады. Галоўнай культурай майя была кукуруза, вырошчвалі таксама фасоль, памідоры, востры перац, бавоўнік, какаву, садавіну. Цяглавых жывёл не было. Зямлю апрацоўвалі ўручную.

Правообладатель Народная асвета

Майя стварылі мноства гарадоў-дзяржаў. У гарадах жылі правіцелі і жрацы, чыноўнікі, а таксама рамеснікі і купцы. Астатняе насельніцтва пражывала ў вёсках каля сваіх палеткаў і ў горадзе з'яўлялася толькі тады, калі здараліся важныя рэлігійныя святы. Правіцелямі дзяржаў былі людзі са знатных радоў. Калі ў часы войн правячы род гінуў, то дзяржава спыняла сваё існаванне, а горад пусцеў.



Піраміда-храм у Тыкале. *XII ст.*

Значную ролю ў жыцці майя адыгрывалі жрацы. Яны вялі назіранні за небам, ведалі размяшчэнне планет і зорак, маглі прадказаць сонечныя зацьменні, выконвалі шматлікія рэлігійныя абрады. Складаныя для земляробства прыродныя ўмовы патрабавалі стварэння дакладнага календара.

***Гістарычная даведка***

У календары майя было 365 дзён. 18 месяцаў уключалі ў сябе па 20 дзён, а дадатковыя 5 дзён лічыліся нешчаслівымі. Таму ў гэтыя апошнія дні кожнага года жрацы выконвалі мноства абрадаў, каб задобрыць шматлікіх багоў, прыносілі ім ахвяры.

Майя ўзводзілі вялізныя ступеньчатыя піраміды, на вяршынях якіх знаходзіліся храмы багам. *(Успомніце, у якой краіне ў старажытнасці таксама будавалі піраміды.)* Яшчэ ў пачатку I тысячагоддзя н. э. майя стварылі сваю іерагліфічную пісьменнасць.

У X ст. з паўночнага захаду прыйшлі заваёўнікі *тальтэкі* і ўтварылі дзяржаву на тэрыторыі сучаснай Мексікі. Дзяржава тальтэкаў існавала да канца XII ст. Пасля яе краху майя зноў

Правообладатель Народная асвета

сталі ствараць свае дзяржавы. Але цяпер яны ўключалі не адзін, а некалькі дзесяткаў гарадоў.

На захад ад майя яшчэ ў старажытнасці стварылі сваю цывілізацыю *сапатэкі*. Свайго росквіту яна дасягнула ў Раннім сярэдневякоўі. Таксама, як і майя, сапатэкі вынайшлі сваю іерагліфічную пісьменнасць. Яна захавалася на каменных манументах, але вучоныя пакуль не здолелі яе расшыфраваць.

Амерыканскія цывілізацыі Ранняга і Высокага сярэдневякоўя існавалі ў ізаляцыі ад цывілізацый іншых частак свету. Яны развіваліся самастойна. Феадальныя адносіны ў іх не склаліся. Жыхары Амерыкі не ведалі выплаўкі жалеза, колавых павозак, плуга, ганчарнага круга. У той жа час яны вырошчвалі культуры, якія былі невядомыя ў Еўропе: кукурузу, бульбу, памідоры, какаву і інш. Рамеснікі ўмелі апрацоўваць золата, серабро, рабіць бронзу, а з яе — прылады працы і зброю. Народам майя былі ўзведзены вялізныя і прыгожыя збудаванні з каменю.

**1.** Раскажыце аб занятках насельніцтва Трапічнай Афрыкі ў V—XIII стст. **2.** Якія дзяржавы склаліся ў Трапічнай Афрыцы ў Раннім сярэдневякоўі? **3.** Якія рэлігіі існавалі ў народаў Трапічнай Афрыкі? **4.** Якія цывілізацыі Ранняга і Высокага сярэдневякоўя склаліся ў Амерыцы? **5.** У чым заключалася адрозненне дзяржаў майя да і пасля тальтэкскага заваявання? **6.** Назавіце найважнейшыя дасягненні культуры майя.

## *АБАГУЛЬНЕННЕ ДА РАЗДЗЕЛА III*

## Цывілізацыі Азіі, Афрыкі і Амерыкі ў V—XIII стст.

У гэтым раздзеле вы пазнаёміліся з сярэдневяковымі цывілізацыямі Азіі, Афрыкі і Амерыкі V—XIII стст. Іх развіццё значна адрознівалася ад развіцця еўрапейскіх цывілізацый. Калі ў Еўропе ў Высокім сярэдневякоўі панавалі феадальныя адносіны, то за яе межамі такія адносіны склаліся толькі ў Японіі.

Правообладатель Народная асвета

У дзяржавах Азіі манарх меў неабмежаваную ўладу. У многіх з іх існавала дзяржаўная ўласнасць на зямлю. Адзіным і вярхоўным уласнікам усёй зямлі ў дзяржаве лічыўся манарх. Усе людзі атрымлівалі ад яго землі за выкананне пэўных абавязкаў: ваенных, чыноўніцкіх, а сяляне павінны былі аддаваць яму частку сабранага з надзелаў ураджаю. Неабмежаваная ўлада манарха абапіралася на вялікі чыноўніцкі апарат для кантролю над усёй краінай. А ў Еўропе феадалы самі кіравалі насельніцтвам у сваіх уладаннях: судзілі, збіралі аброк, прымушалі працаваць на паншчыне. Там вялікай колькасці чыноўнікаў не патрабавалася. Каралеўская ўлада ў еўрапейскіх дзяржавах была слабай.

Азіяцкія цывілізацыі мелі гаспадарчыя, культурныя сувязі паміж сабой, а шмат якія і з Еўропай. Аднак не ўсе іх дасягненні ў Раннім і Высокім сярэдневякоўі сталі здабыткам іншых народаў. Напрыклад, кнігадрукаванне, якое ўпершыню з'явілася ў Кітаі. Цывілізацыі Трапічнай Афрыкі мелі сувязі толькі з арабамі Паўночнай Афрыкі. А пра цывілізацыі Амерыкі наогул нічога не ведалі на іншых кантынентах.

У цэлым у Раннім і Высокім сярэдневякоўі Еўропа значна саступала ў сваім развіцці такім краінам Азіі, як Кітай, Індыя, Іран, Арабскі халіфат, Японія. Узровень земляробства, рамяства, гандлю, культуры быў у іх значна вышэйшы.

## Пытанні і заданні

Расстаўце падзеі ў храналагічным парадку: 1. Узнікненне дзяржавы Гана. 2. Мангольскае ўварванне ў Сярэднюю Азію. 3. Устанаўленне ў Кітаі праўлення дынастыі Тан. 4. Нашэсце тальтэкаў на майя. 5. Вынаходства разборнага шрыфту для кнігадрукавання ў Кітаі. 6. Распад Арабскага халіфата. 7. Устанаўленне ў Японіі ўлады сёгуна з роду Мінамота.

Правообладатель Народная асвета

Успомніце, якія важныя падзеі ў гісторыі цывілізацый Азіі адбыліся ў: 622 г., 630 г., 1206 г., 1219 г., 1279 г.

Да гісторыі якіх краін Ранняга і Высокага сярэдневякоўя адносяцца наступныя паняцці: касты, сёгун, халіф, самурай, даасізм, індуізм, сінтаізм?

У якіх частках свету размяшчаліся гэтыя дзяржавы: Арабскі халіфат, Дэлійскі султанат, Японія, Гана, Эфіопія, Кітай, гарады-дзяржавы майя, Малі?

Запоўніце табліцу.

| Дзяржава | Рэлігіі |
|---|---|
| Індыя | |
| Кітай | |
| Японія | |
| Арабскі халіфат | |

Дайце разгорнутыя адказы на пытанні: Як паўплывала мангольскае заваяванне на развіццё Кітая, Сярэдняй Азіі і Ірана? Які ўплыў аказаў іслам на развіццё архітэктуры і выяўленчага мастацтва? Чаму многія важныя вынаходствы, зробленыя ў Кітаі, у V—XIII стст. заставаліся невядомымі ў Еўропе? Якія агульныя рысы былі характэрныя для развіцця сельскай гаспадаркі Кітая і Японіі?

Параўнайце і ўкажыце агульныя рысы і адрозненні: дзяржаўнага ладу Японіі і Кітая, культуры Арабскага халіфата і Індыі, грамадскіх адносін цывілізацый Трапічнай Афрыкі і Амерыкі.

Карыстаючыся атрыманымі ведамі, складзіце кароткі расказ на тэмы: «Базар у буйным горадзе Ірана», «Самураі ў баі з манголамі», «Развіццё навукі ў Іране і Індыі».

Правообладатель Народная асвета

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

## РАННЯЕ І ВЫСОКАЕ СЕРЭДНЕВЯКОЎЕ Ў ГІСТОРЫІ ЧАЛАВЕЦТВА

У 6-м класе вы вывучалі гісторыю цывілізацый двух перыядаў сярэдневякоўя — Ранняга і Высокага. Цывілізацыі таго часу сфарміраваліся і развіваліся ў Еўропе, Азіі, Афрыцы, Цэнтральнай Амерыцы. Адны з іх мелі карані яшчэ ў старажытнасці, напрыклад кітайская, індыйская, візантыйская. Іншыя склаліся толькі з наступленнем эпохі сярэдневякоўя — араба-ісламская, японская, цывілізацыі Трапічнай Афрыкі. Развіццё цывілізацый у V—XIII стст. ішло нераўнамерна. У Еўропе, напрыклад, усходнееўрапейская цывілізацыя, асновай якой была Візантыя, тады апярэджвала ў сваім развіцці заходнееўрапейскую цывілізацыю. У Азіі лідэрамі былі кітайская, індыйская, араба-ісламская цывілізацыі, у Амерыцы — цывілізацыя майя.

У V—XIII стст. людзі асвоілі новыя вялізныя тэрыторыі, зрабілі іх заселенымі. Але цывілізацыі існавалі не ўсюды, у многіх кутках Азіі, Афрыкі, Амерыкі, Аўстраліі людзі яшчэ жылі ва ўмовах першабытнага ладу. І шмат якія цывілізацыі існавалі быццам астравы сярод тэрыторый, населеных першабытнымі плямёнамі. Сувязі паміж цывілізацыямі розных кантынентаў заставаліся слабымі, як і ў старажытнасці. Гэта значыць развіццё цывілізацый было ачаговым. Іх гістарычны лёс не быў так цесна ўзаемазвязаны, як цяпер. Кожная з цывілізацый V—XIII стст. мела свае асаблівасці ў гаспадарчым развіцці, арганізацыі грамадства, дзяржаўным ладзе, у культуры, рэлігіі.

Аднак у Раннім і Высокім сярэдневякоўі ў асноўным сфарміраваліся тэрыторыі многіх сучасных краін. У IX ст. узнікла Старажытнаруская дзяржава — агульная радзіма продкаў ця-

Правообладатель Народная асвета

перашніх беларусаў, рускіх, украінцаў. Многія сучасныя гарады былі заснаваны ў Раннім і асабліва ў Высокім сярэдневякоўі.

Было зроблена шмат важных адкрыццяў і вынаходак, якія сталі для нас ужо звыклымі. Тады ўзніклі пісьменнасці многіх народаў, у тым ліку і славянскіх. У Заходняй Еўропе былі створаны першыя універсітэты, у Англіі з'явіўся парламент.

У Высокім сярэдневякоўі Усход усё яшчэ заставаўся для жыхароў Заходняй Еўропы «краінай казачных багаццяў». Аднак тэмпы развіцця заходнееўрапейскай цывілізацыі паскорыліся. А ў Познім сярэдневякоўі яна імкліва выходзіць наперад. Як гэта адбывалася, вы даведаецеся ў наступным класе.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

# АСНОЎНЫЯ ПАДЗЕІ

## Ранняга і Высокага сярэдневякоўя

| Стагодзе | Заходняя Еўропа і Візантыя | Славянскія краіны | Цывілізацыі Азіі, Афрыкі і Амерыкі |
|---|---|---|---|
| **V** | **476 г.** Падзенне Заходняй Рымскай імперыі<br>**Канец V ст.** Узнікненне Франкскай дзяржавы | | |
| **VI** | **Сярэдзіна VI ст.** Росквіт Візантыі<br>Праўленне імператара Юстыніяна (527—565 гг.) | | |
| **VII** | | **681 г.** Утварэнне Першага Балгарскага царства | **622 г.** Перасяленне Мухамеда з Меккі ў Медыну<br>**VII ст.** Утварэнне Арабскага халіфата |
| **VIII** | **Пачатак VIII ст.** Арабскае заваяванне Пірэнейскага паўвострава<br>**800 г.** Абвяшчэнне Карла Вялікага імператарам | | **VIII ст.** Утварэнне дзяржаў Гана, Малі, Канем<br>**VIII ст.** «Залаты век» кітайскай паэзіі |

Народная асвета
Правообладатель Народная асвета

*Працяг*

| Стагодзе | Заходняя Еўропа і Візантыя | Славянскія краіны | Цывілізацыі Азіі, Афрыкі і Амерыкі |
|---|---|---|---|
| IX | **843 г.** Распад Франкскай імперыі | **863 г.** Пачатак дзейнасці Кірыла і Мяфодзія ў Вялікай Маравіі<br>**882 г.** Утварэнне Старажытнарускай дзяржавы | **IX ст.** Росквіт Арабскага халіфата<br>**Канец IX ст.** Распад Арабскага халіфата |
| X | **962 г.** Утварэнне Свяшчэннай Рымскай імперыі<br>**X—XI стст.** Бурны рост і стварэнне новых гарадоў у Заходняй Еўропе | **X ст.** Утварэнне Чэшскай і Польскай дзяржаў<br>**980—1015 гг.** — праўленне ў Кіеве князя Уладзіміра<br>**988 г.** Прыняцце хрысціянства на Русі | |
| XI | **1054 г.** Падзел хрысціянскай царквы на каталіцкую і праваслаўную<br>**1066 г.** Нармандскае заваяванне Англіі<br>**1096—1099 гг.** Першы крыжовы паход | **1018 г.** Падзенне Першага Балгарскага царства<br>**1019—1054 гг.** — праўленне ў Кіеве князя Яраслава Мудрага<br>**1097 г.** — Любечскі з’езд князёў | **XI ст.** Вынаходства разборнага шрыфту для кнігадрукавання ў Кітаі<br>**XI ст.** Заваяванне сельджукамі Сярэдняй Азіі і Ірана |

Правообладатель Народная асвета

| | | | |
|---|---|---|---|
| XII | **Пачатак XII ст.** Пачатак аб'яднання Францыі<br>**Пачатак XII ст.** Узнікненне першых універсітэтаў у Еўропе<br>**XII ст.** Будаўніцтва першых сабораў у гатычным стылі | **Каля 1113 г.** Складанне старажытнарускага летапісу «Аповесць мінулых гадоў»<br>**Канец XII ст.** Узнікненне Другога Балгарскага царства<br>Аб'яднанне сербскіх зямель Стэфанам Нэманем | **Канец XII ст.** Узвышэнне Харэзма ў Сярэдняй Азіі |
| XIII | **XIII ст.** Узмацненне папства ў Заходняй Еўропе. Папа Інакенцій III (1198—1216 гг.)<br>**1204 г.** Захоп крыжаносцамі Канстанцінопаля<br>**1212 г.** Разгром арабаў аб'яднаным войскам каралеўстваў Пірэнейскага паўвострава<br>**1215 г.** Вялікая хартыя вольнасцей<br>**1261 г.** Аднаўленне Візантыйскай імперыі<br>**1265 г.** Узнікненне англійскага парламента | **1237—1241 гг.** Паходы Батыя на Русь<br>**1240 г.** Разгром наўгародскім князем Аляксандрам Яраславічам шведскага войска на беразе ракі Нявы<br>**1242 г.** Разгром Аляксандрам Неўскім рыцараў Тэўтонскага ордэна на лёдзе Чудскага возера | **Пачатак XIII ст.** Утварэнне мангольскай дзяржавы<br>**1206 г.** Утварэнне Дэлійскага султаната<br>**Першая палова XIII ст.** Мангольскія паходы ў Кітай, Сярэднюю Азію, Закаўказзе і Еўропу<br>**Другая палова XIII ст.** Завяршэнне заваявання Кітая манголамі. Адбіццё мангольскага нашэсця на Японію |

Правообладатель Народная асвета

## СЛОЎНІК

**Аброк** — павіннасць, плата сялян за карыстанне надзеламі прадуктамі сваёй гаспадаркі або грашамі.

**Асабістая залежнасць** — абмежаванне або страта чалавекам асабістай свабоды і пераход у падпарадкаванне іншаму чалавеку.

**Бенефіцый** — надзел зямлі, які даваўся пажыццёва за выкананне вайсковай службы.

**Варвары** — плямёны, якія не ведалі гарадскога жыцця і не валодалі латынню ці грэчаскай мовай.

**Васал** — феадал, які атрымаў феод ад сеньёра.

**Гарадское самакіраванне** — права гараджан самім кіраваць горадам.

**Горад** — умацаванае паселішча з пастаянным гандлёва-рамесным насельніцтвам.

**Джыхад** — шчырасць, стараннасць у распаўсюджванні ісламу, у тым ліку шляхам вайны супраць людзей іншай веры.

**Дзесяціна** — дзесятая частка ўраджаю ці іншых прыбыткаў, якая збіралася з насельніцтва на ўтрыманне царквы.

**Дзяржава** — арганізацыя грамадства людзей, што пастаянна пражываюць на пэўнай тэрыторыі, якая характарызуецца наяўнасцю сістэмы органаў улады, законаў.

**Дзяржаўная рэлігія** — пануючая і адзіная дазволеная рэлігія ў дзяржаве.

**Дружына** — атрад воінаў пры правадыры племені, князю, каралі.

**Духавенства** — святарнаслужыцелі царквы.

**Дынастыя** — шэраг паслядоўна праўячых манархаў з аднаго і таго ж роду.

**Ерэтык** — праціўнік царквы і веры.

**Залежныя сяляне** — сяляне, якія залежаць асабіста і пазямельна ад землеўладальніка.

Правообладатель Народная асвета

**Замак** — умацаванне, пабудаванае на непрыступных скалах, узгорках ці астравах; месца жыхарства феадалаў.

**Знаць** — уплывовыя і багатыя людзі ў племені, дзяржаве.

**Іерархія** — размеркаванне службовых званняў і чыноў па старшынстве.

**Ікона** — жывапісная выява Ісуса Хрыста або святых, якая служыць прадметам рэлігійнага пакланення.

**Інквізіцыя** — у каталіцкай царкве спецыяльны суд для барацьбы з ерэтыкамі і іншымі праціўнікамі царквы і веры.

**Каран** — свяшчэнная кніга мусульман.

**Каста** — група насельніцтва ў індыйскім грамадстве.

**Манархія** — асабістая ўлада аднаго чалавека (караля, князя, халіфа, султана, шаха) у дзяржаве; звычайна перадаецца ў спадчыну.

**Манастыр** — будынак, дзе жыве абшчына манахаў.

**Мініяцюра** — невялікі малюнак у кнізе.

**Мусульмане** — веруючыя, што прызнаюць іслам.

**Мячэць** — спецыяльны будынак для малітваў мусульман.

**Натуральная гаспадарка** — гаспадарка, пры якой прадукты працы выраблялiся для задавальнення асабістых патрэб, а не на продаж.

**Ордэн** — аб'яднанне манахаў ці рыцараў-манахаў, якія жывуць паводле свайго статута.

**Пазямельная залежнасць** — залежнасць сялян, якія бяруць зямлю ў карыстанне і павінны за гэта аддаваць частку ўраджаю ці выконваць пэўныя работы на карысць уласніка зямлі; залежнасць васала ад сеньёра за атрыманне бенефіцыя або феода.

**Палюддзе** — збор даніны князем у Старажытнай Русі.

**Панскія палі** — землі маёнтка, ураджай з якіх ішоў непасрэдна феадалам.

**Паншчына** — павіннасць, адпрацоўка сялянамі пэўнай колькасці дзён на панскіх палях за права карыстання надзелам.

Правообладатель Народная асвета

**Папа Рымскі** — галава каталіцкай царквы.

**Парламент** — сход саслоўяў у Англіі.

**Патрыярх** — галава адной з праваслаўных цэркваў.

**Рыцар** — цяжкаўзброены конны воін.

**Рэканкіста** — адваяванне захопленай арабамі тэрыторыі еўрапейцамі-хрысціянамі.

**Самурай** — феадал-воін у сярэдневяковай Японіі.

**Саслоўе** — група людзей у грамадстве, што валодала правамі і абавязкамі, якія былі замацаваны законам і перадаваліся ў спадчыну.

**Сеньёр** — феадал, які даваў феод васалу.

**Сёгун** — ваенны правіцель у Японіі.

**Сялянскія надзелы** — землі маёнтка, за карыстанне якімі сяляне плацілі аброк і адпрацоўвалі паншчыну.

**Тавар** — выраб, які зроблены спецыяльна на продаж.

**Таварна-грашовая гаспадарка** — гаспадарка, пры якой вырабляюцца тавары, якія потым прадаюцца за грошы.

**Феадал** — уладальнік феода.

**Феадалізм** — адносіны пазямельнай і асабістай залежнасці паміж людзьмі, заснаваныя на ўласнасці на зямлю.

**Феадальная залежнасць** — асабістая і пазямельная залежнасць сялян ад феадалаў.

**Феадальная лесвіца** — паслядоўнае падпарадкаванне феадалаў, заснаванае на перадачы зямлі за службу.

**Феадальны маёнтак** — землі ў адной мясцовасці, якія належаць феадалу.

**Феод** — надзел зямлі, які даваўся за выкананне службы, у асноўным ваеннай, і перадаваўся ў спадчыну.

**Царква** — 1. Супольнасць веруючых, заснаваная на раздзяленні іх на духавенства і радавых веруючых. 2. Хрысціянскі храм.

**Цэх** — аб’яднанне гарадскіх рамеснікаў адной прафесіі.

**Язычнік** — чалавек, які верыць у мноства багоў.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

# ЗМЕСТ

Ад аўтараў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
Уводзіны. Сярэднявякоўе ў гісторыі чалавецтва . . . . . . . . . . . . . . . . 4

**Раздзел І. Заходняя Еўропа і Візантыя**

*Тэма 1.* Ранняе сярэднявякоўе (V—IX стст.) . . . . . . . . . . . . . . . . . 9

§ 1. Свет і Еўропа ў пачатку сярэднявякоўя . . . . . . . . . . . . . . . . —
§ 2. Утварэнне дзяржавы франкаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 13
§ 3. Франкская імперыя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 17
§ 4. Візантыйская імперыя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 21
§ 5. Хрысціянства ў Еўропе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 25
§ 6. Вытокі сярэднявяковай культуры . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 29

*Тэма 2.* Высокае сярэднявякоўе (X—XIII стст.) . . . . . . . . . . . . . . . 35

§ 7. Свет і Еўропа ў Высокім сярэднявякоўі . . . . . . . . . . . . . . . . . —
§ 8. Феадальны лад у Заходняй Еўропе (X—XIII стст.) . . . . . . . . . . 39
§ 9. Сярэднявяковы горад . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 44
§ 10. Каталіцкая царква . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 48
§ 11. Крыжовыя паходы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 53
§ 12. Англія і краіны Скандынавіі ў X—XIII стст. . . . . . . . . . . . . . 58
§ 13. Краіны Заходняй і Паўднёвай Еўропы . . . . . . . . . . . . . . . . . . 62
§ 14. Заходнееўрапейская культура Высокага сярэднявякоўя . . . . . . 65

*Абагульненне да раздзела I.* Заходняя Еўропа і Візантыя . . . . . . . . 71

**Раздзел ІІ. Славяне ў Раннім і Высокім сярэднявякоўі**

§ 15. Славяне ў Раннім сярэднявякоўі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 76
§ 16. Заходнія славяне ў X—XIII стст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 80
§ 17. Краіны Балканскага паўвострава ў X—XIII стст. . . . . . . . . . . . 84
§ 18. Утварэнне Старажытнарускай дзяржавы . . . . . . . . . . . . . . . . 89
§ 19. Росквіт Старажытнай Русі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 94
§ 20. Палітычная раздробленасць Старажытнай Русі . . . . . . . . . . . . 98
§ 21. Барацьба Русі са знешнімі ворагамі . . . . . . . . . . . . . . . . . . 103
§ 22. Культура Старажытнай Русі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 107

*Абагульненне да раздзела II.* Славяне ў Раннім і Высокім сярэднявякоўі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 113

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

**Раздзел III. Цывілізацыі Азіі, Афрыкі і Амерыкі ў V—XIII стст.**

§ 23. Узнікненне ісламу і Арабскі халіфат ........................ 117
§ 24. Араба-ісламская культура .................................. 121
§ 25. Іран і Сярэдняя Азія ........................................ 125
§ 26. Індыйская цывілізацыя ...................................... 129
§ 27. Кітайская цывілізацыя ....................................... 132
§ 28. Японская цывілізацыя ....................................... 138
§ 29. Цывілізацыі Трапічнай Афрыкі і Амерыкі ................. 142

*Абагульненне да раздзела III.* Цывілізацыі Азіі, Афрыкі і Амерыкі ў V—XIII стст. ............................................ 146

Заключэнне. Ранняе і Высокае сярэдневякоўе ў гісторыі чалавецтва ............................................ 149

Асноўныя падзеі Ранняга і Высокага сярэдневякоўя ............ 151

Слоўнік ............................................ 154

Правообладатель Народная асвета

Вучэбнае выданне

**Фядосік** Віктар Анатольевіч
**Еўтухоў** Ігар Арэставіч
**Яноўскі** Алег Антонавіч і інш.

**ГІСТОРЫЯ СЯРЭДНІХ ВЯКОЎ**
**V—XIII стст.**

Вучэбны дапаможнік для 6 класа
агульнаадукацыйных устаноў
з беларускай мовай навучання

Заг. рэдакцыі *В. Г. Бехціна*. Рэдактар *Г. А. Бабаева*. Афармленне *В. Я. Нога, В. Р. Мішчанкі*, *В. М. Цемушава*. Мастацкія рэдактары *А. М. Хількевіч*, *Л. І. Мялоў*. Тэхнічны рэдактар *М. І. Чаплаводская*. Камп'ютэрная вёрстка *Г. П. Плутахінай*. Карэктары *Т. М. Вядзернікава*, *А. П. Тхір*, *Д. Р. Лосік*, *В. С. Бабеня, Г. В. Алешка*.

Падпісана ў друк 11.05.2009. Фармат $70 \times 90\, ^1/_{16}$. Папера афсетная. Гарнітура школьная. Умоўн. друк. арк. 11,7. Ул.-выд. арк. 7. Тыраж 24 660 экз. Заказ .

Выдавецкае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Народная асвета» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
ЛИ № 02330/0494083 ад 03.02.2009. Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Мінская фабрыка каляровага друку».
ЛП № 02330/0494156 ад 30.04.2009.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

______________________________________________________________

(Назва і нумар школы)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета